№ 10 (464) 10 сакавіка 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднoўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Перад выбарам




**2 сакавіка Аляксандар Мілінкевіч і Дзьмітры Паўлічэнка сутыкнуліся твар у твар.**

У нумары: фатахроніка 2 сакавіка. А таксама: як робяцца правакацыі — **старонка 8.**

## Сярэдняя працягласьць тыраніі

Эсэ Віталя Тараса «Канец тыраніі». **Старонка 28**. Эсэ Ёсіфа Бродзкага «Пра тыранію». **Старонка 32**.

## Прыгожы парадокс Беларусь

Восем прычынаў, каб захапляцца нашай Радзімай. **Старонка 20.**



Газэтка дзеткам: новы праект Алеся Кудрыцкага. **Старонка 44.**





# у нумары

## палітыка

Архіпэляг салідарнасьці .................. 4
Палітычная будучыня Казуліна ........................... 7
Грыб: Казулін пераедзе ў Маскву .......................... 7
Лукашэнкаўцы аказаліся ў меншасьці .................... 8
Як робяцца правакацыі ....................... 9
Кожнаму дэлегату па тэлевізары ............... 11
БНТУ: загад галасаваць датэрмінова .................. 11
Чыноўніца адукацыі: каб усе датэрмінова! .. 11

## грамадзтва

Барацца проці ўсякага зброду ........................... 11
Зварот вернікаў: Цемра ахінула краіну ............................. 14
Барыс Гарэцкі. Дзёньнік салідарнасьці ................ 16
Гісторыя аднаго старшыні ........................ 23

## хроніка

Пастар асуджаны на 10 сутак ...................... 7
Сьціслая хроніка рэпрэсій і супраціву .... 12
Шчучынскія баевікі ..... 18
14 крымінальных справаў .......................... 19

## з усіх старон

«Süddeutsche Zeitung»: Прыгожы парадокс Беларусь ....................... 20

## мы самі

Шукаем падпісчыкаў «НН»!!! .......................... 22
Падзякі ахвярадаўцам ............... 22

## культура

Жыцьцё й лёс Карласа Шэрмана ........................ 27
Баніфацыно здымае Беларусь ......... 37

## аўтарскія рубрыкі

Павал Севярынец. Лісты зь лесу: Агнявы сьнег ................ 12
Аляксандар Класкоўскі. Палітычная кухня: Пакаваць па поўнай! ... 24
Лёлік Ушкін. Левым вокам: Гэты дзень у гісторыі ....................... 25
Віталь Тарас. Іншымі словамі: Канец тыраніі ............... 28

## пішуць чытачы

Давай аб'ём! ................. 26
Слова пра бацьку, Міколу Латушкіна ........ 27

## эсэ

«Жить стало лучше, жить стало веселей…» ................... 31
Ёсіф Бродзкі. Пра тыранію ................. 32
Нечужая Бацькаўшчына .............. 35

## наша справа

А цяпер гарбаты! ......... 38

## гісторыя

«Бандыты карысталіся беларускай гаворкай…» .................. 40

## літаратура

Андрусь Храпавіцкі. Расьцьвітае перамогі бэз .................................. 37

## калі б…

Вясёлыя карцінкі .......... 47

**50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА**

# Страх як паліттэхналёгія

На гэтых выбарах апазыцыя змагаецца не з уладамі, а са страхам. У сабе больш, чым у выбарцах.

Запалохалі незалежных сацыёлягаў — і мы ня маем зьвестак пра дынаміку рэйтынгаў пасьля тэлевыступаў і ўсебеларускага сходу лукашэнкаўцаў. Ёсьць вынікі лякальных апытаньняў, што дыямэтральна розьняцца ад агучаных у дзяржаўных СМІ, а нацыянальнага перад 8 сакавіка — апошнім днём, калі можна было друкаваць вынікі сацыялягічных дасьледаваньняў — так і не адбылося.

Таму замест дынамікі рэйтынгаў у аб'ектыве гэтага нумару "НН" апынуўся страх. Страх як паліттэхналёгія, ягонае прафэсійнае, з халодным разьлікам, кропкавымі акцыямі, нагнятаньне.

Зьбіцьцё кандыдата Казуліна (што будзе з вамі, калі мы кандыдата кладзем), пакалечаны журналіст Улевіч (расправімся з кожным, нягледзячы на сацыяльны статус), парадныя шэрагі СОБРу і людзей у цывільным (нас шмат), затрыманыя Лябедзька й Вячорка (і пляваць мы хацелі на міжнародных назіральнікаў).

72 падпольныя арганізацыі выкрылі. Але не назвалі. Які беларус ня ўдзельнічаў у нечым забароненым? Няхай кожны прыме гэта на свой адрас. Людзей не канечне арыштоўваць, досыць, каб яны чакалі арышту.

У рэвалюцыйнай стыхіі форумаў tut.by штатныя прапагандысты пераключыліся з стварэньня топікаў "Колькі даляраў вам плацяць за выхад на плошчу 19-га" на "Ці будуць у нас страляць", не абцяжарваючы сябе нават зьменай нікаў. Народ гагоча. І прапануе сродкі ад страху: салідарнасьць, сьмех, сон і сэкс.

У Інтэрнэце страху няма. Страху няма там, дзе досыць інфармацыі.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**2 сакавіка. Менск. Плошча Свабоды вітае Аляксандра Мілінкевіча.**

# Архіпэляг салідарнасьці

Замежжа — за Беларусь. З Бэрліна піша **Алесь Кудрыцкі**.

Варшаўскі ды-джэй ставіць кружэлку «Я нарадзіўся тут» падчас раставечарынкі ў студэнцкім клюбе, амэрыканскія кангрэсмэны апранаюць джынсы, а Вацлаў Гавал запальвае сьвечку ў акне. Паасобку акцыі салідарнасьці зь Беларусьсю здаюцца кропкавымі, аднак, зірнуўшы на іх разам, разумееш: такую маштабную падтрымку мы адчуваем упершыню.

Адна справа — прачытаць у газэце караценькую нататку пра чарговыя затрыманьні ў далёкай Беларусі і зусім іншая — натыкнуцца на вуліцы свайго гораду на людзей, якія распавядуць табе пра гэтую краіну зь першых вуснаў. Асабісты кантакт зь Беларусьсю — вось стрыжань замежных акцыяў салідарнасьці.

## 16

Найбольш сыстэмнай з усіх, бадай, ёсьць акцыя «Дзень салідарнасьці», што адзначаецца ў 16-га кожнага месяца. Яна ўдала спалучыла ў сабе два элемэнты: «салідарнасьць разам» (пікетаваньні ці канцэрты) ды «салідарнасьць паасобку» (сьвечкі ў вокнах). Спачатку падтрыманая невялікім колам неабыякавых, акцыя няўхільна набывае папулярнасьць. Такога масавага Дня салідарнасьці, як сёлетняе 16 лютага, яшчэ не было. Арганізаваная «Міжнароднай амні-




WWW.CANIGETARIGHT.ORG

**Акцыя «Аўтастоп салідарнасьці», зладжаная галяндзкімі студэнтамі. Удзельнікі маюць дабірацца аўтастопам да беларускае мяжы, дарогаю распавядаючы пра сытуацыю ў нашай краіне. Яны будуць стаяць на аўтатрасах у кайданках і з шыльдачкамі «Да мяжы свабоды».**

стыяй» акцыя пракацілася ад険градоў Эўропы да ЗША з Канадай. Выспачкі салідарнасьці на адзін дзень зрабіліся сусьветным архіпэлягам. Удзельнікі — найперш студэнты, палітуцекачы, эмігранты маладога пакаленьня, а таксама іх мясцовыя сябры, неабыякавыя да Беларусі.

У Вашынгтоне дэманстранты раздавалі мінакам джынсавыя стужкі, на якіх была праштампаваная лічба «16». Да пікетоўцаў выйшаў апрануты ў джынсы кангрэсмэн-рэспубліканец зь Мічыгану Тэд Макотэр. «Што б ні здарылася, мы ніколі не забудземся на народ Беларусі і не адрачэмся яго», — сказаў ён.

Пад пахмурным небам Парыжу ля Эўфэлевай вежы невялікая група пікетоўцаў трымала самаробныя, пісаныя па-француску кардонныя плякаты ды бел-чырвона-белы сьцяг. У Боне студэнты стаялі, заляпіўшы раты скотчам. У Будапэшце сьвечкі ляжалі на сьнезе перад чорна-белымі партрэтамі. На фота — надпіс *Eltünt* — «зьніклы». Побач — з два тузіны маладых людзей, захутаных у шалікі.

## Суседзі перажываюць

Найвялікшыя акцыі, натуральна, праходзяць у краінах-суседках. У Кіеве пасольства Беларусі завешалі бел-чырвона-белымі ды джынсавымі стужкамі. Падтрымаў акцыю цэлы шэраг украінскіх палітычных арганізацыяў. Добра прыдалася плястыкавая стужка ў чырвоныя ды белыя палосы, якой звычайна агароджваюць будоўлю. Зь яе ўдзельнікі панарабілі сабе пасы ды бандэлькі на галаву.

У Польшчы акцыя салідарнасьці прайшла ажно ў 10 гарадох, прычым гэта былі ня толькі пікеты.

Салідарнасьць робіцца шматузроўневай, з палітыкі пераходзіць у культуру. Адмыслова для канцэрту *Neuro Dubel'*я ў Варшаве польскі гурт *Big Cyc* стварыў песьню «Дыктатар».

Постскрыптумам у Маскве 18 лютага правялі пікет ля МЗС пад назвай «Свабоду Беларусі». Акцыі салідарнасьці ў Маскве варта вылучыць асобным радком — гэта адзіная краіна, у якой даводзіцца пратэставаць як супраць беларускай, так і супраць уласнай, скіраванай на падтрымку беларускага рэжыму палітыкі ды яшчэ і адбівацца (у літаральным сэнсе) ад нэафашыстаў.

Новы імпульс акцыі дадае ўдзел у ёй вядомых асобаў. 16 лютага запалілі ў сваіх вокнах сьвечкі Вацлаў Гавал ды многія іншыя эўрапейскія палітыкі — і гэта найлепшая падтрымка тым беларусам, хто, запальваючы сьвечку перад шыбаю, спадзяецца пабачыць агеньчыкі ў вокнах аднадумцаў, аднак заўважае там толькі сьвятло тэлеэкранаў.




**Эўропа сочыць за Беларусяй. Кнігарні *Franke* ў Вітэнбэргу (Нямеччына) выставілі на вітрыну Быкава.**




**Акцыя салідарнасьці ў Парыжы.**

## Журналісты — за сваіх

Цалкам адметныя акцыі салідарнасьці ладзілі журналісты. Летась 23 лістапада найбуйнейшыя польскія газэты выйшлі з чорнымі плямамі, а на вуліцах польскіх гарадоў ды Брусэлю зьявіліся плякаты са здымкамі беларускіх журналістаў і грамадзкіх дзеячаў, якія пацярпелі ад рэпрэсіяў. Гэта, бадай, была адна з самых паліттэхналягічных акцыяў — яе канцэпцыю

**Працяг на старонцы 6.**

# Архіпэляг салідарнасьці

Працяг са старонкі 5.

«Міжнародная Амністыя» распрацоўвала сумесна з рэклямнай агенцыяй *Saatchi & Saatchi*.

27 лютага польская *Gazeta Wyborcza*, чэская *Lidové Noviny*, вугорская *Magyar Hirlap* ды вядучая славацкая газэта *Sme* надрукавалі карыкатуры на Лукашэнку. Зрабілі яны гэта на знак салідарнасьці зь беларускімі карыкатурыстамі ды мультыплікатарамі, якія праз сатыру на прэзыдэнта апынуліся пад пагрозай турэмнага зьняволеньня.

## Прастора для імправізацыі

Сябры галяндзкай філіі «Міжнароднай Амністыі» вырашылі дамагацца праўды... на колах. 2 сакавіка яны выправіліся з Амстэрдаму ў вандроўку аўтастопам да беларускай мяжы. Акцыя мае назву «Ці магу я атрымаць правы?». Яе мэта — прыцягнуць увагу да несправядлівых выбараў ды выказаць салідарнасьць сем’ям рэпрэсаваных ды зьніклых. Маршрут студэнтаў пройдзе праз Бон, Гановэр, Бэрлін ды Варшаву, дзе да вандроўнікаў будуць далучацца новыя групы. Скончыцца акцыя вялікай дэманстрацыяй на польска-беларускай мяжы. Вось толькі пакуль не вядома, ці перакінецца яна на іншы бок.




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**У памежных раёнах Польшчы зьявіліся бігборды, прысьвечаныя беларускім выбарам. Тымчасам смаленскія ўлады паздымалі бігборды з агітацыяй за Мілінкевіча, што стаялі на шашы Менск—Масква і былі аплачаныя беларусамі Расеі.**

Выбары далі імпульс для імправізацыяў. Ня ўсе беларусы замежжа ды замежныя аматары беларушчыны змогуць патрапіць 19 сакавіка на Кастрычніцкую плошчу. Каб неяк выпусьціць пару, на выбары плянуецца адчыніць таталізатар у адным зь мясцовых клюбаў Дрэздэну. Можна будзе ня толькі папіць піва ды паглядзець апошні выпуск тэленавінаў, але і паставіць на аднаго з кандыдатаў. Калі ўгадаў — атрымліваеш свае грошы назад, калі не — кажы грошыкам «бывай», яны пойдуць на аплату залі.

Калі арганізатары дрэздэнскай вечарынкі найперш немцы, дык імпрэза «Беларусь галасуе ў Бэрліне» паўстала дзякуючы высілкам найперш беларусаў, якія жывуць у сталіцы Нямеччыны. Салідарнасьць беларусаў зь беларусамі — тэма дужа актуальная. Згуртаваліся яны з дапамогай Інтэрнэту. Вынік: 19 сакавіка а 19-й у памяшканьні былой хлебнай фабрыкі на плошчы Калігары пройдзе вечарына з музыкай, дыскусіяй ды нават прамым уключэньнем з рэвалюцыйнага Менску.

## Сіла бессыстэмнасьці

Голым вокам бачна: прабеларуская актыўнасьць у замежжы рэзка ўзрастае. Найлепш гэта бачна па дзейнасьці такога праваабарончага волата, як «Міжнародная Амністыя». Аднак моц акцыяў салідарнасьці не абавязкова ў тым, што яны ладзяцца арганізавана. Бессыстэмнасьць, спантаннасьць — таксама важны элемэнт.

Пасьпяшаўся той, хто паставіў крыж на новай генэрацыі беларускай дыяспары. Толькі смаленскія ўлады прымусілі зьняць рэкляму за Мілінкевіча з шашы Масква—Менск, як у Польшчы паабапал памежных зь Беларусьсю трасаў зьявіліся білборды зь бел-чырвона-белымі сьцягамі. Абедзьве акцыі — плён працы маладой эміграцыі.

Сайт «Хартыі» зьмяшчае ліст Алесі Флоры, якая сама зладзіла Дзень салідарнасьці для жыхароў каліфарнійскага мястэчка Боўлдэр-Крык. Маляваныя ад рукі плякаты, невялічкая правінцыйная кавярня, сябры, якія прыходзяць паглядзець на запаленую ў акне сьвечку...

Ці невялічкая кнігарня ў нямецкім мястэчку Вітэнбэрг, якая выставіла на галоўную вітрыну том прозы Быкава... Колькі яшчэ такіх мікраакцыяў праходзяць незаўважаныя прэсай. Іх галоўны вынік: «маленькія» людзі пачынаюць верыць у тое, што могуць нешта зьмяніць. А яшчэ яны даведваюцца, што побач зь імі жывуць такія ж «маленькія», але моцныя духам людзі.

# Грыб: Казулін пераедзе ў Маскву

Аляксандар Казулін у выпадку пройгрышу на выбарах мае намер працаўладкавацца ў Маскве. Пра гэта карэспандэнту расейскага інфармагенцтва *Regnum* паведаміў кіраўнік ініцыятыўнай групы Казуліна Мечаслаў Грыб. Зь ягоных словаў, Казулін ня мае шанцаў працаўладкавацца ў Беларусі пры цяперашнім кіраўніцтве.

**КАМЭНТАР**

## Палітычная будучыня Казуліна

А.Лукашэнка даў устаноўку Л.Ярмошынай, што сядзела побач зь ім: «Ён атрымае паўтара працэнты галасоў». І атрымае ж! — хто б сумняваўся.

Кандыдат Казулін даказаў сваю сьмеласьць тэлевыступамі і паходам на «ўсебеларускі народны сход». Ён выбраў нечаканую палітычную нішу радыкала-папуліста. Гэты вобраз цяжка памяняць. Гэта як Жырыноўскі, які зьнік бы з палітычнай сцэны, як толькі перастаў быць Жырыноўскім.

Што чакае Казуліна пасьля 19 сакавіка? Разгледзім два варыянты: калі ён здымае сваю кандыдатуру і калі ён застаецца ў бюлетэні.

Калі Казулін застаецца — апытаньні грамадзкае думкі даюць яму большую папулярнасьць, чым у Гайдукевіча, але істотна меншую, чым у Мілінкевіча — для лукашыстаў ён спаліў масты і стаў асабістым ворагам, а для дэмакратычнай апазыцыі застаўся кандыдатам, што ўнёс раскол, тым самым абнізіўшы шанцы на перамогу над дыктатурай.

Казулін цяпер кроўна зацікаўлены ў перамозе беларускага Майдану. Гэта дало б яму асабістую бясьпеку і лідэрства ў беларускай палітыцы, напрыклад, на чале папулісцкае прарасейскае партыі. Выхад Казуліна з кампаніі цяпер, калі магчымасьці для агітацыі практычна вычарпаныя, павялічыў бы шанцы на перамогу свабоды — проста таму, што галасы праціўнікаў Лукашэнкі не расьцярушваліся б, а выбар стаў бы ясьнейшы.

Але нават калі вулічны ціск на Лукашэнку акажацца беспасьпяховым, Казулін захоўвае выгадную пазыцыю чалавека, які рызыкаваў сабой у агітацыйнай кампаніі і ахвяраваў амбіцыямі дзеля дэмакратычнае справы.

Элегантным выхадам з кампаніі Казулін у кожным разе захаваў бы сябе ў палітыцы пасьля 19 сакавіка.

**Мікола Бугай**

# Перадвыбарныя сустрэчы Аляксандра Мілінкевіча

Кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Мілінкевіч распаўсюдзіў графік сваіх заплянаваных сустрэчаў з выбарцамі да 19 сакавіка.

**Белаазёрск. 10 сакавіка, пятніца:**
16.20 — ДК, вул.Леніна.
**Кобрын. 10 сакавіка, пятніца:**
18.30 — гарадзкі Дом культуры (вул. Дзяржынскага, 78).
**Брэст. 11 сакавіка, субота:**
12.00 — Палац прафсаюзаў
**Драгічын. 11 сакавіка, субота:**
16.00 — ДК, вул. Леніна.
**Пінск. 11 сакавіка, субота:**
18.30 — ДК, вул. Леніна.
**Менск. 12 сакавіка, нядзеля:**
12.00 — кінатэатар «Салют» (пр.Ракасоўскага, 150а).
15.00 — Палац культуры чыгуначнікаў (вул.Чкалава, 7).
18.00 — Менскі лядовы палац спорту (вул. Прытыцкага, 27).
**Гомель. 14 сакавіка**
Плошча Паўстаньня.
**Менск. 17 сакавіка, пятніца:**
18.00 — кінатэатар «Электрон» (вул. Казінца, 117).
**Менск. 18 сакавіка, субота:**
12.00 — кінатэатар «Кіеў» (вул. Кахоўская, 31).
15.00 — канцэртная заля «Менск» (вул. Кастрычніцкая, 5).
18.00 — кінатэатар «Кастрычнік» (пр. Незалежнасьці, 73, былы пр. Скарыны).

Гэта няпоўны графік. Астатнія сустрэчы будуць анансавацца на сайце www.milinkevich.org па меры ўзгадненьняў.

# Пастар асуджаны на 10 сутак

Пастар царквы эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў «Запавет Хрыста» Георгі Вязоўскі атрымаў 10 сутак арышту за правядзеньне «несанкцыяванага» ўладамі набажэнства.

Гэтая пратэстанцкая супольнасьць была зарэгістраваная ў 1995 г., але пасьля прыняцьця закону «Аб свабодзе сумленьня» страціла юрыдычны статус. Прычынай адмовы было тое, што царква была зарэгістраваная па месцы жыхарства аднаго зь вернікаў.

Летам 2004 г. узьніклі новыя праблемы: падчас правядзеньня багаслоўскай канфэрэнцыі ў будынку царквы былі учыненыператрус — міліцыя шукала «амэрыканцаў, якія незаконна прапаведуюць». Іншаземцаў знайсьці не ўдалося, але ў прысутных былі перапісаныя пашпартныя зьвесткі, а на кіраўніцтва суполкі склалі пратакол.

«Улада імкнецца запужаць людзей і спыніць рост эвангельскіх цэркваў, — адзначыў перад судом пастар Г.Вязоўскі. — Сёньняшняя дзяржава хоча кантраляваць душы і разглядае царкву як свой ідэалягічны аддзел. Нашае пакліканьне — гэта выконваць запавет Хрыста «ідзіце і навучыце ўсе народы», а гэта значыць — прапаведаваць, праводзіць эвангелізацыю».

Некаторыя пратэстанцкія лідэры адзначаюць, што сытуацыя пачынае нагадваць 1970-я гады.

**Аляксей Шэін**




РУСЛАН ГАРБАЧОЎ

# Лукашэнкаўцы аказаліся

5 сакавіка «Эўраньюс» кожныя паўгадзіны круціла кадры з баранавіцкага Дому афіцэраў. Мясцовы «Інтэкс–ТВ» не згадаў пра падзею ані словам.

Падчас другога прыезду Мілінкевіча ў Баранавічы 5 сакавіка мясцовае чынавенства вырашыла рэабілітавацца. Але нарабіла яшчэ большай пагалоскі. На наступны дзень «Эўраньюс» кожныя паўгадзіны круціла кадры з баранавіцкага Дому афіцэраў, дзе адбывалася сустрэча з адзіным. Мясцовы тэлеканал «Інтэкс-ТВ», які таксама вёў здымкі, не згадаў пра падзею ані словам.

Найперш людзей абурыла тое, што мясцовыя вэртыкальшчыкі парушылі сваю ж пастанову. Паводле яе, больш за пяць гадоў пікеты і мітынгі ладзяцца ў Маладым ці Старым парках. Гэтым разам пікетоўцам ад БРСМу дазволілі вольна бегаць з расьцяжкамі вакол будынку.

Некалькі плякатаў былі добра падрыхтаваныя, адна расьцяжка нават па-беларуску: «Моладзь супраць Мілінкевіча». Напачатку БРСМаўцы жартавалі й фатаграфавалі адзін другога на мабільныя тэлефоны.

Шмат хто, праходзячы ўздоўж пратэстуючых, кляў іх ды задаваў знаёмае кожнаму апазыцыянэру пытаньне: «Колькі вам заплацілі?». Зрэдчас чуліся зьдзіўленыя галасы: «Здароў! Ты што, за Бацьку?» Нейкі чалавек у пашарпанай куртцы са штучнай скуры трымаў плякат «Предприниматели против Милинкевича». Падскочыў знаёмы: «Гэты жыве на суседзкай са мною вуліцы! Апівоша апівошаю. Колькі гадоў нідзе не працуе… Калі ж ты прадпрымальнікам стаў?» «Нядаўна», — не сумеўся «прадпрымальнік».

Сярод БРСМаўцаў шмат хто апускаў долу вочы, калі бачыў сваіх знаёмых сярод тых, хто прыйшоў на сустрэчу з адзіным кандыдатам. Адна справа за чаркай сам-насам клясьці ўладу, а другая — знайсьці мужнасьць адмовіцца ад удзелу ў правакацыі.

Каля трыццаці пікетоўшчыкаў патрапілі ў залю. На пачатку сустрэчы ў Мілінкевіча «раптоўна» адключыўся мікрафон, а ў руках «правільнай» моладзі зьявіўся гукаўзмацняльнік. Акрамя воклічу «Лукашэнка — прэзыдэнт» тыя нічога згадаць ня здолелі. Кіравала імі некалькі чалавек, сярод якіх пазналі дэканшу ўнівэрсытэту, што за тыдзень да гэтага прымала актыўны ўдзел у адлічэньні моладзевага актывіста Сяргея Марчыка.

Мікрафон уключылі пасьля пагрозы вывесьці людзей з

**На фота ўверсе: падчас сустрэчы А.Мілінкевіча з жыхарамі Баранавіч, пралукашэнкаўскі пікет стаяў у недазволеным уладаю для іншых пікетоўнікаў месцы.**

# Як робяцца правакацыі

Гарадзенскія ўлады падрыхтавалі да сустрэчы Мілінкевіча з выбаршчыкамі правакатараў зь ліку студэнтаў. Але акцыя праваліласяся.

Калі раней на сустрэчах з адзіным абмяжоўваліся нязручнымі пытаньнямі «незадаволеных пэнсіянэраў» ды прадстаўнікоў вэртыкалі, цяпер да справы далучаюць моладзь. У Горадні да сустрэчы 4 сакавіка падрыхтавалі групу з 25 студэнтаў унівэрсытэту імя Янкі Купалы. Зь імі працаваў псыхоляг — вучыў, як пазбавіцца страху перад натоўпам. Кіравала працай групы загадчыца кафэдрай культуралёгіі Натальля Ваўковіч.

Студэнты, паводле сцэнару, мусілі задаваць правакацыйныя пытаньні, галёкаць, сьвістаць. Адбор у групу адбываўся па-рознаму: адных прымусілі, іншыя адзначыліся ў часе збору подпісаў.

Правакацыі пачаліся з таго, што арганізатарам сустрэчы адмовілі ў правядзеньні мерапрымства ў ДК абласной філярмоніі. Міліцыянты ў форме і ў цывільным разам з студэнтамі заблякавалі ўваход у ДК.

Як сьведчаць удзельнікі

Працяг на старонцы 27.





**Выкладчыца ГарДУ Натальля Ваўковіч (справа) ладзіла трэнінгі па зрыве сустрэчы А.Мілінкевіча з выбарцамі.**

# ў меншасьці

залі на вуліцу і правесьці сустрэчу там. Але міліцыянты ніяк не хацелі ісьці ў залю і спыніць правакацыі. З рацыі аднаго чулася: «Паспрабуйце толькі пайсьці…»

Самі маладзёны з БРСМу не разумелі, што іх улада выкарыстала ў сваіх мэтах. Калі б здарылася што ў залі, куды набілася больш за 800 чалавек, дык ад тых трыццаці мала што засталося б. Ня выратавалі б іх нават тры аўтобусы АМАПу, што дзяжурылі за колькі кварталаў, — праходы былі забітыя.

Мілінкевіч здолеў узяць сытуацыю пад кантроль і нават прапаноўваў крыкунам задаваць пытаньні кожнаму паасобку.

Тыя, хто прыйшоў паслухаць, ушчувалі правакатараў. Старая настаўніца пазнала ў адным свайго вучня: «Ты ж ледзь 9 клясаў скончыў».

Па нейкім часе правакатары пакінулі залю. Адзін, сыходзячы, шпурнуў у залю стос улётак за Лукашэнку. Невядома, дзеля чаго, бо яны ня мелі выходных зьвестак і адразу ж зацікавілі наглядальнікаў ад АБСЭ.

Па заканчэньні сустрэчы, перад ад'ездам адзінага, ужо на вуліцы поклічы праз узмацняльнік «Лукашэнка, Лукашэнка» прысутныя заглушылі плясканьнем і воклічамі «Мілінкевіч, Мілінкевіч».

Гэты канфлікт настроіў адзін проці аднаго знаёмых. Шмат хто з былых сяброў ужо ніколі не павітаецца.

**Руслан Равяка, Баранавічы**



**Невядомы ў цывільным перашкаджае фотакарэспандэнту здымаць інцэдэнт з Аляксандрам Казуліным ля менскага Палацу чыгуначнікаў 2 сакавіка.**

# Як робяцца правакацыі



**На сустрэчу зь Мілінкевічам у Салігорску прыйшла тысяча прыхільнікаў і каля 15 выканкамаўскіх работніц. Кожная агучыла па адным пытаньні. Заля сустракала іх сьвістам.**

**Працяг са старонкі 23.**

сустрэчы, адмова ў памяшканьні адыграла злы жарт з ініцыятарамі правакацыяў. 2-тысячны натоўп паглынуў купку «агітатараў». Іх проста адціснулі ўбок, дзе яны й прастаялі да канца сустрэчы. Толькі калі людзі пачалі разыходзіцца, «правільная» моладзь узброілася міліцэйскім мэгафонам і пачала скардзіцца падасьпелай здымачнай групе абласнога ТБ на натоўп, што «не дазволіў задаць пытаньні кандыдату ў прэзыдэнты».

Грамадзтва адрэагавала на правакацыі разьмяшчэньнем у Інтэрнэце фатаздымкаў правакатараў, пазначыўшы прозьвішчы некаторых зь іх. Сталі вядомыя і пытаньні, якія ім загадана было задаваць: «Калі вы ў сваім выступленьні заклікалі моладзь выйсьці на вуліцы ў выпадку вашай паразы, то чаму кажаце, што супраць рэвалюцыі і беспарадкаў?», «Навошта вы ідзяце ў прэзыдэнты, калі нават выбаршчыкі Шчучынскай акругі за вас не прагаласавалі на парлямэнцкіх выбарах?».

Рэакцыя ўладаў на публікацыю фатаздымкаў была нэрвовая: студэнта 4 курсу гістфаку Сяргея Марозава, што разьмясьціў іх на гарадзенскім форуме, выклікалі на гутарку ў дэканат.

**Сямён Печанко**

**Нацыянал-бальшавікам, якія спрабавалі сарваць сустрэчу з адзіным кандыдатам у менскім кінатэатры «Дружба», гледачы паразьбівалі насы. У аднаго з «бальшавікоў» было знойдзена пасьведчаньне сябра БРСМ.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



Менск, Няміга. 2 сакавіка.

## Кожнаму дэлегату па тэлевізары

Кожны дэлегат так званага «ўсебеларускага народнага сходу» атрымаў каштоўныя падарункі, а таксама пляшку «Зуброўкі», па бляшанцы чырвонай і чорнай ікры. Самым каштоўным падарункам стаў шырокаэкранны тэлевізар. Агульны кошт гэтых падарункаў сягае 1 мільярда 150 мільёнаў рублёў.

Суму выдаткаў на правядзеньне сходу цяжка зьлічыць. «Нас кожны дзень кармілі ў рэстаранах, было шыкоўнае мэню, замаўлялі ўсё, што кожны хацеў», — паведаміла радыё «Свабода» адна з дэлегатак форуму.

Тэлетрансьляцыя паказала, што некаторыя дэлегаты падчас сходу драмалі пасьля сытных абедаў. Але большасьць шчыра пляскала паведамленьню прэзыдэнта, што грошы ад продажу зброі былі вытрачаны сумленна.

**Мікола Бугай**

## БНТУ: загад галасаваць датэрмінова

У Нацыянальным тэхнічным унівэрсытэце выданы загад: усе студэнты мусяць прагаласаваць датэрмінова (у чацьвер), у пятніцу й суботу заняткі будуць адмененыя, інтэрнаты зачыняюцца, усе павінны разьехацца па дамах.

**МБ**

## Чыноўніца адукацыі: каб усе датэрмінова!

Начальніца ўпраўленьня адукацыі Менаблвыканкаму Таіса Данілевіч падчас сэлектарнай нарады з работнікамі адукацыі вобласьці загадала, каб «працоўныя калектывы школаў, у тым ліку й тэхнічныя работнікі, прагаласавалі датэрмінова» за цяперашняга прэзыдэнта. Нягледзячы на атмасфэру тэрору, што пануе ў краіне, адзін удзельнік нарады запратэставаў. Чыноўніца ў адказ мела нахабства пагражаць: «Што гэта за настаўнік такі, я прыеду праверу».

Т.Данілевіч — былая старшыня Салігорскага гарсавету. Як і Лідзію Ярмошыну, яе заўважылі і забралі на павышэньне ў сталіцу.

А.Мілінкевіч заклікаў выбарцаў любым чынам унікаць удзелу ў датэрміновым галасаваньні, бо псыхалягічны ціск на выбарцаў у такой сытуацыі найбольшы, а фальсыфікацыі вынікаў датэрміновага галасаваньня можна ажыцьцявіць найбольш сакрэтна.

**МБ**

## Барацца проці ўсякага зброду

Вэртыкальная “Аршанская газэта” перадрукавала перадвыбарную праграму Лукашэнкі. Побач з праграмай, якая, здаецца, павінна быць надрукаваная толькі ў некалькіх рэспубліканскіх газэтах, вызначаных ЦВК, зьмешчаны й твор нейкага мясцовага вершаплёта Г.Канцавога “Выберем достойного”:

Он много сделал для народа,
Борется против всякого сброда,
В обществе добился
стабилизации,
Должен отпор дать оппозиции.
Дало народное собрание добро
Оппозиции удар под ребро.
За Лукашенко большинство
голосов,
Кто бы не травил на него псов.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# Агнявы



**Павал Севярынец — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.**

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Здавалася б, нарыхтоўка лесу. У Беларусі такіх дзялянак сотні. Нічога незвычайнага. І ўсё ж менавіта тут, на лесапавале, і менавіта гэтай зімою, як калісьці ў дзяцінстве, мне адкрылася безьліч сапраўдных цудаў.

Часам, чакаючы тралёвачнага трактара з чарговым пачкам, машынальна пачынаеш падлічваць колцы на сьпілах зваленых у штабелі ствалоў. 15. Дубок узросту беларускай незалежнасьці. Шкада, дружа: трапіў пад пілу саўковае сыстэмы нарыхтовак. 29. Альха, мая равесьніца. Прывітаньне! Рыхтуйся на цэлюлёзу — магчыма, яшчэ сустрэнемся... на ўлётцы ці на старонцы «Нашае Нівы». 34. Хваіна часоў Машэрава. Рана зрэзалі. Мабыць, пойдзе на які слуп лесьнікам, не спарахнее. 52. Асіна, раўня Рыгоравічу. На фанэру... Ого! Чэсьць! — елка ўзросту БНР! Эўрастандарт, за мяжу па найвышэйшым разрадзе... Вялізная клявіятура машыны часу разгортвае перад табою ўсю панараму эпохі ў канцэнтрычных кодах. Быццам колы на вадзе, на зрэзе фіксуецца рэха падзеі. Хіба ня цуд?

Або ў непралазным балотным гушчары трапляеш на вялізную яліну накшталт тых, што ставяць на Кастрычніцкае плошчы ў Менску. Толькі вось на сярэдзіне ствала, амаль пазбаўленага галінаў, прыбіты крыж. Ледзь угледзіш надпіс: «Львів. ДМБ 1981». Так, дапусьцім, падчас вучэньняў салдат-украінец пакінуў па сабе памяць. Але як крыж апынуўся на дзесяцімэтровай вышыні? Ствол гладкі, як калёна, і абсалютна непашкоджаны. Цуд? Лесавікі ўсьміхаюцца: крыж прыбівалі ўнізе. За 25 гадоў елка проста вырасла.

Упершыню ў жыцьці бачыў ужывую пару ласёў, якія стаяць пры дарозе, аб'ядаючы кару зь вецьця, і зусім не палохаюцца машыны. Або статак дзікоў, калматых, бы тыя маманты, якія сярод белага дня праходзяць за 15—20 мэтраў ад нашае брыгады па сваіх сьвінячых справах...

Назіраеш, як на 30-градусным марозе, зваленая на мерзлую зямлю, выбухае з фаервэркам ашкелкаў ломкая, бы зь лёду, хвоя — і кожны ўдар сякеры аб сук адгукаецца дзіньканьнем каляднага званочка...

Або ўзяць вогненны сьнег... Так, узяць жменяй, каб сьцерці рукі ад бруду, саляркі ці змазачнага алею (у інтэрнаце ўжо паўгоду ня могуць паставіць рукамыйнік) — ад пякучага холаду далоні дымяць. Кідаеш запалку на праліты бэнзін, і сьнег гарыць зыркім полымем! Аднойчы, калі нас закінулі на *падсыпку* (дзяўбсьці на ўзбочыне трасы зямлю, каб груженыя лесавозы маглі ўзьняцца на сьлізкіх пад'ёмах), мы з напарнікам гарачага сьнегу

## СЬЦІСЛА

**Правакацыі ў Бялынічах**

28 лютага актывіста ПБНФ **Барыса Вырвіча**, жыхара в.Вялікая Машчаніца, удома затрымалі міліцыянты, завезьлі ў Бялынічы, дзе зьвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы на адрас начальства. Аднак раённы суд справу разглядаць адмовіўся: Вырвіч у ім — народны засядальнік.

Моладзевага актывіста **Алега Мяцеліцу**, затрыманага ў Менску 16 лютага на акцыі Дзень салідарнасьці і асуджанага на 15 сутак арышту, 3 сакавіка адвезьлі ў Бялынічы й высадзілі каля райаддзелу міліцыі. На вуліцы да яго адразу падышлі два чалавекі ў цывільнай вопратцы, якія карцінна паваліліся на зямлю: яны заявілі, што Мяцеліца пабіў іх. На яго склалі пратакол за дробнае хуліганства. 4 сакавіка (выхадны дзень) судзьдзя Уладзімер Гуз прысудзіў актывісту 15 сутак арышту.

**Справа «Партнэрства»**

Студэнта Гомельскага дзяржуніверсытэту **Дзяніса Залатарова** выклікалі 28 лютага зь лекцыі ў дэканат юрфаку, дзе яго чакаў чалавек у цывільным, які назваўся капітанам КДБ. Кадэбіста цікавіла дзейнасьць «Партнэрства».

2 сакавіка затрыманым **Энíры Браніцкай, Мікалаю Астрэйку, Аляксандру Шалайку** і **Цімоху Дранчуку** прад'явілі абвінавачаньне. Шалайку — паводле арт.193 ч.2 Крымінальнага кодэксу (кіраўніцтва незарэгістраваным грамадзкім аб'яднаньнем, якое замахваецца на правы і абавязкі грамадзянаў). Абвінавачаньне астатнім невядомае, бо адвакату Паўлу Сапелку забаранілі яго агучваць.

**Мядзел**

**Зьмітра Вінаградава** і **Андрэя Абалевіча** 27 лютага выклікалі ў пракуратуру: за іхныя скаргі на таемнасьць фармаваньня ўчастковых камісіяў актывістам патлумачылі, што яны ня ведаюць закону і зьневажаюць заявай райвыканкам.

**Гомель**

Сьпярша ў пастарунак, а потым у пракуратуру завезьлі 27 лютага **Андрэя Толчына**, затрыманага падчас агітацыі за Мілінкевіча: міліцыянты шукалі чалавека, які здолеў бы пісьменна скласьці пратакол за парушэньне выбарчага заканадаўства.

28 лютага яго і **Кацярыну Гаравую** затрымалі ля гарвыканкаму, дзе яны раздавалі буклеты за адзінага. Быў затрыманы і **Юрась Захаранка**, што раздаваў улёткі за квартал ад іх. На месца затрыманых прыйшлі **Аляксандар Каротчанка** ды **Марыя Багдановіч**: міліцыянты спрабавалі іх затрымаць, але замірыліся на тым, што агітатары адышлі ад гарвыканкаму.

1 сакавіка затрымалі распаўсюднікаў буклетаў **Леаніда Плíску, Артура Цурбакова, Антаніну** і **Генадзя Семянцовых**: іх зьвінавацілі ў распаўсюдзе агітацыйных матэрыялаў у неналежным месцы.

Пяць разоў 1 сакавіка затрымлівалі **А.Толчына**. На яго склалі пратакол за тое, што распаўсюджваў буклеты Мілінкевіча ды газэту «Товарищ». Супрацоўніца ідэалягічнага аддзелу Ірына Клімовіч заявіла, што ён ня меў права раздаваць газэту, бо яе няма ў сьпісе афіцыйных выданьняў, дзе Цэнтравыбаркам дазволіў друкаваць праграмы кандыдатаў у прэзыдэнты.

**Кобрынь**

28 лютага міліцыянты падчас распаўсюду буклетаў А.Мілінкевіча затрымалі **Стаса Кучынскага** й **Аляксандра Елісеева**: у пастарунку ў іх вывучылі буклеты, перапрасілі й адвезьлі на пікет на службовай машыне.

**Віцебск**

28 лютага каля гарвыканкаму затрымалі актывістак АГП **Алену Залескую** і **Тамару Маркушаву**, якія пасьпелі толькі ўзяць у рукі агітацыйныя ўлёткі. Залескай вынесьлі папярэджаньне, а на Маркушаву склалі пратакол за незаконную агіта-

# сьнег

пакаштавалі. Вельмі хацелася піць, а з сабой нічога, а вакол нікога, адно запалкі ды жалезны кубак. Разьвялі вогнішча, растапілі сьнегу, і пілі яго па чарзе з агню, гаркавы ад попелу, мацнейшы за любую гарэлку.

Але самы сапраўдны агнявы сьнег мне давялося ўбачыць на ўборцы дзялянкі, падчас сьнегападу. У вялізным, 4—5 мэтраў вышыні, вогнішчы, дзе спальваліся цэлыя «непрамысловыя» елкі, алешыны, бярозавыя рогі, раптам трэснула ўсярэдзіне, выбухнула салютам іскраў на вышыню пяціпавярховага дому — і потым хвілінамі ціха і ўрачыста ў паветры ірдзела, пераблісквала зь белымі сьняжынкамі чырвонае й аранжавае, нібы зь неба сыходзіла шматтысячная грамада пад бел-чырвона-белымі сьцягамі.

Калі змаўкаюць бэнзапілы й сякеры, калі спыняецца, глухне трактар і зьяжджаюць лесавозы — раптам прыслухоўваесься. У верхавінах дрэваў пад ветрам нараджаецца, расьце й гучыць велічная, уладная нябёсная сымфонія. Чуеш сапраўдную літургію, гімн Творцу, дзе мужчынскія басы зьліваюцца з высокімі нотамі жаночага хору — і заміраеш малітоўна, бы ў храме. Падымаеш вочы ўгару — і бачыш, што насамрэч дзялянка — гэта агромністы пробуруб у неба, прорва ў глыбокі блакіт для тваёй малітвы за ўсю Беларусь.

Насамрэч цуды вакол нас. Госпад даў нам цуд жыцьця, падараваў цудоўныя пачуцьці і пасяліў у найцудоўнейшай краіне ў сьвеце. У такія цуды трэба толькі *паверыць* — і тады хараство й гармонія сэнсу напоўняць цябе ўсяго.

Палякі сьпявалі на плошчах рэлігійныя гімны — і атрымалі праўдзівы цуд. Сэрбы выходзілі на дэманстрацыі хросным ходам за сваім мітрапалітам — і ўбачылі цуд. Украінцы штодня пачыналі Майдан з малітвы — і нарэшце дамагліся цуду.

Вы ўсё яшчэ лічыце, што Беларусь у 2006-м выратуе толькі цуд?

Тады надышоў час паверыць у цуды.

Бо — «чалавеку гэта немагчыма; Богу ж усё магчыма»! (Мацьвея 19:26).

Гэта ж так проста.

Выйсьці ў дзень выбараў на плошчу, насустрач сьвежасьці й волі.

Памаліцца Богу за свабоду, праўду і справядлівасьць для Беларусі.

І гучна, на ўвесь голас, сказаць тое, што думаеш, што адчуваеш, чаго хочаш усім сэрцам:

— Жыве Беларусь!!!

І калі ўбачыш, як неба па-над шматтысячнай грамадою раптам запальваецца агнявым бел-чырвона-белым — ведай: гэты момант увойдзе ў гісторыю Беларусі як цуд 19 сакавіка.

*в.Малое Сітна*

Вы ўсё яшчэ лічыце, што Беларусь у 2006-м выратуе толькі цуд?

## СЬЦІСЛА

цыю (яе затрымліваюць паўторна). Папярэджаньні атрымалі таксама **Арцём Хадыка**, **Міхаіл Рухман**, **Яўген Родзік**, якія раздавалі ўлёткі.

Распаўсюдніка **Зьмітра Петрачэнку** затрымалі 1 сакавіка: на яго склалі пратакол за арганізацыю несанкцыяванай вулічнай акцыі й забралі 36 асобнікаў газэты «Народная воля».

Падчас раздачы ўлётак 5 сакавіка затрымалі **Вераніку Чыж**, **Любоў Кузьняцову**, **Сяргея Парсюкевіча**. У іх канфіскавалі каля 1000 буклетаў А.Мілінкевіча і склалі пратаколы за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак.

### Наваполацак

**Васіля Храмцова** й **Аляксея Трубкіна** затрымалі 28 лютага: яны вывешвалі плякат А.Мілінкевіча ў краме №8 гандлёвага дому «Эканом», вызначанай гарадзкой выбарчай камісіяй як месца агітацыі. Міліцыю выклікала служба аховы й адміністрацыя крамы.

### Палітвязьні

Без тлумачэньня прычынаў адміністрацыя Івацэвіцкай калёніі 28 лютага адмовіла адвакату **Аляксандру Бярылаву** ў сустрэчы з сваім падабаронным — **Валер'ем Леванеўскім**.

**Міколу Статкевічу** 1 сакавіка беспрычынна ўзмацнілі пакараньне: цяпер ён ня мае права пакідаць памяшканьне спэцкамэндатуры ў Баранавічах.

### Грамадзкія арганізацыі

Міністэрства юстыцыі за адсутнасьць юрадрасу ліквідавала грамадзкае аб'яднаньне **«Саюз праваслаўнай моладзі імя сьв.Георгія Пераможцы»**, які ўзначальваў М.Астрэйка.

4 сакавіка апячаталі офіс **Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»**: афіцыйная прычына — аварыйны стан электраправодкі.

### Крымінал

27 лютага актывісту АГП, праваабаронцу з Астраўца **Івану Круку** высунулі абвінавачаньне паводле арт.364 Крымінальнага кодэксу (гвалтоўныя дзеяньні ці пагроза ўжываньня гвалтоўных дзеяньняў у дачыненьні да работніка міліцыі). Максымальны тэрмін пакараньня — пазбаўленьне волі да 6 гадоў.

1 сакавіка кіраўнічку РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт» **Тацяну Процьку** абвясьцілі падазраванай у крымінальным злачынстве: ёй закідаюць нібыта нясплачаныя падаткі за фінансавую дапамогу, якую атрымаў БХК у рамках праграмы TACIS. Крымінальная справа была сваім часам закрытая праз адсутнасьць складу злачынства.

### Бабруйск

Падчас раздачы агітацыйных улётак 26 лютага затрымалі **Аляксандра Чыгіра**. У пастарунку яго хацелі зьвінаваціць у арганізацыі несакцыяванага пікету, але адпусьцілі, як толькі даведаліся, што Чыгір — дэпутат гарсавету.

### Лоеў

Аўтамабіль **Алега Шабетніка**, прадстаўніка штабу А.Казуліна, затрымалі каля Лоева 1 сакавіка. На Шыбетніка склалі пратакол за парушэньне памежнай зоны супрацоўнікі ДАІ й памежнік, якія знаходзіліся ў машыне хуткай дапамогі. У Лоеве зь яго спатрабавалі штраф у 2 базавыя велічыні (62 тыс.), а калі Шабетнік заявіў пра незаконнасьць штрафу, яго выгналі з гораду.

### Горадня

1 сакавіка затрымалі **Вадзіма Саранчукова**, на яго склалі пратакол за дробнае хуліганства, загадалі адразу адлучыць мабільны тэлефон, завезьлі ў суд. Суд 2 сакавіка асудзіў яго на 5 сутак арышту.

### Затрымліваюць загадзя

Каб рэгіянальныя актывісты ня ехалі ў Менск на сустрэчу зь Мілінкевічам 2 сакавіка, іх

**Працяг на старонцы 14.**

# Зварот вернікаў: Цемра ахінула краіну

Мы зьвяртаемся да вас, хрысьціяне: праваслаўныя, каталікі, эвангельскія хрысьціяне, а таксама ўсе людзі добрага сумленьня. У сёньняшні час, няпросты для Беларусі, нам трэба аб'яднацца для паста і малітвы — каб прасіць Божай міласьці для ацаленьня нашай нацыі.

Час сапраўды складаны. «І суд адступіў назад, і праўда стала здалёку, бо ісьціна спатыкнулася на плошчы, і сумленнасьць ня можа ўвайсьці. І ня стала ісьціны, і той, хто бяжыць ад зла, падпадае пад зьнявагу. І Гаспад убачыў гэта, і агідна было вачам Яго, што няма суду» (Ісая, 59:14—16).

Лік разводаў перавышае лік шлюбаў, кожнае чацьвертае дзіця нараджаецца па-за шлюбам, кожны трэці мужчына крануты алькагалізмам, у адносінах паміж людзьмі пануюць злоба, хамства і хлусьня. Многія хрысьціянскія сьвятыні зьняважаныя, а хрысьціянаў караюць за малітву ля іх сьценаў. Цемра атэізму, нэапаганства, бязглуздага спажывецтва, агрэсіўнага эгаізму ахінула краіну.

Аднак «шмат можа ўзмоцненая малітва праведнага» (Якуба, 5:16). Менавіта Гаспод, сапраўдны Творца гісторыі, можа даць Сваю, так неабходную нам дапамогу, — калі знойдуцца верныя, гатовыя стаць цьвёрда ў малітве за сваю краіну.

Для гэтага давайце разглядаць кожную пятніцу як дзень усеагульнага зьмірэньня, паста і малітвы.

У гэты дзень, штопятніцы, а 20.00 вечара зьвернем нашыя сэрцы да Магутнага Бога і ў адзінстве ўзьнясём малітвы аб міласьці і ласцы для нашай нацыі. Прадметам нашых асаблівых, найбольш старанных малітваў мусяць стаць просьбы аб тым, каб праўда і справядлівасьць узялі верх на нашай зямлі, а ўсялякае беззаконьне было пасаромлена.

Нашае грамадзтва стамілася ад бязьвер'я, абыякавасьці і страху. Мы хочам, каб стандартам чалавечых узаемадачыненьняў — ад найвышэйшых уладаў да самых бедных і непрыкметных грамадзянаў — стала ўзаемная павага, еднасьць у Духу Сьвятым, а арыенцірам — Дзесяць Прыказаньняў Божых.

Таму мы прапануем усім людзям, вернікам розных канфэсіяў, праводзіць гэты дзень згодна з прынятымі формамі іх веравызнаньня, каб аб'яднаная наша малітва была пачутая Госпадам і прынесла дабраслаўленьне, ісьціну і свабоду ў нашу краіну.

Як напісана ў Слове Божым: «І зьмірыцца народ Мой, які называецца імем Маім, і будуць маліцца, і пачнуць шукаць аблічча Майго, і зьвернуць з кепскіх шляхоў сваіх… то Я пачую зь нябёсаў, і прабачу грахі іхныя, і ацалю зямлю іх» (2 Кніга Хронік, 7:14).

Будзем маліцца за Беларусь!

**Айцец Ян Майсейчык,** грэка-каталік, пастар **Эрнст Сабіла,** эвангельскі хрысьціянін, пастар **Андрэй Сідар,** эвангельскі хрысьціянін, бр. **Аляксандар Пісарук** (OFM), каталік, бр. **Пётра Рудкоўскі** (OP), каталік, бр. **Апалінар Нікалаеў** (манах рэдэмптарыст CSSR), грэка-каталік, бр. **Зьміцер Чарнель** (манах-рэдэмптарыст CSSR), грэка-каталік, **Павал Севярынец,** праваслаўны, **Віталь Рымашэўскі,** праваслаўны, **Генадзь Семянчук,** праваслаўны, **Анатоль Трафімчык,** праваслаўны, **Мікалай Арцюхоў,** каталік, **Алесь Аўдзяюк,** грэка-каталік, **Вольга Барок,** эвангельская хрысьціянка, **Людміла Белая,** эвангельская хрысьціянка, **Аляксандар Белы,** каталік, **Антон Францішак Брыль,** каталік, **Сяржук Варабей,** грэка-каталік, **Тацяна Волчак,** эвангельская хрысьціянка, **Эдвард Галустаў,** каталік, **Алесь Гелагаеў,** каталік, **Вольга**

## ХРОНІКА

**Працяг са старонкі 13.**

затрымлівалі мясцовыя сілавікі. У Воршы 1 сакавіка атрымаў позву ў ваенкамат моладзевы актывіст **Ігар Казьмярчак**. У міліцыю выклікалі прафсаюзнага актывіста **Васіля Леўчанкава**.

Выклікі ў міліцыю на 2 сакавіка атрымалі таксама актывісты штабу Мілінкевіча з Горадні: **Сяргей Мальчык, Анатоль Хацько, Максім Губарэвіч, Эдуард Дмухоўскі. Віктара Сазонава** выклікалі ў аўтаінспэкцыю на ўласным аўтамабілі. Таксама дапытвалі рэдактара часопісу «Magazyn Polski na uchodzstwie» **Андрэя Пачобута** — у справе палітычных графіці, якія зьявіліся на сьценах дамоў у цэнтры Горадні.

Пад Віцебскам 2 сакавіка міліцыянты затрымалі мікрааўтобус з 11 актывістамі ПБНФ. На выезьдзе з Наваполацку — аўтамабіль **Сяргея Сідарава**, дзе ехалі таксама **Вячаслаў Крышталёў, Аляксей Трубкін** і **Генадзь Вазьміцель:** машыну адправілі ў пастарунак, каб праверыць, «ці ня ў вышуку яна».

Маршрутную таксоўку, у якой з Жодзіна ў Менск 2 сакавіка ехаў актывіст ПБНФ **Аляксей Лапіцкі**, затрымалі каля Смалявічаў міліцыянты–аўтаматчыкі. Яны паведамілі, што мелі ананімнае тэлефанаваньне: у маршрутцы вязуць зброю.

У Баранавічах затрымалі аўтамабіль **Юрася Губарэвіча**, кіраўніка Берасьцейскага абласнога штабу А.Мілінкевіча. Міліцыянты заявілі, што ягоны аўтамабіль падобны да таго, што ўчыніў дарожна–транспартнае здарэньне. Тамсама затрымалі аўтамабіль, у якім ехалі **Ўладзімер Вялічкін, Канстанцін Турчыняк, Ірына Лаўроўская, Паліна Панасюк, Сяргей Вакуленка**.

### Прафсаюзы пад наглядам

На агульным сходзе 1 сакавіка 150 работнікаў гомельскага аўтапарку выказаліся за ўтварэньне прафсаюзнай суполкі незалежнага прафсаюзу РЭП. Адміністрацыя прадпрыемства выклікала міліцыянтаў: яны затрымалі **Аляксандра Еўсейчука** і **Віктара Казлова**, зьвінаваціўшы іх у агітацыі за ўступленьне ў «няісны прафсаюз РЭП».

Суполцы **Свабоднага прафсаюзу Беларускага** на заводзе «Полацак–Шкловалакно» 1 сакавіка адмовілі ў заяўцы на правядзеньне пікету: гарвыканкам заявіў, што каля прахадной праводзіць пікет нельга.

### Кніга Шушкевіча

У **Станіслава Шушкевіча** 1 сакавіка беларускія памежнікі канфіскавалі ягоную кнігу «Нэакамунізм у Беларусі», выдадзеную ў Расеі, бо вырашылі, што там можа быць дрэнная інфармацыя наконт Лукашэнкі.

### Магілёў

2 сакавіка затрымалі **Ўладзі-**




**Грачова,** эвангельская хрысьціянка, **Ігар Гурын,** эвангельскі хрысьціянін, **Зьміцер Дашкевіч,** эвангельскі хрысьціянін, **Дзьмітры Дзегцяроў,** эвангельскі хрысьціянін, **Георгі Дзьмітрук,** эвангельскі хрысьціянін, **Алесь Жлутка,** каталік, **Вольга Елісава,** эвангельская хрысьціянка, **Алена Зяленка,** каталічка, **Андрэй Катлярчук,** хрысьціянін, **Алег Крымоўскі,** эвангельскі хрысьціянін, **Ірына Куцуха,** эвангельская хрысьціянка, **Ірына Лаўроўская,** каталічка, **Натальля Лаўроўская,** каталічка, **Юры Лаўроўскі,** каталік, **Юры Лескавец,** эвангельскі хрысьціянін, **Сяргей Панасевіч,** грэка-каталік, **Аксана Радзевіч,** эвангельская хрысьціянка, **Марыя Савушкіна,** эвангельская хрысьціянка, **Альбіна Семянчук,** каталічка, **Юры Сьмірноў,** эвангельскі хрысьціянін, **Леанід Ульскі,** каталік, **Міхась Чыжык,** эвангельскі хрысьціянін, **Канстанцін Шастоўскі,** грэка-каталік, **Кастусь Шытль,** каталік, **Валянціна Шычко,** эвангельская хрысьціянка, **Аляксей Шэін,** эвангельскі хрысьціянін, **Юлія Янкоўская,** эвангельская хрысьціянка.

**Зварот адкрыты да падпісаньня. Усе, хто гатовы падтрымаць гэтую прапанову, могуць дадаць свой подпіс праз электронную пошту alaksiejs@yahoo.com**

## ХРОНІКА

**мера Хаманеева**, які налепліваў перадвыбарчыя ўлёткі А.Мілінкевіча ў пад’езьдзе ўласнага дому.

### Скандальны чацьвер

Пры спробе зарэгістравацца ўдзельнікам усебеларускага сходу 2 сакавіка быў зьбіты і затрыманы кандыдат у прэзыдэнты **Аляксандар Казулін**. Зьбітыя таксама былі аднапартыйцы Казуліна генэрал **Валер Фралоў**, юрыст **Алег Волчак**, карэспандэнт агенцтва «Reuters» **Дзьмітры Мадорскі**, карэспандэнт газэты «Комсомольская правда в Беларуси» **Алег Улевіч** (трапіў у больніцу), карэспандэнт агенцтва «БелаПАН» **Сяргей Пульша**, журналіст **Іван Лабачоў**, **Уладзімер Севярын**. Карэспандэнта «БелГазеты» **Дзьмітрыя Брушка, А.Улевіча, Уладзімера Казуліна** (брата кандыдата) завезьлі ў пастарунак. Ненадоўга затрымалі фотакарэспандэнтаў газэты «Наша Ніва» **Юлію Дарашкевіч**, агенцтваў «Associated Press» **Сяргея Грыца** і **Васіля Фядосенку** з «Reuters», супрацоўніка прэсслужбы А.Казуліна **Андрэя Максімава**. Па машыне **Юр’я Радзівіла**, зь якой паплечнікі Казуліна фатаграфавалі затрыманьне, невядомы чалавек у цывільным адкрыў агонь зь пісталета. Па выніках дня распачатыя крымінальныя справы на А.Казуліна (хуліганства) і Ю.Радзівіла (супраціў работнікам міліцыі, гвалтоўныя дзеяньні ці пагроза гвалтоўных дзеяньняў у дачыненьні да работнікаў міліцыі). Радзівіла затрымалі, калі ён прынёс заяву ў пракуратуру на чалавека ў цывільным, што страляў па ягонай машыне. У розных месцах Менску былі затрыманыя каля 60 прыхільнікаў А.Казуліна.

Увечары на сустрэчы з А.Мілінкевічам палкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка, кіраўнік Спэцыяльнага аддзелу хуткага рэагаваньня, ударыў журналіста радыё «Свабода» **Валер’я Каліноўскага**. Удар дубінкай ад АМАПаўца атрымаў журналіст газэты «Белорусы и рынок» **Генадзь Барбарыч**. Перад пачаткам сустрэчы былі затрыманыя моладзевыя актывісты «Маладога фронту» **Зьміцер Хведарук**, **Настася Палажанка** і яшчэ 8 чалавек: іх вывезьлі за горад і высадзілі.

З аэрапорту «Менск–2» дэпартавалі назад ва Украіну кіраўнікоў украінскай грамадзянскай партыі «Пора» **Ўладзіслава Каськіва**, **Сяргея Еўтушэнку** і прэс-сакратара **Марыяну Пачтар**. Украінцаў затрымалі супрацоўнікі ўпраўленьня КДБ па барацьбе з тэрарызмам «Альфа». На афіцыйную ноту ўкраінскага МЗС беларускія дыпляматы адказалі, што ня будуць тлумачыць прычынаў дэпартацыі.

### Суд у Ашмянах

2 сакавіка пракуратура Ашмянскага раёну накіравала ў суд спра-

**Працяг на старонцы 16.**

# Дзёньнік салідарнасьці

Турэмныя нататкі **Барыса Гарэцкага.**

Схапілі нас у чацьвер 16 лютага. На Кастрычніцкай плошчы сабралася чалавек 200, у асноўным моладзь, са сьвечкамі ды партрэтамі зьніклых. І 200 голеных галоваў у спартовых касьцюмах з рацыямі.

Хлопцы і дзяўчаты 16—17 гадоў спрабуюць утрымацца на вольнай ад катка пляцоўцы ля нулявога кілямэтру. Гэбэшнікі трапнымі ўдарамі выбіваюць у іх з рук запаленыя сьвечкі ды адціскаюць да Інтэрнацыянальнай...

Нас падхапілі. Цягнуць да аўтобусу, дзе сядзім паўгадзіны. Адзін супрацоўнік знаёміць мяне з другім:

— Падпалкоўнік...

З рацыі чуецца мацерная лаянка:

— Адціскаем... Бі!.. Асьцярожна — журналісты! Выбівайце сьвечкі!

Вечар праходзіць ва ўтульнай дзяжурцы і цёплым «стакане» Цэнтральнага РУУС. Уночы нас завезьлі на Акрэсьціна, закінулі ў вялікую камэру на трэцім паверсе. З ранічкі — прыборка, праверка, сьняданак... Мы спакойна чакаем суду. Ведаем — будуць суткі. Ва ўсіх 156 артыкул і пэрсанальны загад нэўтралізаваць. Праз гадзіну вязуць-такі на судзілішча да Бычка. Выводзяць па адным.

Першы — Алег — спадзяецца на штраф, віну прызнае: хуліганіў, лаяўся матам. Вырак: дзесяць сутак адміністрацыйнага арышту. Другі — затрыманы разам са мной Павал. Просіць адваката, а мяне — сьведкам.

Іду я. На трэцім паверсе ў калідорчыку шмат паплечнікаў, падтрымліваюць. Хадайнічаю аб адвакаце і заяўляю сьведкам Паўла. Вяртаюць уніз. Міліцыянты лаюцца: «Пасядзіце тут, памерзьніце, будзе вам адвакат». Адвакат прыяжджае праз гадзіну. Выступаю ў Паўлюка сьведкам, выходжу. Мае сьведчаньні судзьдзя адхіляе... Дзесяць сутак. Вядуць мяне. Узгадваюць затрыманьне 26 красавіка. Ну, думаю, усё — два тыдні буду сядзець. Судзьдзя доўга глядзіць мне ў вочы, быццам выпрабоўвае, а я — яго. Відавочна, што і ён, і сакратарка разумеюць — справа ліпавая. Запрашаюць амонаўцаў... Вырак: дзесяць!

Я, нечакана рады, выходжу. Зьміцер пасьпявае перадаць Новы Запавет і трохі ежы. Лысагаловыя амонаўцы прыціскаюць яго і некалькі чалавек да сьцяны. Чуецца дзявочы крык.

На акрэсьцінскую вячэру не пасьпяваем. Зь ежы ў нас толькі хлеб, захаваны ад сьняданку. Молімся і кладземся спаць.

Субота. Па абедзе — перадача й пераезд да суседзяў-зуброў. Так упяцёх і сядзім да канца. Размаўляем, робім шырокі плян дзеяньняў на наступныя дні. Сёньня на паверсе дзяжурыць малады старшына — шчыры і справядлівы.

Нядзеля — дзень сьвяты. Молімся, сьнедаем смачнай грэчкаю, чытаем перададзеныя ўчора газэты. Аналізуем асьвятленьне рэгістрацыі кандыдатаў у СМІ. Партрэты некаторых кандыдатаў займаюць пачэснае месца ў камэры. На абед — халодная поліўка зь нейкай дзіўнай травой і каша з «тапачкам» — хлебнай катлетай. У камэры вельмі цёпла, час ад часу даносяцца з разьбітай шыбы песьні салдацікаў Белпалка. Рабіць нічога ня хочацца. Перад вачыма ўсплываюць вобразы сяброў, родных.

У панядзелак я дзяжуру па «хаце» — устаю раней за ўсіх, прыбіраю, выношу сьмецьце. У сярэдзіне дня доўгачаканы момант — нас вядуць у лазьню. Гэта адзінае для нас асяродзьдзе свабоды ў турме. Перакусваем і кладзёмся адпачываць (сьвятло выключаюць толькі ўдзень). Пасьля абеду перачытваю Новы Запавет, і перад вачыма быццам паўстаюць эвангельскія вобразы. Прашу ў Госпада, каб ніхто болей не патрапіў у турму.

Яўген жартаўліва прапануе заўтра пачаць рыць падкоп. Але лыжкі ў нас ужо забралі, і засталася толькі дзяжурная конаўка бяз ручак. Дарэчы, тутэйшыя кубкі патрабуюць асобнай узгадкі. Некаторыя зь іх выглядаюць, як пасьля атамнай вай-

**Апэльсін, ледзяны чай — алькаголь.**
**Баландзён, вертухай — разносчыкі ежы.**
**Дальняк, трыбуна — прыбіральня.**
**Лавіліся — сядзелі разам.**
**Луна — ліхтар над уваходам.**
**Мітынгаваць — хадзіць па сцэне.**
**Пыхнуць — папаліць.**
**Рэшка — краты на вокнах.**
**Сцэна — ляжак.**
**Тапачак — хлебная катлета.**
**Тэлевізар — акенца для ежы.**
**Хата — камэра.**
**Хлёр-галава — санітарка.**
**Чыфір — энэргетычны напой.**

## ХРОНІКА

**Працяг са старонкі 15.**

ву **Тацяны Клімовіч**, зьбіральніцы подпісаў за А.Мілінкевіча. Яе вінавацяць у фальсыфікацыі: у яе падпісных лістах выявілі подпіс і пашпартныя зьвесткі чалавека, які памёр некалькі гадоў таму. Т.Клімовіч цьвердзіць, што гэта правакацыя.

Яшчэ трое зьбіральнікаў з ініцыятыўнай групы А.Мілінкевіча — **Яўген Невядомскі, Вікторыя** і **Браніслаў Нурчынскія** — атрымалі афіцыйныя папярэджаньні ад пракуратуры за парушэньні выбарчага заканадаўства: у некалькіх выпадках сямейнікі ставілі подпісы адзін за аднаго.

### Берасьце

3 сакавіка міліцыянты з аўтаматамі затрымалі аўтамабіль, у якім ехалі **Зьміцер Шыманскі** й **Дзяніс Турчаняк**: на машыне быў прымацаваны плякат «Берасьце за Мілінкевіча». Актывістаў адпусьцілі пасьля паўгадзіннай гутаркі. Машыну Турчаняка 5 сакавіка міліцыянты спынялі двойчы, але затрымліваць і складаць пратакол не хацелі.

### Газэту не пусьцілі да чытачоў

3 сакавіка ўвечары каля Дуброўны (Віцебская вобл.) міліцыянты затрымалі 2 аўтамабілі, якія везьлі з Смаленску 250-тысячны наклад спэцвыпуску недзяржаўнай газэты **«Народная воля»**. Газэту даставілі ў Віцебск, дзе яе арыштавалі без складаньня пратаколаў «за парушэньне выбарчага заканадаўства». Нумар прысьвячаўся падзеям 2 сакавіка ў Менску.

### Жлобін

5 сакавіка затрымалі моладзевага актывіста **Эдварда Зелянкова** падчас маляваньня графіці «За свабоду!», «За Мілінкевіча!». На яго склалі адміністрацыйны пратакол.

### Рагачоў

6 сакавіка Рагачоўскі раённы суд аштрафаваў агітатара **Уладзімера Хадасевіча** на 10 б.в. за распаўсюд буклетаў А.Мілінкевіча ў «неналежным для агітацыі» месцы: 26 лютага агітатара затрымалі каля цэнтральнага рынку Рагачова.

**АШ**




ны. Для сутачнікаў такі кубак — гэта і малаток, і нож, і шмат іншых рэчаў.

Аўторак. Замест учорашняга круглатварага старшыны на павярховую вахту заступае Барысаўна — прапаршчык гадоў сарака. Сябры перадаюць нам кнігі. Хата сьціхае на некалькі дзён. Міліцыянты гэтаму вельмі дзівяцца. Чытаю седзячы, бо ляжаць немагчыма з-за болю ў бакох. Увечары стала вельмі халодна — зьмяніўся вецер. Прымаем рашэньне заканапаціць газэтамі дзіркі ў разьбітым шкле, што выклікае дзікі пратэст ахоўнікаў. Вывешваем на вонкавыя краты джынсавую стужку. Менавіта ў зьняволеньні разумееш, наколькі важным для чалавека зьяўляецца адчуваньне салідарнасьці. У камэры жывеш думкаю, што пра цябе памятаюць, клапоцяцца, спачуваюць і ведаюць.

Асобнымі словамі трэба ўзгадаць яшчэ некалькі рэчаў акрэсьцінскага абыходку. «Сцэна» — драўляны ложак, памер якога вызначае колькасьць чалавек у камэры. Сцэна — гэта стол, крэсла, ложак і пляцоўка для шпацыру. Яна ўшчэнт размалявана надпісамі й шматлікімі дошкамі для разнастайных гульняў. Па-над дзьвярыма зьзяе вялізны надпіс «Малады фронт», выразаны яшчэ ў 2001 г.

Серада й чацьвер праходзяць вельмі спакойна. Чутны толькі складныя сьпевы салдацікаў з нагоды 23 лютага. Пятніца. У камэры вельмі халодна, бо малады задзірлівы лейтэнант, які працуе ўнізе, прымусіў разабраць акно. Пішам чарговую нататку з надзеяй выкінуць яе ў дзірку ў шыбе — чакаем, што хтосьці абавязкова перадасьць «Нашу Ніву». Слухаем цікавую ангельскую казку пра лагоднага цмока, якую чытае 33-гадовы Алег.

Субота. Абвяшчаю пост перад нядзеляй, малюся за наш гаротны край, за ўсіх беларусінаў, каб Бог даў ім розуму і сьмеласьці, каб зрынуў путы савецкага рэжыму і абвесьціў Сваё валадарства над Беларусьсю.

**Барыс Гарэцкі (на фота зьлева)** нар. у 1986 у Менску. Бацька, сп.Кастусь, — мастак, маці, спн.Эла, — журналістка. Барыс — хрысьціянін, ходзіць у пратэстанцкую царкву Яна Прадвесьніка. Вольнага ад палітыкі часу для хобі, як прызнаўся, ня мае. Седзячы на Акрэсьціна, перачытваў кніжкі далёкага сваяка — Максіма Гарэцкага.

Надыходзіць доўгачаканая нядзеля. З раніцы сьвяточная малітва, чытаем Сьвятое Пісаньне. Ямо. Апошні дзень праходзіць найбольш марудна. Нарэшце прыходзіць наш знаёмы малады старшына.

— Гарэцкі, Корбан, Фігурын — з рэчамі...

І вось! Мы на волі! Пасьля дзесяці дзён у смуроднай турме найбольш моцна адчуваецца паветра свабоды — той вецер пераменаў, які праз месяц *зьменіць гэтую краіну.*

# Шчучынскія баевікі

Шчучынскія дэмакратычныя актывісты апошнім часам зазналі з боку праваахоўных органаў пільную ўвагу.

2 сакавіка позна ўвечары ў Шчучыне ў двух актывістаў штабу Аляксандра Мілінкевіча адбылісяператрусы. Сяргея Ляшкевіча пасьля ператрусу даставілі ў СІЗА. Супраць яго заведзена крымінальная справа паводле арт.293 ч.3 Крымінальнага кодэксу (навучаньне ці іншая падрыхтоўка асобаў да ўдзелу ў масавых беспарадках). Васіля Бязьмена падазраюць у тэрарызьме. Міліцыянты азнаёмілі сп.Васіля з пастановай пракурора і запрапанавалі, каб той паказаў выбуховыя рэчывы. Канфіскавалі матэрыялы з асабістага архіву, сыстэмны блёк кампутара, дыскеты. Ператрус праводзіўся ў адсутнасьць адваката.

У Шчучынскім РУУС тлумачыць, што стала падставай для крымінальнай справы, адмовіліся. Затое патлумачыў міністар Уладзімер Навумаў у інтэрвію расейскаму Першаму каналу 4 сакавіка: «Апазыцыя ўзмоцнена рыхтуецца да 19 сакавіка ўсімі магчымымі процізаконнымі сродкамі. У Шчучыне адзін з грамадзянаў сам зьвярнуўся, што яго рыхтуюць як баевіка. Мы канфіскавалі вялікую колькасьць касэтаў, на якіх паказана, як патрэбна паводзіць сябе ў часе масавых беспарадкаў, як супрацьдзейнічаць міліцыі».

Сяргей Ляшкевіч кажа, што некалькі тыдняў таму яму прыйшлі некалькі позваў, афармленых з парушэньнем заканадаўства, у якіх яго вінавацілі ў распаўсюдзе ўлётак пра выступ Мілінкевіча ў СМІ. Сяргей напісаў заяву ў пракуратуру і 2 сакавіка атрымаў запрашэньне на разгляд заявы. Па дарозе ў пракуратуру яго затрымалі міліцыянты ў цывільным і паведамілі, што супраць яго заведзена крымінальная справа. У Шчучынскім РУУС Сяргея азнаёмілі з заявай грамадзяніна Бурдзея, які прызнаў, што сп.Ляшкевіч навучаў яго «як баевіка». Потым быў ператрус і 36 гадзінаў у мясцовым СІЗА, у якім «жахлівыя ўмовы — аднаразовае наведваньне прыбіральні ў суткі і аднаразовае харчаваньне, якое, праўда, някепскае. Плюс холад і вільготнасьць».

**Васіль Бязьмен** (нар. 1965). Псыхіятар. Жанаты, мае дачку 13 год.

**Сяргей Ляшкевіч** (нар. 1978). Паводле адукацыі — аграном. З 1997 — сябар Партыі БНФ. Браў актыўны ўдзел у выбарах у парлямэнт у 2004 (ініцыятыўная група А.Мілінкевіча). На дадзены момант беспрацоўны. Нежанаты.



**Сяргей Ляшкевіч (зьлева) і Васіль Бязьмен на магіле Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у вёсцы Стары Двор Шчучынскага раёну.**

Пра сп.Бурдзея Сяргей распавёў наступнае: «Гэты хлопец прыйшоў да нас у ініцыятыўную групу пры канцы году зьбіраць подпісы. Пра што пазьней пашкадавалі. На Новы год ён пабіўся зь міліцыянтам, а пазьней яго арыштавалі па падазрэньні ў крадзяжы будматэр'ялаў. Некалькі тыдняў таму яго пад падпіску пра нявыезд выпусьцілі з гарадзенскага СІЗА». Паводле Ляшкевіча, будучы «баявік» неаднаразова тэлефанаваў яму з правакацыйнымі пытаньнямі кшталту: калі ўжо на Менск, што з сабою браць? Сяргей кажа, што неяк жартам адказаў: «Калі ты такі дурань, то бяры з сабою гранаты ці што ў цябе там ёсьць». Ён цьвердзіць, што амаль упэўнены, што яго тэлефон праслухоўваецца.

Цяпер сп.Ляшкевіч на волі. Яму ня высунулі афіцыйнага абвінавачаньня, аднак могуць зрабіць гэта цягам 10 сутак, то бок да 12 сакавіка. Пакуль ён праходзіць па справе ў якасьці падазраванага і мусіць зьяўляцца на выклікі сьледчага, а таксама паведамляць пра зьмену месца жыхарства. «Гэтыя ператрусы і арышты — праява незадаволенасьці мясцовай вэртыкалі самім фактам пражываньня Мілінкевіча ў гэтай мясцовасьці. Ды яшчэ наша актыўнасьць пад бокам. Але назьбіраць матэрыялаў на нас ня выйшла. Таму і канфіскоўвалі, што пад руку трапіла».

В.Бязьмен кажа, што дзякуючы Інтэрнэту пра Шчучын даведаўся ўвесь сьвет. Падчас ператрусу міліцыянты канфіскавалі нават сьпісы сяброў гарадзкой суполкі ТБМ, якую ў 2002 г. так і не зарэгістравалі. У ролі панятых выступілі жыхары іншых райцэнтраў — сп.Урбановіч зь Ліды і сп.Коўшык з Астраўца, якія на гэты момант адбываюць пакараньне на шчучынскай «хіміі». Міліцыянты не задаволілі просьбу Васіля Бязьмена запрасіць у якасьці панятых яго суседзяў. Ператрус суправаджаўся апэратыўнымі здымкамі, што, аднак, не знайшло адлюстраваньня ў выніковым пратаколе.

Перасьлед з боку ўладаў зазнаюць і паплечнікі перасьледаваных актывістаў. Так, сп.Генадзь Кіенка і Пётра Кухарчык цьвердзяць пра тое, што за імі сочаць, пра праверкі на дарогах, затрыманьні падчас раздачы ўлётак. Некалькі разоў яны прыкмячалі за сабою «хвост» — чырвоныя «жыгулі». Апошняе затрыманьне адбылося на гарадзкім рынку, дзе актывістаў разам з В.Бязьменам затрымалі за раздачу афіцыйных агітацыйных матэрыялаў. Пратакол склаў маёр Мікалайчык у прысутнасьці супрацоўніка пракуратуры Віньніцкага, які сьпярша адмовіўся назвацца.

Заўважаныя былі пры гэтым і панятыя, што прысутнічалі пры ператрусе на кватэры Васіля Бязьмена. Як патлумачыў маёр Мікалайчык, гэта «нашыя штатныя панятыя».

Пётра Кухарчык паведаміў, што некалькі дзён таму яго пасярод гораду блякавалі два аўтамабілі. Міліцыянты патлумачылі кіроўцу, што яго аўтамабіль быў заўважаны побач зь месцам злачынства. Анічога не знайшоўшы ў салёне ды багажніку, аўто сп.Кухарчыка адпусьцілі.

**Сямён Печанко**

# 15 крымінальных справаў

палітычнага характару за апошнія два месяцы.

Крымінальныя справы напярэдадні выбараў растуць як грыбы пасьля дажджу. На мінулым тыдні міліцыя ў Нясьвіжы распачала справы супраць 24-гадовай актывісткі Насты Азаркі і двух яе таварышаў. Гэта 14 і 15-я за апошнія два месяцы крымінальная справа ў дачыненьні да моладзевых актывістаў.

28 лютага Насту выклікалі ў райаддзел і паведамілі, што ў горадзе зьявілася шмат палітычных графіці. Таму адкрытая крымінальная справа, у якой дзяўчына фігуруе як падазраваная. У дзяўчыны адабралі пашпарт, паабяцаўшы аддаць дакумэнт па заканчэньні сьледзтва.

2 сакавіка Наста мелася прыехаць у Менск на сустрэчу выбарцаў з А.Мілінкевічам, але ня здолела: у гэты дзень у яе і яшчэ двох моладзевых актывістаў — Максіма Кокарава і Ўладзімера Хоміча — узялі падпіску пра нявыезд. Наста кажа, што ёй паказалі пастанову: супраць яе распачатая крымінальная справа за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.

Наста даўно вядомая ўдзелам у палітычным жыцьці. 21 ліпеня 2004 г. яна ўдзельнічала ў акцыі, прысьвечанай 10-гадоваму кіраваньню Лукашэнкі, адседзела суткі, пра што напісала ў «НН». «У Нясьвіжы, — кажа дзяўчына, — да апошняга часу думала, што я адна». Хаця ў горадзе ёсьць і суполка БНФ, і «казулінцаў». Наста перажывае, што ў справе фігуруюць меншыя хлапцы — Максім і Ўладзімер.

Беларушчына для дзяўчыны — плён сямейнага выхаваньня: «Мае дзед з бабуляй сядзелі ў сталінскіх лягерах, дзе пазнаёміліся зь беларускімі нацыяналістамі. Бацька на пачатку 1990-х быў у БНФ».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Юр'я Радзівіла (на першым пляне), кіроўцу Аляксандра Казуліна, вінавацяць у замаху на міліцыянта.**

Працы ў Нясьвіжы Наста цяпер знайсьці ня можа, хоць скончыла пэдкаледж (настаўніца малодшых клясаў) і курсы праграмістаў.

7 сакавіка ў Нясьвіжы адбылісяператрусы — у самой Азаркі ды ў актывіста КХП-БНФ Алеся Язьвінскага (па ейнай справе). Канфіскавалі падшыўкі «НН», «НарВолі», улёткі розных часоў. Найболей цікавілі міліцыянтаў дакумэнты цяперашняй кампаніі. «Сочаць увесь час. 4 сакавіка, у Дзень міліцыі, выйшлі на вуліцу — дык нас спынілі і агледзелі, ці не нясём з сабой балёнчыкі з фарбай». Крымінальныя справы заведзеныя на нясьвіскіх актывістаў Уладзімера Хоміча і Максіма Кокарава: іх вінавацяць у «псаваньні дзяржмаёмасьці» палітычнымі графіці. Справу расьсьледуюць міліцыянты з суседняга Клецку, але камэнтароў ніякіх на гэты конт не даюць. Хлопцы маюць абскарджваць заведзеныя справы, бо кажуць, што ніякіх доказаў іхнага ўдзелу міліцыя ня мае.

Актывізаваліся міліцыянты ня толькі ў Нясьвіжы. 2 сакавіка яны двойчы цягам дня прыходзілі дадому да Паўла Красоўскага ў Жодзіне — з пастановай на арышт, падпісанай пракурорам. Нагадаем, што на Паўла заведзеная крымінальная справа за «абразу прадстаўнікоў улады»: ён зьмясьціў карыкатуры на чыноўнікаў гарвыканкаму ў бюлетэні «Назіральнік». Арыштаваць Красоўскага не змаглі, бо яго не было дома. Ня выключана, што неўзабаве на дошцы «Іх шукае міліцыя» пабач з партрэтам Аўтуховіча мы ўбачым партрэт Красоўскага. Розьніца толькі ў тым, што Красоўскі падпіску пра нявыезд не даваў, таму фармальна закону не парушаў.

Асноўны «крымінальны» ўдар, нанесены ўладамі, сёлета прыпаў на моладзь. Зьміцер Касьпяровіч ужо асуджаны на 5 месяцаў. У Магілёве ў пастарунку ад 14 лютага сядзіць Яўген Сувораў: на яго завялі крымінальную справу за ўхіленьне ад войска (арт. 435, ч.1), хаця хлопец камісаваны паводле зроку. У «амэрыканцы» КДБ сядзяць Эніра Браніцкая, Мікола Астрэйка, Аляксандар Шалайка і Цімох Дранчук. У менскай «Валадарцы» чакае суду Артур Фінькевіч, пакуль што на волі яго «падзельнік» Аляксей Янушэўскі. Адкладзены суд над барысаўскімі актывістамі Аляксандрам Казаковым і Зьмітром Зубром.

Івана Крука ў Астраўцы вінавацяць у супраціве міліцыянтам.

Аксану Новікаву ў Менску вінавацяць у падробцы пашпарта.

Аднавілі крымінальную справу на кіраўнічку БХК Таццяну Процьку за нібыта нясплачаныя падаткі.

Сяргея Ляшкевіча з Шчучына вінавацяць наўпрост у падрыхтоўцы беспарадкаў.

Газэту «Згода» вінавацяць у распальваньні рэлігійнай варажнечы.

Юр'я Радзівіла, кіроўцу А.Казуліна, абвінавачваюць у непадпарадкаваньні міліцыі ды пагрозе гвалтоўных дзеяньняў у дачыненьні да міліцыянта.

Завяршае гэты пералік кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін, якога вінавацяць у хуліганстве за спробу прарвацца ў Нацыянальны прэсцэнтар і на ўсебеларускі сход.

**Аркадзь Шанскі**

# «Süddeutsche Zeitung»: Прыгожы парадокс «Беларусь»

Восем прычынаў для таго, каб, нягледзячы ні на што, захапляцца Беларусьсю.

Набліжаюцца прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі. А што акрамя гэтага? Што мы ведаем пра Паўночную Карэю Эўропы, акрамя таго, што адтуль прыходзяць адно дрэнныя навіны і што там нельга сьмяяцца, бо гэта псуе настрой прэзыдэнту? Падчас свайго нядаўняга візыту ў Бэрлін старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанна Літвіна паскардзілася на тое, што брэнд «Беларусь» зводзіцца да гэтай брыдкай карціны. Ня здолеўшы стрымаць згрызоты сумленьня, мы накіраваліся ў пошукі.

## «Студумка»

Людзей з усходу Эўропы ўяўляюць сабе як істотаў, якія ўпарта супраціўляюцца сучасным тэндэнцыям ды, апрануўшы скураную куртку, спартовыя штаны ды памахваючы поліэтыленавым пакетам, цягнуцца ў парк карміць галубоў. Лухта! І доказ гэтаму — студэнцкі часопіс «Студумка». Яго галоўны рэдактар Сяргей Сахараў стварыў, бадай, найкруцейшы моладзевы часопіс ва Ўсходняй Эўропе.

## Шагал

Варта прызнаць: Віцебск дайшоў да ручкі, вуліца за вуліцай поўняцца сацыялізмам, які рассыпаецца ў друз. Але раней гэты горад быў фарпостам індустрыяльнай рэвалюцыі, квітнеючай мэтраполіяй. З трамваем ды мастацкай школай, якая зьявіла сьвету такія моцныя фарбы ды формы, што яны хвалююць і дагэтуль. Яе самага знакамітага прадстаўніка мы даўно лічым французам. Усё-ткі вымавіць Мойша Захаравіч Шагалаў цяжэй, чым Марк Шагал. Але ў яго карцінах, раскіданых па музэях усяго сьвету, жыве стары Віцебск.

## Тысяча блакітных вачэй

У Беларусі больш за тысячу азёраў, абкружаных сасновымі барамі ды бярозавымі гаямі. Улетку там можна плаваць, лавіць рыбу, смажыць шашлыкі ці сядзець на беразе ды аддавацца самым вар'яцкім ідэям. Мой тамтэйшы сябра неяк сказаў: калі-небудзь я буду зарабляць на турызьме. Гэта мая мара. Сёньня ён, згубіўшы надзею, сядзіць у сваёй кватэры.

## Сусьветная культурная спадчына

Беларусь не Кітай. Не такая вялікая. Не такая старая. Хутчэй, гэта краіна для дасьледчыкаў, якія радыя малым адкрыцьцям. Напрыклад, руінам. Ваяўнічыя нацыі, якія маршам хадзілі па гэтых краях, рэдка клапаціліся пра тое, каб нешта тут пакінуць некранутым. Але, нягледзячы на гэта, па колькасьці помнікаў ЮНЭСКО Беларусь апярэджвае Грузію ды Гаіці і толькі крыху адстае ад Ізраілю ды Чылі. Калі бачыш Мірскі замак ці палац у Нясьвіжы, не даеш веры: няўжо калісьці гэта ўсё было ў СССР?

## «Народны альбом»

Беларуская мова? Як яна гучыць? Каб захаваць паліткарэктнасьць, варта адмовіцца ад параўнаньняў ды паклясьціся на сілу музыкі. У 1997 годзе Міхал Анемпадыстаў разам зь цяпер забароненымі рок-гуртамі стварыў арт-фольк-м'юзыкал пра заходнебеларускае мястэчка міжваенных часоў. Сёньня гэты збор песьняў ужо зрабіўся клясыкай. Нягледзячы на засільле тэхна, папсы ды шлягераў-шансонаў, у краіне разьвілася моцная падпольная музычная культура. Як кажа сьпявак ды паэт Лявон Вольскі, «адразу бачна, што мы жывём у краіне, дзе яшчэ трэба за нешта змагацца. І гэта нашмат болей сур'ёзна, чым барацьба супраць «Макдоналдсу».

## Думкі

Людзям, якія думаюць, па савецкай традыцыі даводзіцца туга. Іх лічаць лайдакамі, блазнамі, раздражняльнікамі грамадзкага парадку. Беларусы — народ сялянскі, яны цэняць тых, хто ўмее працаваць у гародзе. Але ёсьць і такія, каго было не затаптаць і ў савецкія часы — пісьменьнікі Васіль Быкаў ды Ўладзімер Караткевіч. На жаль, яны ўжо адышлі ў лепшы сьвет. Аднак пра наступнікаў хваляваца ня варта — пра гэта сьведчыць высокі ўзровень часопісу «ARCHE».

## Дрыгва і душа

Ці гэта магутная Белавеская пушча, ці шырокія прынёманскія даліны, але пры першым поглядзе на сваю прыроду беларус робіцца беларусам з галавы да ног. Асаблівую ролю адыгрывае самы вялікі балотны масіў Эўропы — Палесьсе. Тут, на гэтай непрадказальнай глебе, бадай, і была вынайдзеная беларуская душа. Менавіта тут адбываецца дзея славутай трылёгіі пісьменьніка Івана Мележа «Палеская хроніка». Назву адной зь яе частак, «Людзі на балоце», традыцыйна разумеюць як алегорыю: надзея ёсьць заўжды.

## Захад і Ўсход

«Ды гэта ўсё тыя самыя расейцы». Лёгка сказаць. Але ў беларуса ад гэтых словаў шапка на галаве расьце. Стэрэатыпы будаваліся на глыбокіх падвалінах: ва ўсходнім блёку БССР была вядомая сваімі файнымі лядоўнямі і архаічнымі саламянымі лялькамі, гуртом «Песьняры», які прадаў 20 мільёнаў плытак, ды чырвоным чарцянём-трактарцом МТЗ-50. А яшчэ ўсе ведалі: беларусы — спрэс партызаны. Самі сябе яны называюць талерантнымі. Заўжды спадзяюцца, што навальніца хутка скончыцца.

Людзі на Захадзе лічаць сябе адукаванымі эўрапейцамі ды кпяць з усходніх дзікуноў, якія ня ведаюць, што такое вадаправодны кранік, затое ў іх у жылах цячэ чысты сьпірытус. Але няхай беларускія вёскі і сапраўды маглі б быць кулісамі для сярэднявечнага фэсту, затое ў Менску распрацоўваюць сацыялістычны варыянт танных *Windows*. Па дарогах езьдзяць на вазах, але нярэдка сустрэнеш і дарагі лімузін. Прыгожы парадокс гэтая Беларусь.

**Інга Пэтц, для «Süddeutsche Zeitung». Пераклад са скаротамі Алесь Кудрыцкі**

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир — Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

Счет получателя: **3015 212 000 012** Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьненай. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Сп. Міхайлаў** з вул. Багдановіча, скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка,
а ў Менску — да суботы,
абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю.
Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 618–54–84,
(029) 260–78–32 (МТС)

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

запрашаем прыватных прадпрымальнікаў

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Дзякуй за ахвяраваньні!

Івану Я., Віктару К., Генадзю К.,
У.К., Вячаславу П., Паўлу Ф., Марыі М.,
Міколу Г., Канстанціну З., В.Г., Алене М.,
Э.Н., Аўгіньні М., Н.Б., Аляксандру Л.,
Марыі Г., Зьмітру К., Альбэрту С.,
В.Г., В.П., З.К., Тацяне Г., Максіму С.,
Міхаілу Б., Аляксандру Л., Мікалаю Б.,
Сяргею Ц., Барысу К., Міхаілу Ж., Анатолю
В., Юр'ю М., Івану К.,
Р.Н. зь Менску.
Мікалаю К. з Лунінецкага раёну.
Пятру П., Вользе А., Аляксандру С.
з Горадні.
В.Д. з Барысава.
П.Г. з Мастоўскага раёну.
Валянціне З., Натальлі А. з Гомелю.
Анатолю К. з Баранавіцкага раёну.
Багуславу У. з Івейскага раёну.
А.К. з Гомельскага раёну.
Аляксандру К., Канстаціну М.
зь Берасьця.
Паўлу К. з Наваполацку.
Фёдару К. з Талачынскага раёну.
М.Ж. з Баранавіч.
Алене Дз. з Наваградзкага раёну.
І.Д. зь Мядзельскага раёну.
Анатолю П. з Смалявіцкага раёну.
Сяргею Д., Аксане Б. зь Лідзкага раёну.

# Гісторыя аднаго старшыні

«Саша, ці ты кодэкс выбарчы ведаеш, ці разумееш, што гэта ж — злачынства? Як жа ты мог пагадзіцца?» А той: «Я законаў ня ведаю. Мяне папрасілі, я і пагадзіўся». Пра ўладу на месцах піша **Зьміцер Дрыгайла**.



ЗЬМІЦЕР ДРЫГАЙЛА

**Міхал Розум.**

## Усялякімі словамі называлі

У 1989 г. намесьніка дырэктара ПТВ №23 па выхаваўчай працы Міхаіла Розума абралі дэпутатам Сьмілавіцкага пасялковага савету. 17 гадоў ён кіраваў саветам, перамагаючы у чатырох выбарах запар. Розум ганарыцца тым, што ў 1999 г. прымаў у мястэчку кіраўніка краіны. Нядаўна 58-гадовы старшыня з уласнага жаданьня перастаў быць кіраўніком. Кажа, што ня вытрымаў ціску раённых начальнікаў.

Пакуль у мястэчку не намагаліся працаваць самі на сябе, праблемаў у М.Розума не было. Але старшыня пасялковага савету (які згодна з Канстытуцыяй ёсьць і старшынём выканкаму) у 2000 г. стварыў службу камунгасу са сваім рахункам і дырэктарам. Раённаму начальству гэта не спадабалася, і на выбарах 2003-га ў райсавет — М.Розум зьяўляецца таксама дэпутатам Чэрвеньскага савету дэпутатаў — яму ўпершыню выставілі альтэрнатыву. Але Розум тады на выбарах перамог.

«Усе грошы зь бюджэту, — кажа сп.Міхаіл, — забіраліся ў раён. Я настойваў, каб хоць 50% падаходнага падатку заставаліся ў мястэчку. Гарбарны завод і фабрыка даюць неблагі прыбытак, фармуюць аснову бюджэту, у якім нават графы не было на добраўпарадкаваньне. Новы экскаватар прывёз, сьмецьцевоз, трактар, машыну-самазвал — 6 адзінак тэхнікі».

Аднак з ініцыятывы райвыканкаму ў 2003 г. сьмілавіцкі ЖКГ далучылі да Чэрвеньскага. Розум кажа, што гэта было не на карысьць мястэчку. Пасьля гэтага на самога старшыню пачаўся ціск. «Ну й замардавалі мяне ў раёне апошнім часам! Торгалі на раённых нарадах. Усялякімі словамі называлі: «Сасунок, прысасаўся да ўлады». Ганілі не аднаго мяне, таксама і розных кіраўнікоў аграпрадпрыемстваў, паважаных людзей, добрых спэцыялістаў, рознымі словамі. Вось такая падзяка за ўсё, што рабіў многія гады. Мястэчка на 80% газіфікаванае, раённы бюджэт эканоміць вялікія грошы, тыя, якія раней выкідаліся на торфабрыкеты й дровы. Параўнайце зь іншымі мястэчкамі. У нас жа багацей жывуць. Запытайце ў каго хочаце!»

Мы і запыталі. Настаўніцу школы, прадавачку крамы, дзеда на ровары, кабету з фабрыкі. Усе спачуваюць: «Розум у Сьмілавічы ўсё цягнуў, асфальт клаў, электрычныя слупы ставіў, фарбаваў нешта. Наш чалавек».

## Нагода

24 сьнежня ў абласной «Мінскай праўдзе» быў выдрукаваны артыкул пра Сьмілавічы, у якім Розум сказаў колькі словаў пра добраўпарадкаваньне мястэчка. Аднак 26 сьнежня старшыню выклікалі да абласнога кіраўніка Мікалая Дамашкевіча.

«Чым Дамашкевіч быў незадаволены, ня ведаю. Але сказаў: «Трэба ўмацаваць кадры ў Сьмілавіцкім савеце». Мабыць, гэта была нагода для старшыні Чэрвеньскага райвыканкаму Лапаткі, разабрацца са мной, — мяркуе Розум. — Потым мяне месяц тэрарызавалі. Дэпутатаў таксама прэсавалі, таму на сэсіі 31 студзеня я папрасіў іх вызваліць мяне ад пасады».

Выканаўцам абавязкаў старшыні пасялковага савету стаў дырэктар мясцовай школы Аляксандар Вусікаў. Міхаіл Розум дзівіцца: «Ну ня можа быць старшынём чалавек, які не зьяўляецца дэпутатам, гэта ж парушэньне заканадаўства! Выконваць абавязкі мусіць мой былы намесьнік, якога дэпутаты зацьвердзілі ў 2003 г., — Васіль Сабан, дырэктар валюшна-лямцавай фабрыкі. Я Вусікаву кажу: «Саша, ці ты кодэкс выбарчы ведаеш, закон аб мясцовых саветах, ці разумееш, што гэта ж — злачынства? Як жа ты мог пагадзіцца?» А той: «Я законаў ня ведаю. Мяне папрасілі, я і пагадзіўся».

Відавочна, што парушаны артыкул 20 Закону аб мясцовым кіраваньні й самакіраваньні, дзе дакладна сказана, што старшыня савету абіраецца на сэсіі зь ліку дэпутатаў. А вось пазбавіць яго паўнамоцтваў дэпутаты ня могуць, толькі з уласнага жаданьня. Альбо праз працэдуру адкліканьня дэпутата шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў. Нічога такога зроблена не было.

Розум, які знаходзіцца цяпер у адпачынку, спадзяецца, што яго папросяць вярнуцца. Столькі ж недаробленых справаў!

**Сьмілавічы** — мястэчка ў Чэрвеньскім р-не Менскай вобласьці, на 35 км шашы Менск—Магілёў. 5500 жыхароў. З 1791 г. Сьмілавічы належалі Манюшкам. Гэта радзіма мастака Хаіма Суціна й гісторыка Ібрагіма Канапацкага. Мусульманскі цэнтар: тут здаўна жывуць татары, у мясцовай мусульманскай суполцы — 61 чалавек, нядаўна пабудаваны новы мячэт. Ёсьць праваслаўная царква, пратэстанцкі малітоўны дом. Працуюць гарбарны завод (280 работнікаў), валюшна-лямцавая фабрыка (160 работнікаў), пякарня.



# Пакаваць па поўнай!

Для вярхоў ужо рызыкоўна «кінуць» апазыцыянэрам галасоў у межах статыстычнай пагрэшнасьці. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Ссунуўшы кампанію на зіму, улада, аднак, не замарозіла, як меркавала, актыўнасьць тых, каго кліча «адмарозкамі».

Апазыцыйныя кандыдаты ўдала выкарысталі квоты на тэлевыступы ды паказалі здольнасьць да рэзкіх, нестандартных, асымэтрычных дзеяньняў. І гарадзенскі фізык, і марскі пяхотнік спарадзілі розгалас, на тле якога «народнае веча» выглядала бляклай ксэракопіяй зьездаў КПСС.

Калі што й прымагніціла публіку да экранаў, дык гэта імправізацыі галоўнай дзейнай асобы.

На думку менскага экспэрта Валер’я Карбалевіча, прэзыдэнт, завочна распачаўшы недыпляматычную палеміку з канкурэнтамі, парушыў сама мала два каноны выбарчых тэхналёгіяў. Па-першае, палітык паказвае слабасьць ды нягнуткасьць, калі пачынае наўпрост, са сьлязою ў голасе, апраўдвацца. Гэта сьведчыць, што ініцыятыва — на іншым баку. Па-другое, улазячы ў спрэчку зь меней рэйтынгавымі фігурамі, фаварыт міжволі дадае ім ачкоў.

Скептыкі заўважаюць: а хто іх будзе лічыць, гэтыя ачкі?

Па-першае, каму трэба, падлічаць.

Між іншым, «наверсе» таксама будуць ведаць рэальны расклад, і ён можа ўразіць.

Па-другое, і самі выбарцы зазвычай эмпірычна адчуваюць, наколькі хто моцны. Спачатку Мілінкевіч, а цяпер ужо й Казулін пэўна перасягнулі тую мяжу папулярнасьці, калі для ўлады становіцца рызыкоўна «маляваць» ім галасы ў межах статыстычнай пагрэшнасьці. Надта ж многія не паверацць. Зь іншага боку, адносна вялікі адсотак — гэта сталы пропуск на легальнае палітычнае поле.

Кіроўныя вярхі апынаюцца між двух агнёў.

Натуральна, можна чакаць і зьдзеклівых лічбаў, і здушэньня вулічных пратэстаў. Аднак пераход на цалкам гвалтоўны сцэнар утрыманьня ўлады (сярод Паўлічэнкавых арлоў такое называецца *«пакаваць па поўнай»*) гранічна абвострыць адносіны з Захадам. І тады можа высьветліцца, што дасюль у яго проста рукі не даходзілі да беларускага пытаньня.

Зь іншага боку, і пра пазыцыю Масквы ня варта меркаваць па выказваньнях паслужлівых візытэраў кшталту Грызлова. У расейскай эліце ёсьць дастаткова разумныя галовы, каб не складаць усе яйкі ў адзін кошык. Ёсьць вэрсія, што менавіта Масква (за якой стаяў дзядзька Сэм) праціснула рэгістрацыю Мілінкевіча.

Пэрспэктыва старшынёўства ў «вялікай васьмёрцы» таксама змушае Крэмль трохі ўшчуваць хаўрусьніка, хаця б кулюарна, за зусім ужо брутальны антыдэмакратызм. Але болей расейцы будуць перайманца зь іншае нагоды. Неўзабаве, імаверна, пачнецца чарговае высьвятленьне стасункаў вакол «Белтрансгазу», які для «Газпрому» ўжо колькі часу бы моркаўка перад



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

пысай восьліка.

У выніку і на замежнай арэне беларускае кіраўніцтва рызыкуе трапіць між молатам ды кавадлам. Калі і Захад, і Расея наважацца, хай сабе з розных прычынаў, *«пакаваць па поўнай»*, то мала не падасца.

Расейскі палітоляг Сяргей Караганаў прадракае, што 19-га Лукашэнка атрымае Піраву перамогу. У інтэрвію «БелГазеце» Караганаў заўважыў, што «доўга такога кшталту лідэры ў сучаснай Эўропе не затрымліваюцца».

Караганаў часта кажа тое, чаго ня можа ўслых сказаць Пуцін.



**На фота: камандзір СОБРу Дзьмітры Паўлічэнка (зьлева) назіраецца да кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна (ляжыць на падлозе). Праз сэкунду будзе ўдар. Менск, Палац чыгуначнікаў, 2 сакавіка.**

# Гэты дзень ў гісторыі



Другі дзень вясны 2006 г. увойдзе ў падручнікі гісторыі, якія хутка дзеці будуць вывучаць у форме тэстаў. У афіцыйных падручніках гэта можа выглядаць наступным чынам... Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Тэст: для вучняў 5-й клясы «Ці добра вы ведаеце афіцыйную вэрсію падзеяў 2 сакавіка 2006 г.?»

1. Хто быў рэжысэрам казулінскай акцыі ў Палацы чыгуначнікаў паводле беларускага МЗС?

А) Сусьветная грамадзкасьць — інакш бы кіраўнік АБСЭ гэтак апэратыўна не зрэагаваў бы на арышт лідэра сацыял-дэмакратаў.

Б) Стывэн Сьпілбэрг, якому Казулін паабяцаў у выніку перамогі прадаць за бясцэнак увесь «Беларусьфільм» для экранізацыі сэрыялу «Гарбатая гара».

В) Азаронак, які заінтрыгаваў Казуліна пэрспэктывай стаць зоркай яго новага сэрыялу «Казулін — прафэсар Зло». А то Лябедзька і Шушкевіч ужо прымільгаліся.

2. Што рабіў Казулін у Палацы чыгуначнікаў?

А) Правяраў, ці не згубіў былы гарт марскога пехацінца: зьбіваў жанчын, расьпіхваў мінакоў, ужываў сілу у дачыненьні да супрацоўніка міліцыі.

Б) Спрабаваў зарэгістравацца на сход, пасьля чаго быў моцна зьбіты невядомымі асобамі пад кіраўніцтвам Паўлічэнкі.

В) Зарэгістраваўшыся, прайшоў на сход, натаваў выступ прэзыдэнта, гучней за ўсіх пляскаў у далоні. Актыўнасць была адзначаная Самім. Таму атрымаў ня толькі тэлевізар і бляшанкі з ікрой — падарунак для кожнага ўдзельніка сходу, — а яшчэ і запасны пульт.

3. Як бы вы паступілі на месцы агента спэцслужбаў, які заўважыў, што некаторыя асобы ў аўтамабілі спрабуюць зьнікнуць зь месца расправы над казулінцамі?

А) Пачаў бы проста страляць. З нашымі судамі ўсё роўна крайні будзе вадзіла.

Б) Ацаніўшы, што пальба не пагражае бясьпецы, узьняў бы ўверх пісталет, зрабіў бы кантрольны папераджальны стрэл.

В) Зразумеўшы, што пасьля такога праколу — уцёкі журналістаў — прэміі не відаць, ад жаху застрэліўся б.

4. Дырэктар МУС Навумаў заявіў, што журналіст «Камсамолкі» атрымаў чэрапна-мазгавую траўму ад яго арлоў у выніку таго, што палез «у самае пекла». Пад пеклам маецца на ўвазе…

А) Спроба рабіць здымкі, узьлезшы на плот.

Б) Масавы хапун прыхільнікаў Казуліна.

В) Спроба зрабіць матэрыял вачыма чалавека з чэрапна-мазгавой траўмай. Для гэтага журналіст папрасіў, каб міліцыянт трэснуў яму ў табло. Той так і зрабіў.

5. Гонар якой асобы і якім чынам пакрыўдзіў Казулін у міліцэйскім пастарунку?

А) Гонар прэзыдэнта, разламаўшы яго партрэт.

Б) Гонар прарока Мухамада, намаляваўшы на яго карыкатуру на сьцяне «абязьяньніку».

В) Гонар Мілінкевіча, разарваўшы ўлётку адзінага з крыкам: "Дзе гранты, Аляксандар, аддай народу гранты».

6. Што зрабіў Казулін пасьля выхаду з турмы і для чаго?

А) Патэлефанаваў прэзыдэнту з радыкальным ультыматумам — напісаць яму 32% галасоў, а Мілінкевічу — 5—6.

Б) Наведаў акцыю Мілінкевіча ў цэнтры гораду.

В) Патэлефанаваў Лукашэнку і, калі той сказаў «алё», кінуў слухаўку, атрымаўшы сапраўднае маральнае задавальненне.

Падлічыце зь дзецьмі вынікі з разьліку А—1, Б—2, В—3 і праверце іх на веданьне падзей 2 сакавіка. Калі нехта не набраў 7 балаў, то сытуацыя вельмі дрэнная: вучань — патэнцыйны апазыцыянэр. Рэкамэндуем тэрмінова выключыць яго са школы.

Міністар адукацыі

Лёлік Ушкін.

# Давай аб’ём!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Аграгарадок Навасёлы на Піншчыне. І яго старажылы.**

Пагоня за лічбамі даводзіць «Праграму адраджэньня вёскі» да абсурду. З Докшыцкага раёну піша чытач «НН».

Каб паказаць людзям свой клопат пра іх, улада гатовая выдаткоўваць любыя грошы. Вось вам і «бясплатныя» канцэрты «За Беларусь!», і так званае «адраджэньне вёскі». Чаму я называю і гэтую кампанію прапагандысцкай?

Каб адрадзіць сельскую гаспадарку, трэба хоць бы паступова пераходзіць на прыватную ўласнасьць на зямлю — прыватнік заўсёды гаспадарыць лепш. Але нават ва ўмовах захаваньня калгасна-саўгаснае сыстэмы не такой складанай сытуацыя была б, калі б прадпрыемствам далі большую свабоду гаспадараньня. Каб не прымушалі, як мне расказвалі на сьвінафэрме ў Сітцах, прадаваць сьвіней за бясцэнак толькі дзяржаўным прадпрыемствам, а не прыватнікам, якія плацяць куды больш. Каб ня ўказвалі, што, калі і дзе сеяць. Каб не загадвалі падчас замаразкаў выганяць на кругласутачную пасьбу каровы, у выніку чаго часам, як летась у Мёрах і Шаркаўшчыне, гіне жывёла. Каб не прымушалі замест неадкладных патрэбаў тэрмінова выдаткоўваць грошы на фарбу, каб памаляваць дзьверы на фэрмах, як гэта зрабілі пры канцы леташняга году ў Гнязьдзілаве. І такіх прыкладаў шмат.

Найбольш згубным для сельскай гаспадаркі стала будаўніцтва так званых «аграгарадкоў». Ніхто не аспрэчвае: жыльлё на вёсцы патрэбна. Аднак не ў такіх маштабах. У вёсках і так шмат пустых хат, а насельніцтва з кожным годам скарачаецца.

Тым ня менш, летась у Докшыцкім раёне збудавалі 77 «лукашэнкаўскіх домікаў». На гэта выдаткавана 3,1 млрд руб. (1,5 млн даляраў) у выглядзе крэдытаў. Гэтыя грошы можна было б выкарыстаць на закупку новай тэхнікі ці на якія-небудзь іншыя патрэбы. Аднак уладам ня трэба якасьць жыцьця і працы на вёсцы — ім патрэбна толькі колькасьць домікаў ды аграгарадкоў. Пры гэтым ніхто не зьвяртае ўвагі на якасьць будаўніцтва. Калі будаўнікі ня хочуць сумленна працаваць, а іх яшчэ і падганяюць, то і якасьць будаўніцтва адпаведная.

Даводзілася чуць ад работнікаў, што ў падмурак домікаў можна лёгка забіць цьвік, а ганкі пачынаюць абвальвацца амаль адразу пасьля здачы домікаў. Да таго ж, гэтыя домікі няможна назваць паўнавартасным жыльлём для вяскоўцаў. Бо ў вёсцы побач з дамамі павінны быць гаспадарчыя пабудовы. Аднак апошнія сваімі памерамі часта хутчэй нагадваюць прыбіральні...

Дамы шмат дзе стаяць пустыя, у некаторыя засяляюць п’яніц, якія ня могуць ні сумленна працаваць, ні нават трымаць парадак на сваёй сядзібе. Тое, што шмат дзе ў новым жыльлі няма патрэбы, бачна нават голым вокам. Вось, у Глінным стаіць пустая двухпавярхоўка — у ёй няма каму жыць. Аднак побач збудавалі больш за дзясятак домікаў. Гліннае зьбіраюцца пераўтварыць у аграгарадок у 2007 г. Тое, што палова дамоў у гэтым аграгарадку будуць пуставаць, нікога не цікавіць. У Тумілавічах побач з новымі дамамі стаіць вялікі недароблены будынак. Вялікі цагляны жылы дом з забітымі вокнамі стаіць у Бярозаўцы. А побач, зноў жа, будуюць дамы. У Крулеўшчыне стаяць недабудаванымі трохпавярхоўка і сельскі клюб — у былой в.Янушэва. Аднак і тут збудавалі дзясятак дамоў і плянуюць да 2007 г. збудаваць яшчэ столькі ж.

Вядома ж, паляпшаць жыцьцё вяскоўцаў трэба. Аднак гэтага не дасягнуць пагоняй за колькасьцю дамоў. Бо пустыя дамы нічога не паляпшаюць. Ды і жыхарам Таргуноў, напэўна, ня стала лепш жыць ад бэтонных агароджаў і ад бруку, што паклалі на ходніку. Зараз Таргуны зьбіраюцца газыфікаваць. Які сэнс весьці газапровад за пяць кілямэтраў, калі з-за высокіх коштаў на падлучэньне атрымаюць «блакітнае паліва» толькі лічаныя жыхары?

Па сутнасьці, «Праграму адраджэньня вёскі» хутчэй трэба называць «Праграмай будаўніцтва «пацёмкінскіх» вёсак» — нікому не патрэбных і стратных для дзяржавы. Ці патрэбна нам марна траціць грошы дзеля славутай «паказухі»? Задумайцеся над гэтым, калі будзеце вырашаць, за каго галасаваць на выбарах...

**Янка Зуброўскі, Лапута**

# Жыцьцё й лёс Карласа Шэрмана

У пятніцу 3 сакавіка на Паўночных могілках Менску ў бэтоннай сьцяне калюмбарыю зьявілася яшчэ адна сьціплая шыльда белага колеру. На ёй надпіс: Карлас Рыгоравіч Шэрман, 25.10.1934 — 4.03.2005.

Ягоныя парэшткі прывезла з Нарвэгіі ўдава пісьменьніка Тамара Шэрман. Год спатрэбіўся на тое, каб уладкаваць розныя справы й фармальнасьці, перш чым удалося даставіць скрыню з парэшткамі ў Беларусь, дзе ён хацеў быць пахаваны. Разьвітацца зь ім на могілкі прыйшлі некалькі дзясяткаў чалавек — дзеці, унукі, сябры літаратара.

Народжаны ва Ўругваі ў сям’і эмігрантаў, ён доўгі час жыў у Аргентыне, дзе змагаўся з дыктатурай. Потым эміграваў у БССР, быў сябрам Саюзу пісьменьнікаў, перакладаў з гішпанскай мовы на беларускую славутых паэтаў — Нікаляса Гільена, Пабла Нэруду, многіх іншых. Заўважнай літаратурнай падзеяй 1970-х стаў выхад у часопісе «Неман» раману Габрыеля Гарсія Маркеса «Восень патрыярха», які Шэрман пераклаў разам з Валянцінам Тарасам.

Жыцьцё і дзейнасьць Карласа Шэрмана ў незалежнай Беларусі непарыўна зьвязана зь імем Васіля Быкава, які быў старшынём Беларускага ПЭН-цэнтру. Шэрман быў намесьнікам Быкава ня толькі паводле фармальнай пасады — сама гэтая праваабарончая пісьменьніцкая арганізацыя ўзьнікла ды існавала ў многім дзякуючы намаганьням выканаўчага дырэктара беларускага ПЭНу.

Карлас Шэрман памёр у нарвэскім хосьпісе, дзе працаваў апошнія гады жыцьця. Да самага апошняга моманту ён трымаў сувязь па тэлефоне са сваімі сябрамі і знаёмымі ў Менску, цікавіўся грамадзкім і літаратурным жыцьцём.

Пахаваны за тысячы кілямэтраў ад месца свайго нараджэньня, ён застаўся сынам Беларусі, якой прысьвяціў лёс і жыцьцё.

**Віталь Тарас**


УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

# Слова пра бацьку, Міколу Латушкіна

Мой бацька, Мікола Латушкін (да 1945 г. — Уладзімер Гарэлік. — **«НН»**), нарадзіўся 15 студзеня 1922 г. у маленькай вёсцы на Магілёўшчыне (вёска Сіпайлы ў Бялыніцкім раёне. — **«НН»**). Меў трох братоў і сястру. Скончыў школу-сямігодку ў Навашолках, дзесяцігадовую — у Галоўчыне. У кастрычніку 1940 г. бацьку мабілізавалі ў Чырвоную Армію. Служыў спачатку ў Вэнтсьпілсе (Латвія), дзе скончыў кавалерыйскую школу ў званьні лейтэнанта. У ліпені 1941 г., праз месяц пасьля нападу Нямеччыны на СССР, мой бацька быў цяжка паранены і трапіў у палон, дзе прабыў роўна год. Яго ўдалося вызваліць з дапамогай актывістаў Саюзу беларускай моладзі. Бацька стаў актывістам СБМ (быў ад’ютантам Міхася Ганька. — **«НН»**).



Пры канцы вайны Мікола Латушкін апынуўся ў нямецкім Карлсьфільдсе. Бацька не хацеў вяртацца ў СССР, бо ведаў, што там яго ў лепшым выпадку чакае турма і сасланьне. Такі лёс напаткаў яго старэйшага брата Хведара. У вайну ён таксама трапіў у палон, а калі вайна скончылася, вярнуўся дадому і тут жа быў сасланы ў Сібір, дзе неўзабаве й памёр.

У 1945—1949 гг. бацька вучыўся ў вэтэрынарных школах у Карлсьфільдсе і Рэгенсбургу, а потым працаваў па спэцыяльнасьці. У Рэгенсбургу ён стаў актыўным сябрам Беларускага камітэту, браў удзел ва ўсіх мерапрыемствах.

9 жніўня 1950 г. бацька параплавам прыплыў у ЗША. Жыў спачатку ў Філядэльфіі, у 1954 г. пераехаў у Кліўлэнд (штат Агаё), дзе вывучыўся на мэханіка. Тамсама браў актыўны ўдзел у працы Беларуска-амэрыканскага культурнага цэнтру, стаў чальцом рады гэтага аб’яднаньня.

У траўні 1957 г. бацька пераехаў у Чыкага (штат Ілінойс), дзе бацька пачаў працаваць у будаўнічым бізнэсе. Тутсама ён сустрэў прыгажуню Сафію Багдановіч. Яны моцна пакахалі адно аднаго і ажаніліся 26 кастрычніка 1957 г. У верасьні 1958 г. нарадзіўся мой брат Ўолтэр. Я нарадзілася 24 лістапада 1964 г., а 1 траўня 1959 г. бацька атрымаў амэрыканскае грамадзянства.

У лістападзе 1958 г. у Чыкага адкрылася Беларуская праваслаўная царква Сьв. Юр’я (падпарадкаваньня Сусьветнаму патрыярхату. — **«НН»**). Бацька і маці разам зь дзедам Янкам Багдановічам былі яе фундатарамі-заснавальнікамі.

Шмат гадоў бацьку выбіралі нязьменным сакратаром Царкоўнай рады, ён быў адным з актыўных сьпевакоў у царкоўным хоры. Як спэцыяліст-мэханік і будаўнік ён шмат рабіў у справе рамонту царквы, яе перабудовы і афармленьня. Актыўна займаўся грамадзкай дзейнасьцю, быў сакратаром Беларуска-амэрыканскага нацыянальнага камітэту ў Чыкага, прадстаўляў у нашым горадзе Беларускі кангрэсовы камітэт Амэрыкі.

На пэнсію бацька пайшоў у 1987 г., але працягваў браць актыўны ўдзел ва ўсіх беларускіх акцыях у Чыкага. Калі Беларусь стала незалежнай дзяржавай, тата паехаў на радзіму. Адбылося доўгачаканае спатканьне праз 54 гады пасьля таго, як пакінуў Бацькаўшчыну.

13 чэрвеня 1998 г. трагічна загінула мая маці — яе забіў п’яны афіцэр паліцыі, і бацька застаўся ўдаўцом... Усім нам гэта было страшэннай трагедыяй. Горка плакалі і дзьве ягоныя ўнучкі — Зоя і Катарына.

Мікола Латушкін пасьля цяжкой хваробы пайшоў з гэтага жыцьця 31 сьнежня 2005 г., не дажыўшы два тыдні да свайго 84-годзьдзя.

Мой бацька вельмі любіў Амэрыку, краіну, якая дала яму і многім яго суайчыньнікам магчымасьць жыць і працаваць свабодна і плённа. Але да апошняй сваёй хвіліны ён быў сапраўдным патрыётам Беларусі, яе гісторыі, яе культуры. Усё сваё жыцьцё ён думаў пра Бацькаўшчыну, пра беларускі народ і рабіў усё магчымае, каб наблізіць час яго свабоды і незалежнасьці.

Вечная яму памяць!

**Ліза Латушкіна-Боскавіц, дачка**

***Пераклад з ангельскай Ванкарэма Нікіфаровіча***

# Канец тыраніі

Фултанаўская прамова Чэрчыля застаецца актуальнаю ў сучаснай Беларусі. Піша **Віталь Тарас.**

Існуе адрэзак вымярэньня часу, па заканчэньні якога сучаснасьць ператвараецца ў гісторыю. Вальтэр Скот лічыў, што гэта адрэзак у 60 гадоў. Калі пагадзіцца з шатляндзкім раманістам, прамова Ўінстана Чэрчыля ў амэрыканскім мястэчку Фултан 5 сакавіка 1946 году ўжо належыць гісторыі. Таксама, як і адказ Сталіна на гэтую прамову ў газэце «Правда» праз тыдзень. Ён параўнаў Чэрчыля з Гітлерам і абвінаваціў былога брытанскага прэм'ера ў распальваньні вайны Захаду з СССР. Гэтыя дзьве падзеі лічацца пачаткам халоднай вайны, якая скончылася пры канцы 1980-х гадоў мінулага стагодзьдзя распадам Савецкага Саюзу.

Але ж варта перачытаць зусім кароткую прамову Чэрчыля ва Ўэстмінстэрскім каледжы ў Фултане, каб пераканацца, наколькі актуальным застаецца яе зьмест для нашых дзён. Асабліва калі пакласьці побач, да прыкладу, тэкст выступаў кіраўніка Беларусі на трэцім усебеларускім сходзе.

## Чалавек, які стварыў Захад

Нагадаем, што Чэрчыль у 1946-м годзе ня быў прэм'ер-міністрам Вялікай Брытаніі, а толькі лідэрам апазыцыі. У Фултане ён выступаў у якасьці прыватнай асобы. Аднак маральны аўтарытэт экс-прэм'ера ў сьвеце быў настолькі высокі, што ягоныя словы мелі кардынальнае значэньне для лёсу чалавецтва ў дваццатым стагодзьдзі. Паводле амэрыканскага прэзыдэнта Роналда Рэйгана, дзякуючы Чэрчылю ня толькі нарадзіўся сам панятак «захад», але ўдалося захаваць мір на зямлі.

Чэрчыль у сваёй прамове канстатаваў зьяўленьне «жалезнай заслоны» ад Шчэціна на Балтыцы да Трыесту на Адрыятычным моры й прадказаў дзьве галоўныя небясьпекі, зь якімі, на ягоную думку, сутыкнецца міжнародная супольнасьць — гэта войны й тыранія. Ён ня толькі канстатаваў гэты факт, але сфармуляваў стратэгічную канцэпцыю, на падставе якой Захад аб'яднаўся ў барацьбе за выжываньне сучаснай цывілізацыі.

Вось што Чэрчыль казаў аб тыраніі: «Мы ня можам заплюшчваць вочы на тое, што свабоды, якімі карыстаюцца грамадзяне ва ўсёй Брытанскай імпэрыі, ня дзейнічаюць у значнай колькасьці краінаў, некаторыя зь якіх вельмі магутныя. У гэтых дзяржавах улада навязваецца простым людзям усюдыіснымі паліцэйскімі ўрадамі. Улада дзяржавы ажыцьцяўляецца без абмежаваньня дыктатарамі альбо шчыльна згуртаванымі алігархіямі, якія ўладараць з дапамогай прывілеяванай партыі ды палітычнай паліцыі. У цяперашні час, калі цяжкасьцяў усё яшчэ так шмат, у нашыя абавязкі ня можа ўваходзіць гвалтоўнае ўмяшаньне ва ўнутраныя справы краінаў, зь якімі мы не перабываем у стане вайны. Мы павінны нястомна і бясстрашна дэкляраваць вялікія прынцыпы свабоды й правоў чалавека, якія ўяўляюць сабой супольную спадчыну ангельскамоўнага сьвету і якія праз Вялікую хартыю, Біль аб правох, закон пра склад злачынства (Habeas Corpus Act — заканадаўчы акт, прыняты парлямэнтам Ангельшчыны ў 1679 годзе, які вызначае правілы арышту і прыцягненьня да суду абвінавачанага. — **Рэд.**), суд прысяжных і ангельскае агульнае права набылі сваё самае славутае выражэньне ў амэрыканскай Дэклярацыі Незалежнасьці.

Яны азначаюць, што народ кожнай краіны мае права і павінен мецъ магчымасьць шляхам канстытуцыйных дзеяньняў, шляхам свабодных несфальшаваных выбараў з таемным галасаваньнем выбраць ці зьмяніць характар альбо форму праўленьня, пры якіх ён жыве; што ўладарыць павінны свабода слова й друку, што суды, бесстаронныя і незалежныя ад выканаўчай улады, павінны праводзіць у жыцьцё законы, ухваленыя значнай большасьцю насельніцтва альбо асьвячоныя часам і звычаямі. Гэта падставовыя правы на свабоду, якія павінны ведаць у кожным доме».

Калі прыбраць згадку аб Брытанскай імпэрыі, якая спыніла сваё існаваньне ўсяго праз дзесяць год пасьля гэтага выступу, магло б стварыцца ўражаньне, што гэтыя словы Чэрчыль прамаўляў сёньня.

## Фюрэр і іншыя

Чэрчыль, зразумела, ня быў анёлам ці нават рыцарам бяз страху і заганы. На ягоным сумленьні засталася, сярод іншага, гвалтоўная выдача пасьля вайны савецкаму ўраду тысячаў расейскіх казакаў, якія эмігравалі ў Ангельшчыну. Іхнае вяртаньне разам зь сем'ямі, якое азначала для іх немінучую сьмерць, было саступкай Сталіну, і не адзінай з боку брытанскага прэм'ера. Тым ня менш, Чэрчыль, як бадай ніхто зь ягоных калегаў-сучасьнікаў, умеў засвойваць урокі мінулага. У Фултанскай прамове ён нагадаў аб тым, што ў 1930-я гады ніхто з палітыкаў не схацеў слухаць ягоных перасьцярогаў наконт Гітлера. Паводле перакананьня Чэрчыля, самую зьнішчальную ў гісторыі чалавецтва вайну можна было лёгка спыніць агульнымі намаганьнямі ў 1935-м ці нават 1936-м годзе, калі б небясьпека была распазнаная і адэкватна ўспрынятая.

Дарэчы, паводле зьбегу гістарычных датаў, акурат за дзесяць гадоў да прамовы Чэрчыля, 7 сакавіка 1936-га году, нямецкія войскі ўвайшлі ў дэмілітарызаваную зону на Райне. Паводле Вэрсальскіх пагадненьняў, падпісаных па выніках Першай сусьветнай вайны, Нямеччына ня толькі павінна была сплачваць краінам-пераможцам гіганцкую кантрыбуцыю, ня толькі ня мела права нарошчваць узбраеньні і колькасны склад войскаў, але ні ў якім выпадку не павінна была парушаць дэмілітарызаваную зону. У той час нямецкі вэрмахт быў яшчэ вельмі слабы. Варта было дзяржавам Антанты — найперш Францыі — ужыць

ваенную сілу, і авантура Гітлера на Райне скончылася б паразай. Нават гітлераўскія генэралы лічылі, што фюрэр робіць вялікую памылку, ідучы на падобную рызыку. Але авантура з бляскам удалася. Ніводная зь пераможных дзяржаваў не адрэагавала належным чынам на грубую, нахабную правакацыю, і Гітлер стаў трыюмфатарам. Шлях да Другой сусьветнай вайны быў распачаты.

З тагачасных падзеяў Чэрчыль зрабіў выснову, што Гітлер, таксама як і Сталін ды іншыя дыктатары, разумее і паважае толькі адно — сілу. Іншымі словамі сфармуляваў гэта Эрнэст Гэмінгўэй у рамане «Па кім звоніць звон?» на тэму грамадзянскай вайны ў Гішпаніі ў 1930-я гады. Ён параўноўваў фашыстаў (і фашызм у цэлым) з бандытамі, зь якімі няма сэнсу размаўляць пра высокія матэрыі, заклікаць да сумленьня, намаўляць і г.д. Трэба браць у рукі дубіну, аўтамат — што заўгодна і біць нягоднікаў сьмяротным боем.

Зразумела, прамова Чэрчыля была зьвернутая не да Сталіна і ягоных стаўленьнікаў у краінах так званай «народнай дэмакратыі» і нават ня столькі да прыгнечаных савецкай акупацыяй народаў, колькі да краінаў Захаду. Ён заклікаў кіраўнікоў гэтых краінаў да маральнай адказнасьці перад лёсам тых, хто апынуўся пад гнётам тыранаў. Варта зьвярнуць увагу, што Чэрчыль нідзе ня кажа аб камуністычным прыгнёце, ці аб хрысьціянскіх каштоўнасьцях, ці нейкіх перавагах капіталізму над сацыялізмам. Ягоная прамова пазбаўленая ідэалягічнага налёту ці англасаксонскай пыхі. Чэрчыль выказвае захапленьне мужнасьцю расейцаў, праяўленай у вайне з фашызмам. Ён кажа аб прынцыпах свабоды й права, на якіх заснаваная сучасная эўрапейская цывілізацыя, якую цаной невераготных ахвяраў Захаду ўдалося адстаяць, воляю абставінаў, з дапамогай народаў СССР.

## Заслона над глупствам

Немагчыма не зьдзіўляцца прароцтву Чэрчыля, які казаў сваю прамову ў той час, калі пасьляваенная Эўропа яшчэ ляжала ў руінах, калі ў Ангельшчыне яшчэ адчуваўся дэфіцыт прадуктаў, а ў большасьці астатніх краінаў панаваў сапраўдны голад. «Калі прадухіліць небясьпеку вайны й тыраніі, — казаў аратар, — дык, несумненна, навука й супрацоўніцтва ў бліжэйшыя некалькі гадоў, максымум дзесяцігодзьдзяў, прынясуць сьвету, перавучанаму ў жорсткай школе вайны, рост матэрыяльнага дабрабыту, нечуваны ў гісторыі чалавецтва». На думку Чэрчыля, выказаную ім крыху далей, «няма ніякіх прычынаў, акрамя чалавечага глупства й нялюдзкіх злачынстваў, якія не далі б усім краінам без выняткy пакарыстацца надыходам веку дастатку».

Праз 60 гадоў гэтыя словы ня страцілі сваёй актуальнасьці. Глупства й злачынства нагадваюць аб сабе на кожным кроку ў нашым сёньняшнім жыцьці.

Даклад, які прагучаў на трэцім усебеларускім сходзе, некаторыя параўноўваюць з дакладам генэральнага сакратара ЦК КПСС. Пэўнае падабенства заўважыць было няцяжка. Толькі вось пра які зьезд трэба весьці гаворку? Пра дваццаць сёмы, на якім Гарбачоў гаварыў пра паскарэньне навукова-тэхнічнага прагрэсу ды барацьбу за цьвярозы лад жыцьця? (Дарэчы, пачатак цяперашняга зьезду ў Менску супаў зь яшчэ адным юбілеем — 75-годзьдзем Міхаіла Гарбачова, пры якім была зруйнаваная Бэрлінская сьцяна, сымбаль халоднай вайны). Пра дваццаць шосты зьезд, дзе была прынятая Харчовая праграма, чаму спадарожнічала аднаўленьне карткавай сыстэмы разьмеркаваньня харчу ў многіх рэгіёнах Савецкага Саюзу? А можа, дзевятнаццаты — апошні сталінскі зьезд, калі ў зале панавала змрочная ціша, якую толькі зрэдзь перапынялі загадзя сплянаваныя аплядысмэнты?

Так, на ўсебеларускім зьезьдзе не было тых славаслоўяў на адрас першай асобы, якіх заўсёды хапала ў выступах дэлегатаў на ўсіх зьездах кампартыі альбо сходах Вярхоўнага савету ды ўсялякіх іншых сходах і зьездах — прафсаюзаў, пісьменьнікаў, жывёлаводаў, работнікаў санаторна-курортных установаў, настаўнікаў, камсамольцаў і г.д. Але ж атмасфэра ў зале Палацу Рэспублікі, дзе выхаду на трыбуну кіраўніка дзяржавы дзьве з паловай тысячы чалавек чакалі ў мёртвай цішыні, паклаўшы рукі на калені, нагадвала нешта даўно забытае. Тое, што міжволі ўсплывала з падсьвядомых глыбіняў генэтычнай памяці. Памяці аб мільёнах расстраляных і закатаваных, высланых і выключаных — з партыі, з камсамолу, з Саюзу пісьменьнікаў, з жыльлёвага каапэратыву, выкрэсьленых з жыцьця з кляймом «ворагаў народу» ці «антыграмадзкіх элемэнтаў». І каго могуць падмануць словы першай асобы аб тым, што яму непрыемна было чуць, калі пахвалы на ягоны адрас у выступах дэлегатаў гучалі болей за адзін раз? Ні ў водным з выступаў крытыка ці хоць бы намёк на крытыку першай асобы не прагучалі аніводнага разу. Адзіны чалавек, які мерыўся выступіць з крытыкай, быў спынены на далёкіх подступах да Палацу Рэспублікі — яго жорстка зьбілі. І тое, што гэты чалавек застаецца кандыдатам на прэзыдэнта, як і адзіны кандыдат ад апазыцыі, толькі ўзмацняе падабенства апошніх падзеяў з фарсам.



**Ўінстан Чэрчыль: «Народ кожнай краіны мае права і павінен мець магчымасьць шляхам канстытуцыйных дзеяньняў, шляхам свабодных несфальшаваных выбараў з таемным галасаваньнем выбраць ці зьмяніць характар альбо форму праўленьня, пры якіх ён жыве; уладарыць павінны свабода слова й друку, суды, бесстаронныя і незалежныя ад выканаўчай улады, павінны праводзіць у жыцьцё законы, ухваленыя большасьцю насельніцтва альбо асьвячоныя часам і звычаямі. Гэта падставовыя правы на свабоду, якія павінны ведаць у кожным доме».**

## Аўгіевы стайні

Калі кажуць, што гісторыю аднойчы перажываюць як трагедыю, а другім разам — у выглядзе фарсу, забываюць, што фарс таксама можа быць трагічны. І тое, што людзей на пачатку XXI стагодзьдзя ў эўрапейскай краіне не расстрэльваюць без суду й сьледзтва ў Курапатах, не арыштоўваюць сотнямі й тысячамі, не высылаюць у Сібір, —

**Працяг на старонцы 30.**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Канец тыраніі

**Працяг са старонкі 29.**

вельмі слабое суцяшэньне для нашых сучасьнікаў. Для тых, чый лёс сёньня растаптаны ўладай, каго зьневажаюць і цкуюць з высокіх трыбунаў, на тэле-экранах і старонках урадавых газэтаў, каго пазбаўляюць працы й надзеі на будучыню, чыю свабоду абмяжоўваюць у пераносным і самым простым, фізычным сэнсе. І ўсё гэта толькі за тое, што ніхто з гэтых людзей ня хоча сказаць ўхвальнага слова на адрас вышэйшага кіраўніка. «Ну, хоць бы аднаго разу, аднойчы сказалі б», — настойліва падказваюць упартым апанэнтам улады. Але ж цнатлівасьць таксама губляюць аднойчы.

Публічна абяцаць апазыцыянэрам аддаць іхных дзяцей у салдаты — да такога не дадумаўся б, напэўна, нават расейскі самаўладца ў XIX стагодзьдзі.

Таксама немагчыма ўявіць, каб у дакладзе першага сакратара ЦК КПБ, напрыклад, Скарына быў «прыпісаны» да Піцера, каб дагадзіць расейскім таварышам.

Праўда, у Расеі даўно ўзьнікла традыцыя называць дзікунства й цемрашальства «асобым шляхам разьвіцьця цывілізацыі», рабства ды ліслівасьць — «высокай духоўнасьцю й саборнасьцю».

Брутальнае хамства й бессаромная мана апошнім часам становяцца стылем жыцьця ва ўсіх яе праявах і ў Беларусі. У рэптыльнай прэсе яны зрабіліся сынонімам сьмеласьці й сумленьня. Калі вышэйшая асоба называе дэмакратычныя краіны Захаду «дерьмократическими», дык якімі ж словамі й стылем застаецца карыстацца прапагандыстам на тэлебачаньні, на радыё, у газэтах? Лёзунгі кшталту «Разьбіць сабачыя галовы!» і «Сьмерць здраднікам Радзімы!», здаецца, ужо лунаюць у паветры. «Пачакайце, пасьля выбараў мы ім пакажам!» — супакойвае тых, хто прагне крыві, кіраўнік дзяржавы. Сёньня яшчэ не прысьпеў час. Сёньня, пакуль у краі-не застаюцца заходнія назіральнікі, трэба працягваць камэдыю пад назвай «выбары».

Потым над краінай апусьціцца заслона — хай не жалезная, як 60 гадоў таму, а сатканая з анучаў, набрынялых нашым уласным страхам і пахам застарэлых нечыстотаў.

Цывілізаваны Захад у адказ, хутчэй за ўсё, толькі мацней заціснe нос ды будзе старанна адводзіць вочы ад «апошняй дыктатуры ў Эўропе». І працягваць перамовы з хаўрусьнікам Лукашэнкі Пуціным — так бы мовіць, з прагматычных меркаваньняў. Гісторыя хутка забываецца — асабліва ў краінах, якія дасягнулі высокага ўзроўню жыцьця за апошнія дзесяцігодзьдзі.

Таму фултанаўскую прамову Чэрчыля варта помніць сёньня і на Захадзе, і ў Беларусі, грамадзянам якой рана ці позна давядзецца вычысьціць сваё аўгіевы стайні. Чым раней, тым лепей. Інакш давядзецца чакаць завяршэньня наступнага 60-гадовага цыклю.

# «Жить стало лучше, жить стало веселей…»



**Спэцназ сьвяткуе Масьленіцу.**

У мяне на стале — спэцнумар «Советской Белоруссии» за верасень 2001 г. Прэзыдэнт трымае на руках шчасьлівую дзяўчынку, ніжэй вялікімі літарамі слоган «От добра добра не ищут».

Сёньняшняя выбарная кампанія праводзіцца афіцыйнымі СМІ з выкарыстаньнем усяго арсэналу палітычных тэхналёгіяў і ўсіх магчымых сродкаў доступу да народнага вока, вуха, страўніка. Прачынаесься ад воклічаў радыёвядоўцаў, якія захлынаюцца ад радасьці, расказваючы пра рост ВУП, увечары зямля ходзіць хадуном ад воклічаў «За Батьку» патрыётаўтэлепузікаў з АНТ. Але і гэта ня ўсё. Забясьпечваюцца адпаведнай літаратурай і кадры будучых прапагандыстаў, якіх хутка можна будзе ўбачыць на прадпрыемствах і іншых дзяржустановах.

Невялікія стыльныя кніжачкі з чырвона-зялёным сьцягам на вокладцы пад грыфам Інстытуту сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры адміністрацыі прэзыдэнта. «Беларусь у пытаньнях і адказах», «Беларусь. Статыстычны даведнік», «Беларусь і краіны сьвету». Наклады па 30—40 тыс. асобнікаў, у кішэнным і большым варыянтах. Гарадзенцы дадаткова накладам 50 тыс. асобнікаў надрукавалі брашуру эканаміста Чаркаўца зь мілітарнай назвай «Беларускі прарыў». Чаго толькі мы ні даведваемся з гэтых брашурак — і аб заробках 250 даляраў, і аб выключнай сацыяльнай зарыентаванасьці нашай эканомікі, і аб паскудных антыканстытуцыйных спробах апазыцыі захапіць уладу.

Шмат інфармацыі дае кніжачка «Беларусь у пытаньнях і адказах». «Прэзыдэнт займае асаблівае месца ў дзяржаўным ладзе і сыстэме падзелу ўладаў: у арганізацыйным сэнсе ён самастойны (выбіраецца народам), *ня ўключаны ні ў адну з галінаў улады*» (с. 11). Такі «пэрл» магла спарадзіць толькі беларуская прававая навука. А ўнівэрсытэцкія мужы мяне так доўга пераконвалі, што прэзыдэнцкая ўлада — вышэйшая ступень выканаўчай улады.

Найбольш цікавы разьдзел «Ідэалёгія беларускай дзяржавы». «Нацыянальная ідэнтычнасьць складаецца з многіх фактараў: тэрыторыя, этнічны склад насельніцтва, паноўная рэлігія, палітычная культура, канстытуцыйны лад, супольная тэрыторыя пражываньня, супольная мова зносінаў усёй супольнасьці, супольная культура нацыі, супольнае вярхоўнае кіраўніцтва краіны, супольныя палітычныя інтарэсы, супольная палітычная сыстэма». Тут зьмяшаліся разам і коні, і людзі. Ёсьць крыху марксізму, крыху чарнасоценшчыны (паноўная рэлігія — для Беларусі — праваслаўе). Усе астатнія складнікі «беларускай» нацыянальнай ідэнтычнасьці аж занадта палітычныя — палітычная культура, супольнае вярхоўнае кіраўніцтва краіны, супольная палітычная сыстэма… Разам з «абшчыннай псыхалёгіяй» усё гэта набывае рысы не дзяржавы пачатку XXI ст., а фэадальнай імпэрыі XV ст. І зусім няма ніякага акцэнту на нацыянальнае, быццам мы не жывём у краіне, дзе 80% насельніцтва складаюць прадстаўнікі беларускай нацыі і якая называецца Рэспубліка Беларусь. Больш за тое, ёсьць паняцьці (этнічны склад насельніцтва, супольная мова зносінаў усёй супольнасьці), якія намякаюць на адваротнае. Адным словам, беларуская нацыя — гэта ўсе народы, што жывуць у рэспубліцы і гавораць паміж сабою па-расейску. Ага, а замест нацыянальнага фальклёру ў нас песьні Паліны Смолавай і замест кнігаў Скарыны — падручнікі Трашчанка.

Усё гэта было б вельмі сьмешна і выключна цікава з навуковага гледзішча, калі б не было так небясьпечна. Сыстэма выразна спрабуе стварыць нацыю «пад сябе», не прыстасаваць дзяржаву да патрэбаў нацыі, а наадварот. Гэта, па сутнасьці, працяг старой палітыкі стварэньня адзінага савецкага народу, толькі ў межах адной рэспублікі. У першую чаргу за кошт беларускай нацыянальнай культуры. Іначай яны ня ўмеюць.

**Андрэй Павач, Горадня**

28 студзеня 1996 г. памёр сапраўды вялікі паэт XX ст. Ёсіф Бродзкі. Асоба з жыцьцяпісам, тыповым для генія мінулага стагодзьдзя, народжанага ў таталітарнай дзяржаве. Нарадзіўся 24 траўня 1940 г. у Ленінградзе, у 15 год кінуў сярэднюю школу — «прагрэсіўную» савецкую сыстэму адукацыі. У 1963 г. паэт быў арыштаваны, а ў 1964 г. асуджаны на 5 год высылкі з абавязковым прыцягненьнем да фізычнай працы «за тунеядство». Ініцыятарам расправы над маладым паэтам было праўленьне Леніградзкага аддзяленьня Саюзу пісьменьнікаў.

Заступніцтва вядомых асобаў — Анны Ахматавай, Дзьмітрыя Шастаковіча, Самуіла Маршака, а таксама актыўнасьць замежных дзеячаў культуры і палітыкі, а таксама звыклых грамадзян спрычыніліся да датэрміновага вызваленьня Ёсіфа Бродзкага ў 1965 г. У 1972 г. «ідэолягі» з КГБ і партыйнага апарату змусілі яго пакінуць Радзіму.

На шчасьце, Ёосіф Бродзкі быў асобай ня толькі творчай і інтэлектуальнай, але і вельмі камунікабэльнай і актыўнай. Ён ня стаў у адзін шэраг з тымі дысыдэнтамі, што плакалі па Расеі, па страчаных магчымасьцях і злавалі на парадкі ў тых краінах, дзе ім даводзілася жыць. Ён папросту з асалодай жыў і тварыў. Сваёй паэзіяй ён прычыніўся да ўзмацненьня аўтарытэту сваёй Радзімы ў сьвеце. У 1984—1985 гг. у СССР памерлі яго бацькі, так і не атрымаўшы дазволу пабачыцца з сынам. А ў 1987 г. Ёсіф Бродзкі атрымаў Нобэлеўскую прэмію ў галіне літаратуры.

Сярод багатай паэтычнай спадчыны Ёсіфа Бродзкага знойдзецца некалькі дзясяткаў эсэ. У іх паэт выказваўся на актуальныя грамадзка-палітычныя альбо агульначалавечыя тэмы. Сярод гэтых эсэ найбольш важным для сёньняшняга беларускага грамадзтва ёсьць тэкст «Пра тыранію», напісаны ў 1979 г. Яго можна назваць сацыяльным, а яшчэ лепей анатамічным аналізам зьявы.

**Альбіна Семянчук**
**і Генадзь Семянчук**

# Пра тыранію

**ЁСІФ БРОДЗКІ**

Хвароба і сьмерць — вось, бадай, і ўсё, што ёсьць супольнага ў тырана зь яго падданымі. Ужо ў гэтым сэнсе народу карысна, каб кіраваў стары. Ня тое, каб думка аб непазьбежнасьці сьмерці абавязкова асьвятляла і зьмякчала нораў, але час, заняты тыранам на развагі аб сваім, скажам, абмене рэчываў, ёсьць часам, аднятым ад дзяржаўных справаў. І ўнутраныя, і міжнародныя пэрыяды зацішша прама прапарцыянальныя лічбе хваробаў, якія грызуць вашага Генэральнага Сакратара альбо Пажыцьцёвага Прэзыдэнта. Нават калі яму хапае здольнасьцяў навучыцца мастацтву дадатковай бяздушнасьці, якому вучаць усе хваробы, ён не сьпяшаецца выкарыстаць гэтае набытае мастацтва да палацавых інтрыгаў альбо замежнай палітыкі, хоць бы таму, што інстынктыўна імкнецца павярнуцца ў ранейшы здаровы стан, а то і верыць, што цалкам ачуняе.

У тырана час, адведзены на развагі пра душу, выкарыстоўваецца для разьлікаў, як захаваць статус-кво. Гэта выходзіць таму, што чалавек ў яго становішчы ня бачыць розьніцы паміж сучасным, гісторыяй і вечнасьцю — дзяржпрапаганда зьліла іх разам, бо так зручней і самому тырану, і насельніцтву. Ён трымаецца за ўладу, як іншыя людзі старога ўзросту за свае пэнсіі і ашчаджэньні. Тое, што часам падаецца чысткай наверсе, успрымаецца народам як спроба падтрымаць стабільнасьць, на якую народ жа і разьлічваў у першую чаргу, дазваляючы тыраніі ўмацавацца.

Устойлівасьць піраміды зрэдку залежыць ад яе вяршыні, але ж менавіта вяршыня прыцягвае нашую ўвагу. Раней ці пазьней погляд назіральніка стамляецца ад яе нязноснай геамэтрычнай дасканаласьці, погляд патрабуе зьменаў. Аднак, калі зьмены адбываюцца, яны амаль заўсёды да горшага. Стары, які змагаецца за тое, каб пазьбегнуць ганьбы і няёмкасьцяў, якія асабліва непрыемныя ў яго узросьце, прынамсі, цалкам прадказальны. Якім бы гнюсным і злым ні выглядаў ён у гэтай барацьбе, яна не адбіваецца ані на ўнутранай структуры піраміды, ані на цэну, што падае навонкі ад яе. Дый тыя, з кім ён змагаецца, супернікі, цалкам заслугоўваюць жорсткага стаўленьня, хаця б за таўталягічнасьць іхных амбіцыяў пры розьніцы ва ўзросьце. Бо палітыка ёсьць ні чым іншым, як найчысьцейшай геамэтрыяй, аб’яднанай з законам джунгляў.

> Сярэдняя працягласьць добрай тыраніі — 10—15 год, самае вялікае — 20.

Там, на кончыку голкі, хапае месца толькі для аднаго, дык няхай ён лепей будзе старым, бо старыя не прыкідваюцца анёламі. Адзіная задача старэючага тырана — утрымаць сваё становішча, ягоная дэмагогія і крывадушша не прыгнятаюць розумы падданых неабходнасьцю ў іх верыць альбо тэкстуальнай разнастайнасьцю; у той час як малады выскачка зь яго сапраўднай альбо паказной руплівасьцю і мэтанакірава



**Ёсіф Бродзкі, высланы «за тунеядства» ў Архангельскую вобласьць.**




«СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ»

насьцю заўсёды ўрэшце падвышае ўзровень грамадзкага цынізму. Азіраючыся на гісторыю чалавецтва, мы можам упэўнена сказаць, што цынізм — сапраўдная мера прагрэсу.

Бо новыя тыраны заўсёды прыносяць новую сумесь крывадушнасьці і жорсткасьці. Адныя больш націскаюць на жорсткасьць, іншыя — на крывадушнасьць. Узгадайма Леніна, Гітлера, Сталіна, Мао, Кастра, Кадафі, Хамэйні, Аміна. Яны заўсёды нашмат пераўзыходзяць сваіх папярэднікаў і па-новаму выкручваюць рукі сваім грамадзянам, як, зрэшты, і розум назіральнікам. Для антраполяга, які назірае збоку (і на вельмі значнай адлегласьці, вядома), такі тып разьвіцьця надзвычай цікавы, бо пашырае нашыя ўяўленьні аб магчымасьцях чалавецтва як віду. Неабходна адзначыць, аднак, што апісаны працэс залежыць ня ў меншай ступені ад тэхнічнага прагрэсу і агульнага росту насельніцтва, чым ад выключнай шкоднасьці дадзенага дыктатара.

У наш час усе новыя сацыяльна-палітычныя ўпарадкаваньні, як дэмакратычныя, так і аўтарытарныя, адводзяць усё далей ад духу індывідуалізму да статкавага націску масаў. Ідэя экзыстэнцыяльнай выключнасьці чалавека замяняецца ідэяй ананімнасьці. Асоба гіне ня столькі ад мяча, колькі ад пэніса, і, якой бы малой ні была вашая краіна, яна патрабуе (ці робіцца аб'ектам) цэнтральнага плянаваньня. Подобныя абставіны лёгка спараджаюць тую ці іншую аўтакратыю, у такім кантэксьце тыранаў можна разглядаць у якасьці кампутараў састарэлага ўзору.

Але калі б яны былі ўсяго толькі кампутарамі састарэлых узораў — гэта было б яшчэ цярпіма. Бяда ў тым, што тыраны здольныя набываць новыя, па апошнім слове тэхнікі кампутары і імкнуцца карыстацца імі. Прыклады эксплюатацыі састарэлай мадэльлю сучаснай тэхналёгіі: Шыкльгрубэр апанаваў мікрафон, а Сталін карыстаўся тэлефонным падслухоўваньнем дзеля зьнішчэньня сваіх апанэнтаў у Палітбюро.

Людзі робяцца тыранамі не таму, што адчуваюць да гэтага пакліканьне, але і не зусім выпадкова. ...Зброя тыраніі — палітычная партыя (альбо армія, чыя структура не адрозьніваецца ад партыйнай), бо для таго, каб ускараскацца на вяршыню чагосьці, трэба мець нешта, для чаго ўласьцівая вэртыкальная тапаграфія. ...Адзіныя свае радасьці яны атрымліваюць у працэсе карасканьня, калі бачаць, што ўдалося перамудрагеліць суперніка, адштурхнуць, звольніць.

> У тырана час, адведзены на развагі пра душу, выкарыстоўваецца для разьлікаў, як захаваць статус-кво.

(...)

Сярэдняя працягласьць добрай тыраніі — 10—15 год, самае вялікае — 20. За гэтымі межамі непазьбежнае сасьлізгваньне ў нешта вельмі пачварнае. Тады мы маем справу зь велічча, якая выяўляецца ў разьвязваньні вайнаў альбо тэрору ўнутры краіны альбо таго і другога разам. Прырода, дзякуй Богу, бярэ сваё, часам, праўда, карыстаючыся як сваёй зброяй супернікам тырана, і, як правіла, у пару, то бок перш чым наш герой задумае абесьсьмяроціць сваё імя чым-небудзь жудасным. Маладыя кадры, якія зусім не такія ўжо і маладыя, націскаюць зьнізу, выпіхваючы яго ў блакітныя прасьцягі чыстага Хронасу. Таму што зь вяршыні піраміды далей рухацца можна толькі ўжо ў гэтым напрамку. Праўда і тое, што нярэдка прыродзе здараецца дзей

**Працяг на старонцы 34.**

# Пра тыранію

**Працяг са старонкі 33.**

нічаць самой, сустракаючы страшэнны супраціў з боку органаў дзяржаўнай бясьпекі і каманды асабістых лекараў тырана. З-за мяжы ляцяць самалёты з

Чысткі наверсе ўспрымаюцца народам як спроба падтрымаць стабільнасьць, на якую народ жа і разьлічваў у першую чаргу, дазваляючы тыраніі ўмацавацца.

замежнымі спэцыялістамі, каб выцягваць нашага героя з глыбіняў маразму, у якія ён занураецца. Урады, якія іх пасылаюць, самі глыбока зацікаўленыя ў захаваньні статус-кво. Часам замежныя лекары дасягаюць такога посьпеху ў сваіх гуманітарных місіях, што да вялікага чалавека вяртаецца дастаткова сілаў, каб пагражаць гібельлю іхным краінам.

Урэшце, ва ўсіх апускаюцца рукі. У органаў, бадай, менш ахвотна, чым у лекараў, паколькі мэдычная герархія ня так залежыць ад будучых пераменаў. Але нават і органам урэшце надакучвае гаспадар, якога яны так ці інакш перажывуць, і ахоўнікі адварочваюцца, і ў дзьверы прасьлізваецца сьмерць з касой, сярпом і молатам. Наступнай раніцай насельніцтва будзяць не пунктуальныя пеўні, а хвалі «Пахавальнага маршу» Шапэна, што льюцца з рэпрадуктараў. Потым ідзе пахаваньне з ваеннымі ўшанаваньнямі, коні цягнуць ляфэт, наперадзе крочыць узвод жаўнераў, нясуць на пунсовых падушачках ордэны і мэдалі, якія ўпрыгожвалі пінжак тырана, як грудзі сабакі-прызэра. Бо гэта менавіта тое, чым ён і быў, — сабакам, які атрымліваў прызы, выйграваў сабачыя скачкі. І калі насельніцтва аплаквае ягоны скон, як часта здараецца, гэта сьлёзы тых, хто рабіў стаўку і прайграў: народ аплаквае згублены час. А потым зьяўляюцца чальцы Палітбюро, падпіраючы плячыма кумачом накрытую труну, адзіны агульны між імі назоўнік.

Покуль яны нясуць свой памерлы назоўнік, трашчаць і пстрыкаюць камэры, а замежнікі і мясцовыя напружана ўглядаюцца ў глухія твары, спрабуючы ўгадаць пераемніка. Мажліва, памерлы быў настолькі славалюбны, што пакінуў палітычны запавет, але яго ўсё роўна не апублікуюць. Рашэньне будзе прынята патаемна, на зачыненым (для насельніцтва) паседжаньні Палітбюро. То бок падпольна. Таемнасьць — даўняя завядзёнка партыі, рэха яе дэмаграфічнага паходжаньня, слаўнага нелегальнага мінулага. Так што твары нічога не выяўляюць.

Гэта ім асабліва ўдаецца, таму што выяўляць няма чаго. Таму што зноў будзе ўсё тое ж самае. Новы будзе адрозьнівацца ад старога толькі зьнешне. І духоўна, і ў іншых адносінах яму прыйдзецца стаць дакладнай копіяй памерлага. Гэта, мажліва, і ёсьць самы галоўны сакрэт. Калі задумацца, зьмены ўнутры партыі — гэта адзіная нам даступная форма ўваскрэсеньня. Вядома, паўтарэньне спараджае нуду, але калі яно адбываецца патаемна, то не пазбаўлена займальнасьці.

Самае ж займальнае — гэта калі разумееш, што з гэтых людзей кожны можа зрабіцца тыранам. Уся разгубленасьць і няяснасьць выцякае з таго, што прапанова перавышае попыт. З-за таго, што мы маем справу не з тыраніяй асобных прадстаўнікоў, а з тыраніяй партыі, якая папросту паставіла вытворчасьць тыранаў на індустрыйную аснову.

(…)

Вось гэтым і займаецца тыранія: арганізоўвае для вас вашае жыцьцё. Робіць яна гэта як мага стараньней, ужо, безумоўна, лепей, чым дэмакратыя. Да таго ж яна робіць гэта для вашай жа карысьці, бо кожная праява індывідуалізму ў натоўпе можа быць небясьпечная: перш за ўсё для таго, хто яго праяўляе, але і пра таго, хто стаіць побач, таксама трэба падумаць. Вось дзеля чаго існуе кіраваная партыяй дзяржава, зь яе службамі бясьпекі, псыхіятрычнымі лякарнямі, органамі ўнутраных справаў і адданасьцю грамадзян. І ўсё ж нават усіх гэтых установаў недастаткова: у ідэале кожны чалавек павінен стаць сам сабе бюракратам. Дзень, калі гэтая мара стане рэальнасьцю, усё бліжэйшы і заўважнейшы. Бо бюракратызацыя індывідуальнага існаваньня пачынаецца з роздумаў пра палітыку і не сканчаецца з набыцьцём кішэннага калькулятара.

Так што, калі хто настроены элегічна на пахаваньні тырана, то гэта адбываецца ў асноўным з прычынаў аўтабіяграфічных і таму, што гэты скон надае большую канкрэтнасьць настальгіі па «старых добрых часах». Урэшце, нябожчык таксама быў прадуктам старой школы, калі людзі яшчэ адчувалі розьніцу паміж тым, што яны гаварылі і што рабілі. Калі ў гісторыі яму будзе адведзена ня больш за адзін радок, тым лепей: значыць, сярод сваіх падданых ён не ўчыніў дастаткова кровапраліцьцяў, каб набралося на цэлы абзац. Каханкі ў яго былі таўсматыя і нешматлікія.

Вось гэтым і займаецца тыранія: арганізоўвае для вас вашае жыцьцё.

Пісаў ён мала, таксама й не маляваў, і ня граў на музычных інструмэнтах; таксама ня ўвёў новага стылю мэблі. Ён быў просты тыран, але ўсё ж такі лідэры найвялікшых дэмакратыяў жудасна імкнуліся паціснуць яму руку. Карацей кажучы, ён не перастараўся, і гэта часткова дзякуючы яму, адчыняючы акно раніцай, мы пераконваемся, што далягляд яшчэ ня стаў старчма.

Дзякуючы характару яго працы, ніхто ня ведаў, што ён думае на самай справе. Цалкам магчыма, што ён і сам ня ведаў, што ён на самай справе думае. Гэта магло б стаць добрай для яго эпітафіяй, каб не было жарту, які фіны распавядаюць пра тэстамэнт іхнага пажыцьцёвага прэзыдэнта Урха Кеканэна. Ён пачынаецца словамі: «У выпадку, калі я памру...»




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Нечужая Бацькаўшчына

*— А-а, гэта з тых, хто*
*Беларусь шукае.*
*— А нашто яе шукаць,*
*яна пад нагамі.*
***В.Адамчык. «Чужая Бацькаўшчына»***

## Здольны вучань

Сярод затрыманых за палітычную дзейнасьць у Барысаве — знаёмае прозьвішча: Мацьвей Бялей. Падчас дзяржпрактыкі я выкладаў у ягонай клясе мову і літаратуру. Чамусьці з больш чым двух дзясяткаў вучняў запомніўся менавіта Мацьвей. Неардынарны, творчы, няўрымсьлівы. Упэўнены, ён таксама не забыўся на практыканта, які празьмерна часта выклікаў яго да дошкі. Мацьвей крыўдзіўся, часам адмаўляўся адказваць, але я гнуў лінію далей. Калі ўбачыў ягонае імя ў «Нашай Ніве», не зьдзівіўся, а хутчэй прыняў як належнае. А ў думках заварушылася, што, мабыць, не дарма прымушаў васьміклясьнікаў штудыяваць Багушэвіча і Купалу. Як бачу цяпер, у нечых галовах усё адклалася.

## Апальны ксёндз

Былога пробашча барысаўскага касьцёлу Робэрта Кшывіцкага бачыў двойчы. Абодва разы ў нефармальнай абстаноўцы. Першы раз, калі сьвятар прыйшоў у рэдакцыю даваць абвестку пра тэлефон даверу, які ня першы год функцыянуе пры касьцёле. У кепцы, з кароткай фрызурай і MP3-плэерам у вушах. Цяжка было даць веры, што гэты разьняволены замежнік — ксёндз. Тады ён доўга гаварыў, што з прыходам Качыньскага да ўлады яго Бацькаўшчына канчаткова разьвітаецца з савецкай спадчынай, чаго жадаў і нам, беларусам.

Другі раз кс.Кшывіцкага ўбачыў, калі мясцовыя ўлады за зьмешчаныя ў касьцёле фатаздымкі людзей са сьвечкамі салідарнасьці вырашылі не падаўжаць грамадзяніну Польшчы візу. Ён прыйшоў разьвітацца. А.Робэрт не выглядаў прыгнечана, ён быў абураны цынізмам вэртыкальшчыкаў. Паціснуўшы ўсім рукі, пажадаў нам посьпехаў і Боскай ласкі ды шматкроць паўтарыў: «Усё, я зьяжджаю». Робэрт Кшывіцкі, удзельнік славутай «Салідарнасьці», напэўна, не зразумеў бы, што пасьля яго сыходу ня ўсе супрацоўнікі незалежнай газэты згадзіліся паставіць подпіс у ягоную падтрымку.

## Праз хабар — у войска

За часамі ППРБ служба ў войску стала элітнай зьявай. Для большасьці хлопцаў войска адкрывае прывабныя пэрспэктывы. Пасьля служ-

**Працяг на старонцы 36.**

**На фота : 8 сакавіка сустрэцца з А.Мілінкевічам да кінатэатру «Бярэсьце» (Менск) прыйшлі больш за 1000 чалавек.**

# Нечужая Бацькаўшчына

**Працяг са старонкі 35.**

бы можна застацца на кантракт альбо ўладкавацца ў міліцыю ці МНС. Таму і рвуцца паесьці салдацкай кашы і крывыя, і касыя. Знаёмец, які сёлета сканчвае Мар'інагорскі тэхнікум, казаў, што яму нядаўна ў ваенкамаце заявілі, што ў войска пойдуць толькі пэтэвэшнікі, а тыя, хто скончыў ВНУ і ССНУ, могуць разьлічваць толькі на рэзэрву. Для вялікай колькасьці маладзёнаў гэта асабістая трагедыя. Знаёмец гаворыць, што напраміл Бог будзе прасіцца служыць, бо інакш усе жыцьцёвыя пляны пачынаюць бурыцца. Колькі за апошнія гады давялося праслухаць падобных гісторый — ня зьлічыш. Калі раней хабар давалі, каб ня трапіць на службу, то цяпер ужо не за гарамі час, калі ўсё будзе наадварот.

### Трэба змагацца

Знаёмая вярнулася са стажыроўкі зь Любліна. «Ведаеш, — кажа, — напэўна, паеду ў Польшчу назаўсёды. Беларусь адтуль мне падаецца нават бліжэйшай, чым з Барысава ці Крупак. А што тут лавіць? Хам на троне, п'яныя рожы паўсюль, няма з кім пабеларуску павітацца. І гэта ты называеш сваёй краінай? Вядома, гэта Бацькаўшчына, толькі разумееш, як у Адамчыка, яна нейкая чужая». Клясная яна дзяўчына. Выхаваная ў беларускім духу. Толькі я катэгарычна не згаджаюся зь ёй, дый не адзін я. На барысаўскіх сьценах зьяўляецца ўсё болей палітычных графіці і налепак. Для нас Беларусь не чужая, а проста Бацькаўшчына. І за яе трэба змагацца.

### «За Беларусь»

Дамарослым ідэолягам няўцям, што назва «За Беларусь», пад якой гастралююць за бацьку беларускія попзоркі, не арыгінальная. Акурат з такой назвай дзейнічала падпольная арганізацыя ў Пастаўскай пэдвучэльні ў 1945—1946 гадах. Група маладзёнаў утварылася на знак пратэсту супраць русіфікацыі іх alma mater. На Дзень Волі 1946 году пад бел-чырвона-белым сьцягам і Пагоняй яны прымалі прысягу на вернасьць Беларусі. Потым пастаўцы злучыліся з арганізацыяй глыбоцкіх патрыётаў — стварыўся Саюз беларускіх патрыётаў (Глыбокае—Паставы). Але ў лютым 1947 г. МГБ разграміла СБП. Былыя «забеларусы» атрымалі ад 10 да 25 гадоў лягераў, апынуўшыся далёка ад Радзімы, на высылцы ў Сібіры і на Поўначы. Многія зь іх так і не вярнуліся ў Беларусь.

Чамусьці здаецца, што пра гэта дакладна ня ведаюць айчынныя зоркі, якія пяюць пра спэцбрыгаду «Алмаз», і аніводзін спажывец, што прыходзіць на падобныя канцэрты. Шкада.

Пасьля нашай з вамі перамогі, думаю, варта ўшанаваць памяць патрыётаў-«забеларусаў». Назваўшы вуліцы Паставаў, Глыбокага, Шаркаўшчыны імёнамі Міколы Асіненкі, Алеся Адамовіча, Янкі Рымдзёнка, Алесі Фурс, якія ў самых цяжкіх умовах зрабілі нашмат болей, чым увесь гэты скоп музыкаў.

За Беларусь!

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

# Сяргей Дубавец пра страх

Страх перад сыстэмай. Кантрактнай, пэнсійнай, рэпрэсіўнай... Вось тое, што нас сёньня яднае як нацыю і грамадзтва і служыць маторам нашага жыцьця. Я знайшоў верш Ларысы Геніюш, напісаны ў далёкія застойныя гады, і падзівіўся таму, наколькі ён актуальны цяпер:

Страх — за праўду кінуцца ў бой,
страх — не дагадзіць акупантам,
быць удома самім сабой,
чалавекам быць — страх пракляты!
Суд — за думкі вольны размах,
воля — толькі прадажнаму слову.
Беларусам быць — тройчы страх,
страх — валодаць роднаю моваў.
Страх — ў чужыне сваіх братоў,
перад зьдзекам страх не скарыцца.
Страх — маліцца на мове бацькоў,
дзікі страх — наагул маліцца!
Страх — што ўвечары Каляда,
і за сына, што пойдзе ў школу,
страх — што бліжняга не прадаў,
страх — што чэсны, што не жывёла.
Брыгадзіраў страх на сяле,
страх падлізаў зьмяіных ўсюды,
страх — хадзіць па сваёй зямлі,
гдзе начальнікі і Іуды.
Страх — гуманнасьці, дабраты,
перад рускім страх, перад ляхам, —
мы ж ня горшыя, што ж, браты,
можа, хопіць гэтага страху?

Калі грамадзтва доўгі час жыве ў страху перад сыстэмай, яно прызвычайваецца да гэтага і перастае заўважаць ці аналізаваць свой страх. Бо яно ня ведае альтэрнатывы.

**Паводле праграмы «Вострая Брама» радыё «Свабода»**

# Збор сродкаў на кніжку Сыса

Сродкі, прызначаныя для выданьня літаратурнай спадчыны Анатоля Сыса, можна накіроўваць на спэцыяльны рахунак аддзелу культуры Рэчыцкага райвыканкаму:

Р/р 3735000170040
у філіі №323 АСБ «Беларусбанк», код 682

УНП 400001176


ДЖЭФ БАНІФАЦЫНО

# Баніфацыно здымае Беларусь

Фатограф з Парыжу Джэф Баніфацыно прыехаў у Беларусь, каб зрабіць сэрыю рэпартажаў. Што такое Беларусь для заходніх фатографаў? Гэта Чарнобыль, паліцэйшчына і савецкая панурасьць. Часам сіроты, часам калгасная Афрыка. Нешта лукашоіднае або шакуючае, каб ілюстраваць стэрэатыпы або выбіць сьлёзы. Такая Беларусь трапляе на экраны сусьветных радараў.

Джэф вырашыў паказаць іншую Беларусь — сьветлых людзей, поўных жыцьцёвай сілы. Для сваіх рэпартажаў ён выбраў дзьве тэмы: па-першае, беларускія інтэлектуалы і артысты, а па-другое, стыль жыцьця беларусак.

Пісьменьнік Адам Глёбус з дачкой, рэжысэр Андрэй Кудзіненка ля бігборда «60 год Перамогі», выдаўцы часопісу «Студэнцкая думка», графік Міхал Анемпадыстаў, рок-гурт «N.R.M.» і маленькі сын Піта Паўлава, акторкі Купалаўскага, Рыгор Барадулін за працай — вось што складае аснову першага сюжэту.

Джэф не прызнае лічбавых камэраў. Джэф — брэтонец і носіць на куртцы сьцяжок свайго кельцкага народу. Джэфу 28 гадоў. У Рэдакцыю «НН» ён прыйшоў таксама, каб фатаграфаваць для рэпартажу. Гэта другі ягоны прыезд у Беларусь — першыя здымкі ён зрабіў улетку.

...Зьміцер Вайцюшкевіч — цяжкі арэшак для фатографаў. У яго не зусім правільны твар, доўгія рукі і партыкулярная жэстыкуляцыя. Удала зьняць яго на канцэрце немагчыма. Вайцюшкевіч-артыст — гэта набор дэталяў, якія рассыпаюцца пры фатаграфаваньні. Я чуў пра гэта ад незраўнанага Анатоля Клешчука.

Не лягчэй злавіць ягоны вобраз і ў студыі. Пры сваёй эстраднасьці, Вайцюшкевіч — закрыты чалавек, рэч у сабе. Зьняць яго цяжка, як радыёхвалю. Каб злавіць вобраз сьпевака, Джэф паехаў за ім на ягоную бацькаўшчыну, у Бярозаўку. Кадар, які задаволіў, быў зроблены ў роднай хаце Зьмітра — у пакоі, у якім ён вырас.

Рэпартаж пра беларускіх інтэлектуалаў і артыстаў мае выйсьці ў дадатку да «Монд», а пра жанчын Беларусі — у «Эль» перад 19 сакавіка.

**Мікола Бугай**

# А цяпер гарбаты!

У 1840 г. Ігнацы Ходзька надрукаваў у сэрыі сваіх славутых «Літоўскіх малюнкаў» апавяданьне «Самавар». Просьценькі сюжэт служыць выдатнай ілюстрацыяй нашай матэрыяльнай культуры. Нібы кінаапэратар, Ходзька схапіў вокам той няўлоўны гістарычны момант, калі гарбата на землях былога ВКЛ з прадмету раскошы ці экзатычных усходніх лекаў імкліва зрабілася рэччу звыклай. Мы цяпер і не задумваемся пра абставіны пранікненьня гарбаты ў Беларусь. Між тым, ейны шлях да простага чалавека быў няпросты, на якім супрацьстаялі ідэалягічная барацьба ды літоўска-польскі кававы патрыятызм.

## Усё пачалося з Ангельшчыны

У беларускую мову слова «гарбата» трапіла праз польскую — *herba thee,* што ёсьць лішнім пацьверджаньнем таго, што з экзатычнай травой першымі пазнаёміліся аптэкары. Нават у Кітаі — на радзіме чайнай культуры — па першым часе (IV—VI ст.) лісьце чайнага дрэва выкарыстоўвалася выключна ў лекавых мэтах — пакуль яго не пачалі запарваць і піць проста так, дзеля асалоды.

З эўрапейцаў першымі пазнаёміліся з гарбатай вялікія падарожнікі партугальцы, што завезьлі да сябе чароўнае лісьце на пачатку XVI ст. Завезьлі і надзейна схавалі за сваімі межамі, нават ад гішпанцаў.

У Галяндыю гарбата трапіла на стагодзьдзе пазьней, аднак спатрэбілася яшчэ 50 гадоў, перш чым пра кітайскае дзіва ад галяндцаў дазналіся ангельцы. Відаць, спрычыніліся да таго «кантакты» зь нідэрляндзкім каралеўскім домам Аранскіх. Але нават Ангельшчыне спатрэбіліся доўгія дзесяцігодзьдзі, каб напой сапраўды стаў нацыянальным ды, пераадолеўшы ўсеагульны недавер, трапіў у Эўропу. Так супольнымі высілкамі галяндцаў і ангельцаў кантынэнт пазнаёміўся з новым напоем. Але вялікай папулярнасьці напой не здабыў: уся Цэнтральная і Ўсходняя Эўропа «сядзела» на каве.

## Да нас — з Расеі

У нашую малодшую «сястру» казацкія атаманы з Кітаю, дзе былі ў пасольстве, прывезьлі першыя зьвесткі пра гарбату яшчэ ў 1567 г. Але прайшлі доўгія 70 гадоў, покуль у 1638 г. гарбата трапіла да царскага двара. Справы пайшлі хутчэй: ужо ў 1670-х гарбата прадавалася ледзь ня ў кожнай маскоўскай краме. Таму першае знаёмства жыхароў Беларусі з кітайскім напоем, відаць, адбылося пры малапрыемным пасярэдніцтве маскоўскіх вайсковых абозаў падчас вайны 1654—1667 гг. альбо ў сібірска-ўральскай высылцы.

> «...Даўней гарбата была лекамі ад галавы, цяпер безь яе і жыць ня могуць»

У Польшчу гарбата прыйшла цераз кантакты зь Нідэрляндамі. Але толькі ў другой палове XVIII ст., калі пайшла мода на ўсё ангельскае, звычай піць гарбату не як лекі, а дзеля асалоды ды прэстыжу, пранік у вышэйшыя пласты грамадзтва. У Літве таксама смак напою ведала хіба найвышэйшая арыстакратыя. Прынамсі, пра гэта некалькі разоў згадвае берасьцейскі кашталян, знаны мэмуарыст XVIII ст. Марцін Матушэвіч.



**Паводле Ігната Ходзькі, у XIX ст. гарбата на беларускіх землях была сродкам ідэалягічнай барацьбы.**

## Кававы патрыятызм

З далучэньнем да Расеі жыхары былога ВКЛ мусілі зжывацца з новымі рэаліямі. Самастойны гандаль з Эўропай застаўся ў мінулым, і цяпер гарбата трапляла на нашыя землі выключна празь Сібірскі «чайны» шлях. Расейскі ўрад абкладаў імпарт гарбаты больш як 100% мытам, транспартныя выдаткі былі калясальныя, да таго ж на гарбаце як сьлед «наварвалі» маскоўскія купцы. У выніку кошт у раздроб быў у 10—12 разоў вышэйшы, чым у Заходняй Эўропе. Дадайце сюды і пагарду да «маскоўскага» акупацыйнага напою, і вы зразумееце адсутнасьць ейнай папулярнасьці.

Апроч таго, сур’ёзным апанэнтам гарбаты выступала кава. Колісь таксама сустрэтая ў Рэчы Паспалітай не без забабонаў і кпінаў (бо мода на яе прыйшла ад найгоршых ворагаў — туркаў), да пачатку эпохі падзелаў кава пасьпела


GNUTELLA.PL

ня проста заваяваць папулярнасьць, але зрабіцца сапраўдным нацыянальным напоем. Гэта было апошняе стагодзьдзе ейнага незалежнага існаваньня. Таму натуральна, што для многіх патрыётаў кава, у адрозьненьне ад гарбаты, сымбалізавала часы былой «залатой вольнасьці».

## Расейцы навучылі нас піць ня толькі гарэлку

Тым часам у Расеі аб'ёмы спажываньня расьлі. У першай палове XIX ст. імпарт вырас з 75 да 360 тыс. пудоў у год, адпаведна, гарбата таньнела і станавілася больш даступнай. У тым ліку і на беларускіх землях.

Звычай піць гарбату на землі былога ВКЛ прынесьлі расейскія вайскоўцы і чыноўнікі. Ад іх гэтую звычку пераймалі спачатку нацыянальна абыякавыя, шчыльна зьвязаныя з расейскімі інтарэсамі колы. Таму схільнасьць да бясскрыўднага напою ў вачах патрыётаў Рэчы Паспалітай выглядала ледзь ня сымбалем нацыянальнай здрады. Гістарычна гэты час супадае з пэрыядам мікалаеўскае рэакцыі, падаўленьнем паўстаньня 1830—1831 гг., закрыцьцём Віленскага ўнівэрсытэту ды скасаваньнем Уніі.

У губэрнях, прылеглых да этнічай Расеі, пранікненьне гарбаты ішло хутчэй, чым у сэрцы гістарычнай Літвы, ня кажучы ўжо пра Карону. Ян Баршчэўскі, пясьняр Полацка-Віцебскага краю, у аповесьці «Драўляны дзядок і кабета Інсэкта» (1844) зафіксаваў гэтыя зьмены: «Няшмат часу прайшло, ужо і самавар прынесьлі, наліваюць гарбату, стары пан Ротмістар, седзячы ля стала, сказаў гаспадыні: — Мая пані, даўней гарбата была лекамі ад галавы, цяпер безь яе і жыць ня могуць, якія перамены ў сьвеце» (падзеі адбываюцца ў 1835 г.).

**Калі б Кітай прыслаў нам усе свае атруты, ня здолеў бы нам больш пашкодзіць, чым сваёй гарбатай... Частае ўжываньне гэтай цёплай вады аслабляе нэрвы і органы страўнасьці, а таксама надзвычай расслабляе. Дзецям і маладым асобам яна заўжды шкодная.**

**Кшыштаф Клюк. «Слоўнік расьлін», XVIII ст.**

І ўжо пясьняр гістарычнай Літвы І.Ходзька ў апавяданьні «Берагі Вялы» пісаў: «Зараз ня ўмеюць ужо гатаваць добрай кавы. Ня ведаюць ужо зараз шмат якіх патрэбных для гэтага сакрэтаў, бо на тое, Мосьці Дабрадзею, абавязкова патрэбны і алені рог для ачышчэньня кавы, ды сьмятанкі ня шкодзіць дадаць, трохі мігдалаў для паху і пазалоты пенкі; цыкорыю, барані Божа, ня больш як чацьвёртую частку, такая прапорцыя дае прыгажэйшы колер і смаку ня шкодзіць. А зараз ужо з палову сыпяць, але, зжалься Божа, якая гэта кава! Трэба яшчэ ведаць, як смажыць».

Кава пачала здаваць пазыцыі.

**Алесь Белы**

# «Бандыты карысталіся беларускай гаворкай...»

У зборніку друкуюцца дакумэнты пра супрацьдзеяньне польскай дзяржавы беларускай дывэрсійнай дзейнасьці ў 1920—1925 г. Гэта афіцыйныя польскія дакумэнты, таму карціна атрымліваецца аднабаковай, хоць публікатар і абумовіў падобны выбар у назьве кнігі. Каб выйсьці з замкнёнага кола вайсковых рапартаў, Войцех Сьляшыньскі зрабіў пашыраныя аўтарскія ўводзіны.

Аўтар адразу адзначае: «ідэя будовы незалежнай беларускай дзяржавы ўвайшла ў канфлікт з нацыянальнымі польскімі памкненьнямі на крэсах». Фэдэралісцкія пляны пабудовы дзяржавы меў Юзаф Пілсудзкі, але польская крэсовая супольнасьць не лічыла мэтазгодным дзяліцца атрыманымі пазыцыямі зь іншымі нацыянальнасьцямі. Як вынік, польскаму боку бракавала пасьлядоўных плянавых учынкаў.

Беларусамі новыя дзяржаўныя структуры ўспрымаліся як акупацыйныя, а вайсковыя рэквізыцыі і злоўжываньні 1919—1920 г. вялі да ўзьнікненьня ў сялянства настальгіі па стабільнасьці «добрых царскіх часоў» ды спрыялі пралітоўскай, а асабліва прабальшавіцкай прапагандзе. Беларускія дзеячы, у сваю чаргу, не жадалі адмаўляцца ад ідэі незалежнай дзяржавы.

У канцы 1919 — пач. 1920 г. на заходнебеларускіх абшарах узьнікла левая беларуская партызанка, генэратарам якой былі эсэры. З канца 1920 г. саюзьнікам беларускага руху стала Літва, улады якой актыўна пратэставалі супраць заняцьця палякамі Віленшчыны. Колы, згрупаваныя вакол БНРаўскага ўраду Ластоўскага, пачалі супрацоўнічаць з ковенскім урадам, што таксама знайшло падтрымку нямецкага боку, занепакоенага паўставаньнем новай польскай дзяржавы. Ластоўскі атрымаў на сваю дзейнасьць пазыку ў 40 млн марак. Задачай была арганізацыя ўзброеных сіл, гатовых дзейнічаць з пачаткам польска-літоўскай вайны. Між тым дывэрсійныя беларускія аддзелы на Беласточчыне і Гарадзеншчыне зьдзяйсьнялі напады на пастарункі паліцыі, лясьніцтвы, іншыя адміністрацыйныя ўстановы, сядзібы польскіх землеўладальнікаў. У ноч на 28 красавіка 1922 г. аддзел пад кіраўніцтвам Яна Грыцука («Чорта») увайшоў у Кляшчэлі. Былі забітыя два паліцыянты, уладальнік мясцовай рэстарацыі, ягоная матка. Гэты выпадак шырока асьвятляўся ў беластоцкай прэсе.

Увесну 1923 г. у рапарце II аддзелу Генштабу Польшчы пісалася: «Дывэрсійныя акцыі, што праводзяцца Ковенскай Літвой, датуюцца ад восені 1921 г. У гэтым акрэсе часу ўрадам Ластоўскага, пры моцнай падтрымцы ковенскага ўраду, былі арганізаваны рэгулярныя беларускія аддзелы, а таксама паўсталі незалежныя банды беларускіх партызанаў, сфармаваных пераважна з уцекачоў зь Віленшчыны і Гарадзеншчыны... У студзені 1922 г. у Мерэчы быў арганізаваны штаб беларускіх паўстанцкіх аддзелаў, а вясною таго ж году паўстанцкі штаб стварыў на памежжы і на Гарадзеншчыне сетку дывэрсійную і выведную, арганізаваў цэлы шэраг дывэрсійных нападаў (падрывы мастоў, разборку шпалаў, спаленьне запасаў скарбавага дрэва, падпаленьне ўрадавых лясоў)...»



**Sleszynski, Wojciech. Walka instytucji panstwowych z bialoruska dzialalnoscia dywersyjna 1920—1925.** — Bialystok, 2005.

**[Сьляшыньскі, Войцех. Барацьба дзяржаўных інстытуцый зь беларускай дывэрсійнай дзейнасьцю ў 1920—1925 гг.]**

Толькі ў Палескай акрузе дзейнічалі наступныя беларускія аддзелы: у Косаўскім павеце — Асіповіча, у Берасьцейскім павеце — Васілюка і Коршына, у Драгічынскім павеце — Левановіча, у ваколіцах Століна — Стаховіча. Легендарным на Віленшчыне і ў Заходнім Палесьсі стаў аддзел пад камандаю Мухі (Міхальскага) — былога вахмістра царскай арміі, які арганізаваў вакол сябе баяздольную каманду авантурыстаў, у тым ліку і крымінальнікаў. Сам Муха ў аповедах мясцовых жыхароў быў адначасова бандытам і героем; распавядалася, што агняпальную зброю ён ужываў толькі ў выключных выпадках.

Вось як выглядаў напад дывэрсійнай групы паводле вайсковага рапарту: «Дня 19.XI.1923 г. а 19.00 гадзіне напалі на двор Быхаўшчына, гміны Ланьскай [Нясьвіскі павет. — **А.Дз.**] 8 бандытаў, узброеных карабінамі і рэвальвэрамі, і на працягу 2—3 гадзінаў дашчэнту абрабавалі ўладальніка... Бандыты карысталіся беларускай гаворкай і дасканала ведалі мясцовую сытуацыю, узброеныя былі аднастайна. Удаліліся ў паўночна-ўсходнім кірунку ў бок мяжы».

Беларускі ўрад сьцьвярджаў, што ў канспірацыі напагатове знаходзяцца каля 12 тыс. чалавек, падрыхтаваных да ўзброенага выступу ў выпадку загаду. Сярод гэтых людзей найбольшую групу складалі сяляне. Толькі частка сьвядома змагалася за незалежную Беларусь, прыход многіх у дывэрсійныя аддзелы, адзначае Войцех Сьляшыньскі, быў рэакцыяй на гвалт польскіх жаўнераў, паліцыянтаў, чыноўнікаў. У такой сытуацыі значная частка беларускай інтэлігенцыі трактавала новую Польшчу як варожае дзяржаўнае ўтварэньне. У 1922 г. пачала дзейнічаць таксама беларуская прасавецкая партызанка. Арганізатарамі яе баявых аддзелаў у канцы 1921 г. сталі латыш Генрых Янсэн і былы царскі палкоўнік расеец Шаткоў.

15 сакавіка 1923 г. Рада амбасадараў Лігі Нацый прызнала дэмаркацыйную лінію між Польшчай і Літвой дзяржаўнай мяжой. Ня маючы міжнароднай падтрымкі ў тэрытарыяльнай спрэчцы, Літва пачала адмаўляцца ад палітыкі дэстабілізацыі ў Польшчы пры дапамозе беларускіх дывэрсійных аддзелаў. Вясною 1923 г. Ластоўскі страціў функцыі прэм'ера, а ручаіна літоўска-нямецкай дапамогі стала засыхаць. Ініцыятыву пераналі Саветы. Важная роля тут адводзілася КПЗБ. Фінансавая і кадравая дапамога, а таксама зброя рэгулярна паступалі зь Менску, але галоўны штаб па кіраўніцтве дывэрсійнай дзейнасьцю знаходзіўся ў Замежным аддзеле АГПУ ў Маскве.



**Жаўнеры самастойнага беларускага атраду літоўскага войска (1919). Многія зь іх папоўняць сабою партызанскія аддзелы.**

Найбольш значнай акцыяй, якая прымусіла ўрад Польшчы зьвярнуцца да пытаньня кантролю над паўночна-ўсходнімі крэсамі, быў захоп Стоўпцаў. А 2.30 ночы 4 жніўня 1924 г. аддзел у 100 чалавек увайшоў у павятовы горад і атакаваў дзяржаўныя ўстановы. Апэрацыя была праведзена бліскуча — перад нападам адключана сувязь, перакрыты пад'язныя шляхі. Пасьля нападу асноўная частка ўдзельнікаў перапраўілася за савецкую мяжу. Кіраваў апэрацыяй Кірыла Арлоўскі, той самы Муха-Міхальскі. Той Арлоўскі, які пасьля II сусьветнай на сваёй радзіме ў Кіраўскім раёне, карыстаючыся дзяржаўнымі прэфэрэнцыямі, створыць узорную шматгаліновую савецкую гаспадарку — калгас «Рассвет».

Выразны спад дывэрсійнай камуністычнай дзейнасьці наступіў пад канец 1925 і на пачатку 1926 г., і было гэта зьвязана са зьменаю палітыкі ў Савецкім Саюзе — Сталін канчаткова замацаваўся ва ўладзе ды адкінуў канцэпцыю неадкладнага экспарту камунізму на Захад. Падрыхтоўка беларускага паўстаньня ў Польшчы страціла для Крамля былую актуальнасьць. Прагучала крытыка на адрас КПЗБ за празьмернае ўздыманьне нацыянальнага пытаньня. Але ня ўсе беларускія дывэрсійныя аддзелы жадалі распускацца. Адносна іх савецкія ўлады вымушаны былі выкарыстоўваць сілу. У жніўні 1925 г. пад Койданава ГПУ інсьпіравала ўзброены канфлікт паміж падпольнымі групамі, што прывяло да іхняй самаліквідацыі.

Беларускія палітыкі ў XX ст. ніколі не вызначаліся пераборлівасьцю. Хоць праўда, што дзейнічаць ім прыходзілася ў паранаідальных умовах — у сытуацыі паміж вынішчэньнем ды акупацыяй. Імкненьне ж дзеля дасягненьня нацыянальных мэтаў пайсьці на саюз зь любой палітычнай сілай пераўтварала беларускіх актывістаў у марыянэтак варожых да іх структураў.

Усё ж кніжка В.Сьляшынскага прысьвечана не беларускаму руху, а барацьбе дзяржаўных інстытуцый супраць беларускіх дывэрсантаў. Апроч выкарыстаньня побач з паліцэйскімі адзінкамі таксама рэгулярных вайсковых частак быў зьдзейсьнены цэлы шэраг адміністрацыйных захадаў. У рэгіёне пачалі дзейнічаць надзвычайныя суды са спрошчанай працэдурай вынясеньня суровых выракаў. Наваградзкі і Палескі цывільныя ваяводы былі пазбаўлены сваіх пасадаў, а іх месцы занялі кадравыя генэралы. Як вельмі эфэктыўным ацэньваецца стварэньне новай вайсковай фармацыі — Корпусу памежнай аховы. Але, як паўтарае В.Сьляшынскі, галоўнай прычынай спаду беларускай дывэрсійнай дзейнасьці стала зьмена стратэгіі Крамля. Савецкая падтрымка беларускіх аддзелаў у Заходняй Беларусі ўжо не была мэтанакіраванай, што дазволіла польскім службам бясьпекі весьці супраць іх пасьпяховую барацьбу. Правакацыі бальшавікоў толькі спрыялі пагрому беларускіх актывістаў.

У кніжцы дасьледчыка зь Беластоку беларускія і польскія чытачы могуць знайсьці многа сэнсацыйных дэталяў і фактаў. Усё ж трэба прызнаць: для кнігі быў абраны няслушны тэматычны фармат. Бачыце, якія пашыраныя тлумачэньні давялося мне зрабіць, каб толькі падвесьці да праблематыкі. Публікуючы дакумэнты, выяўленыя ў архівах Беластоку, Варшавы, Горадні і Берасьця, В.Сьляшыньскі таксама мусіў зрабіць вялікі па памерах уступны тэкст, бо самі гэтыя дакумэнты ў сваёй пераможнай рэляцыі ды інтанацыйнай грэблівасьці да Ковенскай Літвы і савецкай Расеі як бы завісаюць без гістарычнага кантэксту. Кніга «Барацьба дзяржаўных інстытуцый...» уяўляецца як арганічная частка больш маштабнай працы па гісторыі беларускага руху і палітычнай сытуацыі на паўночна-ўсходніх крэсах. Ці адважыцца на гэту працу аўтар?

І яшчэ адна заўвага, ад якой немагчыма ўстрымацца. Гісторыку, у тым ліку і польскаму, які займаецца беларускай праблематыкай, не пазьбегнуць вывучэньня беларускай мовы. Толькі з-за памылак у трансьлітарацыі назваў беларускіх кніжак я б не напісаў гэтай неарыгінальнай фразы. Але заўважныя некаторыя крокі аўтара, што выклікаюць зьдзіўленьне беларускага рэцэнзэнта. Так, кніжка заканчваецца двума рэзюмэ — на ангельскай і расейскай мовах. Беларускае рэзюмэ ў кніжцы пра беларускіх дывэрсантаў адсутнічае, а кніжка рабілася ў Беластоку, дзе дастаткова беларускамоўных прафэсійных асяродкаў. Расейскі тэкст багаты на граматычныя і сынтаксычныя памылкі. Ангельскі ў гэтым сэнсе больш дакладны. Але паўсюль сур'ёзныя праблемы зь перадачаю тапонімаў. Населеныя пункты, якія цяпер знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, у ангельскім тэксце настойліва падаюцца аўтарам у польскім напісаньні (Glebokie — Глыбокае, Stolpce — Стоўпцы), у расейскім тэксьце зроблена фанэтычная трансьлітарацыя таксама з польскай мовы. На прыкладзе кнігі, што анатуецца, можна сьцьвярджаць: сёньня валоданьне беларускай мовай — гэта ўжо не прыкмета палітычных сымпатыяў, а сьведчаньне кваліфікацыі.

**Алег Дзярновіч**

# Да 100-годзьдзя газэты «Наша Ніва»

**РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар»**

**пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «ARCHE», «Дзеяслоў», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com»**

**абвяшчае**

# КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 26 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Ляўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы, дзе перад імі выступяць знаныя пісьменьнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.).

**Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 15 красавіка 2006 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 красавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску ў першай палове траўня.**

**Творы дасылайце на адрас:** e-mail: maladylitaratar@tut.by. **Паштовы адрас:** а/с 218, 220050, Менск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар». У лісьце абавязкова пазначце дату нараджэньня і кантакты (паштовы і электронны адрасы, тэлефоны). **Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.**

**Журы конкурсу:**

Уладзімер Арлоў, Андрэй Дынько, Ганна Кісьліцына, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч.



# Расьцьвітае перамогі бэз



## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ

ПАШТОЎКА З АМЭРЫКІ

Duke Tower працінае неба
сонны Дарам складаецца ўдвая
запіхваецца ў капэрту
і некалі паштарка прынясе табе
адцінак гэтай Бадрыяравай пустэльні
бясконцай усьмешкі
на вялікім твары
што напяты на культурную традыцыю
магчыма дабрабыт
альбо добаразычлівасьць
як хочацца табе мне пажадаць
вясновай шчырай усьмешкі
і ўпэўненасьці
што сьвет ня зьнік
нават калі ты на Акрэсьціна
праз краты ці ня чуеш
расьцьвітае перамогі бэз

ПАКОІ
**Вітальня**

у вітальнях вітаюцца
толькі ты праходзіш яе панурыўшы зрок долу
ў свой офіс дастаеш зь бюро пісталет
і глядзіш што ён зараджаны
ты ня хочаш пасьля рабочага дня
пакідаць свой насядзелы да гемарою
фатэль
бо прыйдзецца зноў вяртацца ў вітальню
дзе прынята вітацца

**Прыбіральня**

мы з вамі атручаныя розным
я капіталізмам і рокам
вы лукашызмам і таматным сокам
які вам прадалі ў краме
сказалі што сьвежы
ваш страўнік гэта адчуў

**Гасьцёўня**

мы ў гэтым сьвеце на імгненьне
жыг — і няма
і як ты пражывеш гэты час залежыць
толькі ад цябе і ад абставінаў
найгоршае ў сьвеце адзінота
сябры сябрамі застаюцца
нават калі сьвет
навокал падае ў прорву
калі вочы АМОНаўца
безэмацыйна глядзяць
бы дулы аўтаматаў
ты адчуваеш рукі сяброў
у сваіх руках

**Заля**

16-га сьвечка ў тваім акне
мне нагадала што ты блізка так
усяго праз вуліцу
і мы з табой ужо ня бачыліся
ад пачатку сьнежня
як шпарка бяжыць час
нібы машыны па гасьцінцу
але праз шкло я бачу
што мы разам
і гэта акрыляе

**Маравія ўва Ўінстан-Салеме**

яны размаўляюць на дзіўнай мове
гатуюць шыкоўнае печыва са смакам імберцу
апранаюць старажытныя строі
іх сьвет — лялечны тэатар для турыстаў
дзявочы рэлігійны каледж
царква тавэрна дзе ночыў джордж вашынгтон
Біблія на старанямецкай мове
разьбярня кузьня цясьлярня
ўсяго за дваццатку
лялькі цацкі печыва ПЕЧЫВА
аўтэнтыка ўсё сапраўднае
нават прыбіральня а-ля в.Інчукі
вось толькі ў хляве схаваны
за дрывалкай
аўтамат з Coca-Cola
а ля старажытных хатак
прыпаркаваныя машыны
з паўночна-каралінскімі нумарамі

*Ўінстан-Салем (ЗША)*

# Наша Пластыляндыя

Капітан Танака

Панядзелак — дзень цяжкі.
Пячы будзем піражкі.





Надвячоркам у аўторак
Нахапаем зь неба зорак.



Надыходзіць серада —
Зь неба крапае вада.

У чацьвер —
вось гэта дзіва! —
мы чытаем
«Нашу Ніву».




А у пятніцу
заўжды
Мы на сонейку
ляжым.





Рана ранкам у суботу
Ўзьняцца з ложка нам лянота.



Ды затое мы
ў нядзелю
Будзем лётаць
на арэлях!




**Пераплётныя паслугі ў Менску:**

**«Апэратыўнае тыражаваньне»**
Тэл. 284–68–18, 284–72–17, 284–81–07,
8–029–6–400–100
Выезд, дастаўка.

**«Аўрора-плюс»**
Вул. Варвашэні, 3
Тэл.: 284–81–84,
284–32–72

**«Данарыт»**
Вул. Чарнышэўскага, 10, оф. 37а
Тэл.: 285–79–29,
8–029–645–99–54

**«Інфамаркет»**
Вул. Харужай, 3, оф. 307В
Тэл.: 284–37–07,
8–029–622–83–01,
8–029–622–83–04

**«Karandash.by»**
Падземны пераход паміж БДУ і БДПУ
Тэл.: 22–77–133
Працуюць і ў сьвяты, і ў нядзелі.

**«Паліграфічныя паслугі»**
Тэл.: 8–029–388–40–82,
8–029–570–74–11,
8–029–400–48–55

**«Фармат»**
Вул. Пугачоўская, 3, оф. 38 (рог Варвашэні і Чырвонай)
Тэл.: 8–029–758–06–16, 774–62–13,
8–029–341–17–29

**«Чэркас»**
Вул. Цэткін, 18
Тэл.: 211–00–63/64/65, 226–45–48,
8–029–643–80–77

Пераплёт таксама робяць **Нацыянальная бібліятэка** (вул.Чырвонаармейская, 7) і **Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа** (вул.Сурганава, 15).




Падарожжа ў першую беларускую сталіцу. Шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.

# Ад Полацку пачаўся сьвет

**ТЭКСТ УЛАДЗІМЕРА АРЛОВА**
**ФОТА СЯРГЕЯ ПЛЫТКЕВІЧА**
**МАСТАК ЗЬМІЦЕР ГЕРАСІМОВІЧ**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Актуальныя пытаньні вывучэньня і выданьня Мэтрыкі ВКЛ. Матэрыялы міжнароднай навук.-практ. канфэр.** (Менск, 11—12 лістапада 2003 г.). — Менск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2005. — 192 с., карта.

**Беларускі археаграфічны штогоднік.** Вып.6. — Менск: БелНДІДАС, 2005. — 364 с.

**Мэтадычныя рэкамэндацыі да публікацыі лацінскіх дакумэнтаў XIII—XIV ст.** / Аўтар-складальнік А.Жлутка. — Менск: БелНДІДАС, 2005. — 50 с.

**АДз**

## НАШЫ ШАШКІ

# Шашысты зрабілі свой выбар

У сярэдзіне лютага прайшло галасаваньне чальцоў Беларускай фэдэрацыі шашак: выбіраліся «Найлепшы судзьдзя», «Спартовец-адкрыцьцё», «Найлепшы спартовец», «Найлепшы трэнэр», «Журналіст 2005 году». Кандыдатура Кірылы Хайнюка была вылучана выканкамам БФШ у судзейскай і трэнэрскай намінацыях. У першай сп. Хайнюк абышоў сваіх «канкурэнтаў», тытуляваных Віталя Варушылу і Аляксандра Шабаліна.

«У матэрыяльным пляне гэта нічога не дае, але прыемна, калі калегі за цябе галасуюць», — прызнаўся ляўрэат у інтэрвію «НН». Гэты малады чалавек, леташні «трэнэр году», мае нацыянальную катэгорыю і судзіць амаль усе сталічныя спаборніцтвы. Часьцяком — на грамадзкіх пачатках.

Іншымі бела-чорнымі героямі былі абраныя Марына Разаева — чэмпіёнка краіны па рускіх і міжнародных шашках («адкрыцьцё году»), Андрэй Валюк — чэмпіён сьвету па шашках-64 («найлепшы спартовец»), Сяргей Насевіч — настаўнік вундэркінда Ігара Міхальчанкі («найлепшы трэнэр») і... рэдакцыя спартовых праграм АНТ (калектыўны «журналіст, адданы шашачнай тэматыцы»). Усе яны атрымалі дыплёмы БФШ.

**ВР**

**Ваш ход**
Бродзкі—Валюк. Ход чорных.



**Адказ:** 1…ab2! 2. ca1 ba7 3. ab2 ac5 4. bc3 dc7 5. cd4 cb4. Чорныя здабываюць шашку і партыю. Гэты маляўнічы фінал Андрэй разыграў у юнацтве, неўзабаве пасьля першай перамогі ў чэмпіянаце Беларусі (1989 г.).

## ІМПРЭЗА

### Магнаты і шляхта

**9 сакавіка** (чацьвер) а 19-й на гістарычным факультэце БДУ (Чырвонаармейская, 6) адбудзецца лекцыя Аляксандры Кілбас «Побытавая культура Беларусі. Магнаты і шляхта». Чакаем вас у аўдыторыі №44.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**10** (пт) — «Кім».
**11** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**12** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**13** (пн) — «Я не пакіну цябе».
**15** (ср), **16** (чц) — «Эрык XIV».
**17** (пт) — «Парфён і Аляксандра».
**18** (сб) — «С.В.».
**19** (ндз) — «Паўлінка».
*Ранішнія спэктаклі*
**15** (сер) — «Афрыка».
*Малая сцэна*
**11** (сб) — «Адчыніце Кантралёру!».
**13** (пн), **17** (пт) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**19** (ндз) — «Варшаўская мэлёдыя».

### Тэатар юнага гледача

**10** (пт), **17** (пт) — «Тарас на Парнасе».
**11** (сб) — «Залатое сэрцайка».
**11** (сб) — «Сястра мая Русалачка».
**12** (ндз) — «Маленькія трагедыі».
**12** (ндз) — «Каліф-башмачнік».
**14** (аўт) — «Апошняя дуэль».
**15** (сер) — «Рыцар Ордэну Сонца».
**16** (чц) — «Марныя спробы каханьня».
**18** (сб) — «Шлях на Бэтлеем».
**18** (сб) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
**19** (ндз) — «Папялушка».

### Тэатар беларускай драматургіі

**10** (пт) — «Кабала сьвятошаў».
**11** (сб) — «Воўк-мараплавец».
**11** (сб) — «Містэр Розыгрыш».
**12** (ндз) — «Нязваны госьць».
**14** (аўт) — «Кароль Лір».
**17** (пт) — «Ганна ў тропіках».
**18** (сб) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**18** (сб) — «Палёты з анёлам».
**19** (ндз) — «Чорны квадрат».




**Спампуй сабе «Песьні Свабоды»! http://music.fromby.net/sliberty**

## ХАКЕЙ

### Адкрыты чэмпіянат Беларусі

Адкладзены матч
**10 сакавіка** (пятніца)
«Дынама» (Менск) — «Сокал» (Кіеў). Палац спорту (былы пр-т Машэрава, 4). Пачатак а 18.30.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Гістарычны пэйзаж з гейшамі

**Мэмуары гейшы** (Memoirs of a Geisha)

ЗША, 2005, каляровы, 145 хв.

**Жанр:** усходняя гістарычная мэлядрама.

**Адзнака:** 6 (з 10).

Маленькую дзяўчынку прадаюць у дом гейшаў. Яна вырастае й становіцца прыгажуняй Саюры, здольнай спыніць мужчыну адным позіркам.

У карціне Роба Маршала «Мэмуары гейшы» ёсьць усе атрыбуты «ўсходняга кіно»: кімано, дождж, сакура, сьвятло й цені, пяшчота ружовага і холад брунатнага. Нездарма карціна атрымала «Оскары» за апэратарскую працу і касьцюмы. Але ўся апэратарская раскоша ўдала хавае адсутнасьць ўсходняе атмасфэры. Гэта ўдалая імітацыя гістарычнага кіно.

Усхваленьне Гітлера на японскім радыё, касьцюмы 30-х, згадкі пра акупаваную Манчжурыю. Кітайцы ўжо выказалі свой пратэст; іх абурыла тое, што гейшаў, якія абслугоўваюць японскіх мілітарнікаў, гралі кітайскія прыгажуні Цзыі Чжан і Лі Гон. Але ўвесь гістарычны антураж — толькі фон для прыватнай гісторыі.

Гэта таленавітая імітацыя мэлядрамы. Таемнае каханьне гейшы, якой нельга кахаць, але дазволена спакушаць, інтрыгі гульні і насоўка любага чалавека, залітая дзявочымі сьлязамі. Ўсходнія жарсьці сьцішаныя дыдактычным камэнтаром і завяршаюцца галівудзкім хэпі-эндам.

Прадусаваў карціну Стывэн Сьпілбэрг, у якога геніяльны нюх на посьпех. І хаця стужка — імітацыя, хто ведае, які арыгінал?

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 11 сакавіка

**БТ, 14.30**

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца Алесь Матафонаў.

Тэма выпуску — сядзіба.

**СТВ, 20.15**

«Знаёмцеся, Джо Блэк».

ЗША, 1998, рэж. Марцін Брэст.

Містычная мэлядрама.

Сьмерць бярэ адпачынак і вырашае даведацца пра сьвет людзей ад жыцьцялюба Джо Пэрыша. Але дачка Пэрыша закаханая ў маладога чалавека, цела якога выбрала сьмерць для вакацый... У ролях: Брэд Піт (Сьмерць), Энтані Хопкінз (Джо Пэрыш).

**БТ, 23.00**

«Боўлінг для Калюмбіны».

ЗША—Канада—Нямеччына, 2002, рэж. Майкл Мур.

Дакумэнтальны фільм.

Падлеткі расстралялі аднаклясьнікаў у школе... М.Мур дасьледуе сацыяльныя карані гвалту.

**СТВ, 01.10**

«Пусты дом».

Паўднёвая Карэя, 2004, рэж. Кім Кі Дук.

Паэтычная прыпавесьць. Малады чалавек забіраецца ў пустыя дамы, прыбіраецца там і фатаграфуе сябе. Аднойчы да ягоных вандровак далучаецца гаспадыня. Жэсты, позіркі, плястыка рухаў — і гісторыя каханьня.

### Нядзеля, 12 сакавіка

**СТВ, 20.25**

«Прыгажосьць па-ангельску».

Вялікабрытанія—Нямеччына—ЗША, 2004, рэж. Рычард Айр.

Драма.

Брытанія XVII ст. На сцэне зьзяе Нэд Кінастан, выканаўца жаночых роляў. Але кароль выдае загад, каб жанчын у тэатры гралі толькі жанчыны. Касьцюмэрка Мэрая даўно марыла пра падмосткі...

Ролі выконваюць: Білі Крадап, Клэр Дэйнз, Рупэрт Эвэрэт.

**«Лад», 22.30**

«Усё пра маю маці».

Гішпанія—Францыя, 1999, рэж. Пэдра Альмадовар.

Мэлядрама.

Пасьля сьмерці сына маці шукае ягонага бацьку, якога ня бачыла 20 год. Альмадовараўскі express: з жаночых сьлёзаў, трансэксуалаў, дараваньня й пачуцьцёвасьці. Прэмія «Оскар» за лепшы замежны фільм. У ролях: Пэнэлопа Круз, Марыса Парэдэс, Сэсылія Рот.

**БТ, 22.35**

«Вясельле».

Францыя, 2004, рэж. Валеры Гіньябодэ.

Камэдыя.

Маладыя бяруць шлюб. Сьведкі маладых — зьбіраюцца разьвесьціся. Бацькі — ізноў сысьціся.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

Master Records

**Свабодная зона**

Драма, Ізраіль—Францыя—Гішпанія—ЗША, рэж. Амас Гітаі.

У ролях: Наталі Партман, Хіам Абас, Ханна Ласла. Тры жанчыны сустракаюцца ў «свабоднай зоне» Ярданії. Яны мусяць вырашыць асабістыя і фінансавыя праблемы.

**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

**...Акадэмія навук атрымала загад абгрунтаваць прэзыдэнцкае выказваньне аб тым, што Скарына жыў у Піцеры.**




**...беларусы рэагавалі на публікацыю карыкатураў на гаранта ў цэнтральнаэўрапейскай прэсе так, як мусульмане рэагавалі на карыкатуры з выявай Прарока.**




**...у сілавых міністэрствах кіравалі дальтонікі.**




**Малюнкі і тэксты Лёліка Ушкіна**

## У НУМАРЫ

### Малітва за Беларусь



Зварот вернікаў розных канфэсій. **Старонка 14.**

### Архіпэляг салідарнасьці




Замежжа — за Беларусь. З Бэрліна піша Алесь Кудрыцкі. **Старонка 4.**

### «Бандыты карысталіся беларускай гаворкай...»



Алег Дзярновіч пра малавядомую старонку гісторыі. **Старонка 40.**

### А цяпер гарбаты!



Калі б Кітай прыслаў нам усе свае атруты... Наша страва з Алесем Белым. **Старонка 38.**

### Расьцьвітае перамогі бэз



«Вітальня», «Заля», «Прыбіральня», «Гасьцёўня» і іншыя вершы Андруся Храпавіцкага. **Старонка 43.**

## ЖАРТЫ

* * *

Насамрэч, усе дыназаўры былі аднолькавыя. Папросту розныя палеантолягі па-рознаму іх складаюць.

* * *

Дыктарка Беларускага радыё: «Сёньня ў сталіцы адкрыўся трэці ўсебеларускі народны сход. На ім Аляксандар Лукашэнка сустрэўся з усімі сваімі выбарцамі».

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Г. Смаргонь** Вялейск. павету Віленск. губ. Смаргонь цяпер — першы фабрычны горад у Віленск. губ. (ня лічачы Вільні). Тутака каля 60 гарбарань і валкерань, апроч таго 3 шэрсьцямыйкі, 1 табачная фабрыка, 2 лесапілкі, 2 бровары (стаяць) і другія невялікія фабрыкі. За апошнія гады Смаргонь мае блізка саўсім гарадзкі выгляд. Тратуары, ліхтарні газавыя, будоўлі каменныя, кінэматографы (2)… Саўсім горад!

**Міхалка Смаргонскі**

**Гор. Полацак Віцебск. губэрні.** Летась восеняй быў у нас беларускі вечар і, здавалася, людзі аджылі, загаманілі. Але як выехалі тыя людзі, што рабілі вечар, то ўсё ізноў і заснула: ніхто ніякай не вядзе работы.

**С.В.**

**«НН». 1911. №9—10**

## Напішы Скрабутану



**Яўгена Скрабутана выгналі з Гарадзенскага ўнівэрсытэту за распаўсюд каляндарыкаў з партрэтам А.Мілінкевіча і надпісам «Люблю Беларусь».**

**Падтрымай хлопца лістом: 230003 Горадня, вул. Пралетарская, 67-77, E-mail: zhenik@ua.fm**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Любы Максінька!** Віншую зь мінулым ужо Днём нараджэньня! Шчасьця табе й радасьці! Love you tenderly. Your Sun

### КНІГІ

**Беларускія кнігі**, CD, газэта «Наша Ніва» ў Гомелі. Т.: 45–11–51

**Шукаю касэты**, дыскі зь песьнямі «Янка Купала», «Даставай, Язэп, гармонік». Т.: 667–39–06 (будні — пасьля 17.30, выходныя — у любы час). Андрусь

**Новыя ды рэдкія кнігі**, слоўнікі (факсымільныя выданьні), дзіцячая літаратура, музыка ды фільмы на CD, значкі, шалікі, сьцягі, «Наша Ніва» на Румянцава, 13 (ТБМ). Пн—пт (15:00—19:30). Т.: 707–40–01

**Распаўсюд. Абмен.** Гісторыя, фальклёр, постмадэрнізм, літаратура, псыхалёгія, канфэрэнцыі, круглыя сталы, кнігі, аўдыё, пошта, Інтэрнэт. E–mail: alesknigi@mail.ru; а/с 195, 220030 Менск

**Прапаную**: Лёсік «Збор твораў», «Беларускі клясычны правапіс», «Нашу Ніву» (факс. выд.), «Матэматычную энцыкляпэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753–91–96

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У анатацыі на новы нумар часопісу «Дзеяслоў» («НН», №9) напісана, што прыпавесьць Уладзімера Някляева «Чмель і вандроўнік» публікуецца без пазнакі аб тым, што яна друкавалася ў «НН». Насамрэч спасылка ёсьць, толькі не пры канцы тэксту, а ўнізе першай старонкі. Прыносім прабачэньні за сьлепату.

### КУПЛЮ

**Куплю ўзнагароды** БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота ваенных (беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў 2-е сусьветнае вайны). E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722–46–04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай — набуду. E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722–46–04

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 2421. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 08.03.2006.
Замова № 1194.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а